

ШТО АДБЫВАЕЦЦА НА РЫНКУ ПРАЦЫ?

5

ЧАМУ ВАЖНА ДАРАВАЦЬ?

19



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 САКАВІКА 2022 г.
ПЯТНІЦА
№ 48 (29670)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## КОРАТКА

- **У Беларусі на вясновыя палявыя работы спатрэбіцца больш як Br2,8 млрд.**
- ФПБ: прадуктаў павышанага попыту ў крамах дастататкова.
- **Сталічны рэгіён забяспечвае занятасць 25 працэнтаў працоўнага насельніцтва краіны.**
- Мінэнерга: Беларусь гатова аказаць садзейнічанне ў аднаўленні электразабеспячэння на Чарнобыльскай АЭС.
- **Прэзідэнтам Венгрыі абрана Каталін Новак. Яна стала першай жанчынай у гісторыі, якая зойме пасаду прэзідэнта Венгрыі.**
- Агульнагарадскі кірмаш вакансій пройдзе 20 красавіка ў Мінску.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ПАГРОЗЫ ВАЕННАЙ БЯСПЕЦЫ НАШАЙ КРАІНЫ БУДУЦЬ ЗНАХОДЗІЦЦА НА ЎЗРОЎНІ ВЫСОКАГА АБВАСТРЭННЯ»



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі правёў планавую нараду з кіраўніцтвам Міністэрства абароны. Тэма чарговай сустрэчы з ваеннымі — абмеркаваць на перспектыву важныя пытанні гарантавання ваеннай бяспекі краіны. Аляксандр Лукашэнка пералічыў асноўныя задачы па найбольш небяспечных кірунках. Яны патрабуюць асаблівай увагі спецыяльных падраздзяленняў і пагранічных сіл.**

«Абстаноўка ў рэгіёне і прагноз яе развіцця відавочна паказваюць, што ў найбліжэйшай і сярэднетэрміновай перспектыве пагрозы ваеннай бяспецы нашай краіны будуць знаходзіцца на ўзроўні высокага абвастрэння», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, бяспека краіны патрабуе ад Прэзідэнта і кіраўніцтва Міністэрства абароны забеспячэння належнага ўзроўню баявой гатоўнасці і баявой здольнасці беларускіх Узброеных Сіл.

Прэзідэнт адзначыў, што спакою не будзе, і гэта пацвярджаюць апошнія падзеі на поўдні беларускай граніцы. ***Асноўную небяспеку ўяўляюць групы наёмнікаў, якія засяроджваюцца на беларуска-ўкраінскай граніцы.***

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей МІЦЯНСКІ, намеснік міністра эканомікі:**

*«Сёння патрабуюцца аператыўныя, эфектыўныя і сумесна выпрацаваныя рашэнні для падтрымкі бізнесу. На гэтым этапе аналізуем інфармацыю, якая паступіла, і выпрацоўваем канкрэтныя дзейсныя меры па змякчэнні ўплыву неспрыяльных знешніх умоў на бізнес. Яны ўвойдуць у комплексны нарматыўна-прававы акт па падтрымцы эканомікі. Плануецца правядзенне рэгулярных круглых сталоў з прадстаўнікамі бізнесу для фарміравання аб'ектыўнай карціны таго, што адбываецца, і аператыўнай рэакцыі на сітуацыю».*

ISSN 1990 — 763X

Актуальна

## Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА: «Мы разам пішам гісторыю беларускай дзяржаўнасці»

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў — аб асаблівасцях апошняга рэферэндуму, базавых каштоўнасцях нацыянальнай мадэлі развіцця і двайных стандартах.**

15 сакавіка 1994 года была прынята дзеючая Канстытуцыя Беларусі. З 1998 года гэты дзень мае статус дзяржаўнага свята. Сімвалічна, што вельмі хутка — таксама 15 сакавіка — уступаюць у сілу змяненні і дапаўненні да Асноўнага Закона краіны, падтрыманыя большасцю галасоў на рэспубліканскім рэферэндуме, які адбыўся ў канцы лютага. Напярэдадні Дня Канстытуцыі гутарым са **старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ.**

***— Уладзімір Паўлавіч, што асабіста для Вас азначае Дзень Канстытуцыі?***

— Для мяне гэта ўрачыстасць беларускай дзяржаўнасці і народаўладдзя, юрыдычна замацаваная ў якасці свята. Яго сутнасць — у даніне павагі памяці шматлікіх пакаленняў беларусаў, якія ў розныя гістарычныя перыяды фарміравалі асновы нацыянальнай самасвядомасці, адлюстраваныя сёння ў Канстытуцыі краіны.

***— Заканатворчасць — дынамічны працэс. У гісторыі суверэннай Беларусі адбыліся чатыры рэферэндумы, у межах якіх уносіліся змяненні і дапаўненні ў Асноўны Закон дзяржавы. У чым асаблівасць апошняга?***

— Жыццё не стаіць на месцы. Зьмяняецца навакольны свет, удасканальваюцца тэхналогіі, развіваецца грамадства, што патрабуе адаптацыі заканадаўства да сучасных рэалій. Права правядзення рэферэндуму «для вырашэння найважнейшых пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця» замацавана ў Канстытуцыі нашай краіны. Беларуская ўлада традыцыйна выкарыстоўвае гэты вечавы механізм для ўліку меркавання народа, карэкціроўкі дзяржаўнага курсу і выпрацоўкі рашэнняў, якія закранаюць інтарэсы грамадзян і грамадства.

СТАР. 3



Па палічках

# ЦІ ВАРТА БЕГАЦЬ ПА ВАЛЮТУ?

## Рынак так ці інакш будзе імкнуцца да стабільнасці

**Што адбывалася на валютным рынку ў пачатку сакавіка і якіх курсаў замежных валют можна чакаць у найбліжэйшай будучыні? Ці трэба цяпер нервавацца ў пошуку найлепшых курсаў і мяняць усе свае кроўныя на чужыя паперкі? Пра гэта і не толькі расказалі вядомыя эксперты фінансавага рынку.**

### Купляць лепш, калі маленькая маржа

Так, сапраўды, у сувязі з апошнімі падзеямі, у Расіі і Беларусі значна падаражэлі долар і еўра. Эксперты не выключаюць, што на наступным тыдні трэнд працягнецца. Але ці значыць гэта, што неабходна бегчы ў абменнікі і скупляць замежную валюту на апошнія грошы? Сэнсу ў гэтым асаблівага няма, і вось чаму.

Людзі, прынамсі, гараджане, і так збіраюць на дарагія пакупкі часцей за ўсё ў доларах. Наша пакаленне (каму за 50), за апошнія 20 гадоў перажыло не адну дэвальвацыю. У мяне, з тых самых смутных часоў, засталася звычка купляць з заробку 100 долараў. Так, на ўсякі выпадак. Але купляю я іх у той час, калі курс быў на мінімуме, калі паміж курсам пакупкі і курсам продажу амаль не было зазору, так званай маржы.

А што мы маем цяпер? Гэтая самая маржа вагаецца ад 20 да 60 капеек. Столькі зарабляе абменны пункт банка ад куплі-продажу аднаго долара. Для банкаў гэта залаты час.

СТАР. 4

# «ПАГРОЗЫ ВАЕННАЙ БЯСПЕЦЫ НАШАЙ КРАІНЫ БУДУЦЬ ЗНАХОДЗІЦЦА НА ЎЗРОЎНІ ВЫСОКАГА АБВАСТРЭННЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы заўсёды асцерагаліся прысутнасці ў сумежных дзяржавах, асабліва ва Украіне, наёмнікаў. Наша разведка і іншыя крыніцы выявілі такіх наёмнікаў. Яны не пераходзяць граніцу з Беларуссю, ацерагаюцца, але рухаюцца паралельна беларуска-ўкраінскай граніцы ў напрамку Чарнобыля», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

У гэтай сувязі ён ставіць пагранічнікам задачу — не дапусціць парушэння нашай граніцы наёмнікамі. Паводле слоў Прэзідэнта, украінскія пагранічнікі сышлі са сваіх пастоў і той бок граніцы ніхто не ахоўвае. «Таму ваша задача, задача вашай разведкі — бачыць, што адбываецца на сумежнай тэрыторыі. Асабліва адносна наёмнікаў. Нам ужо і насельніцтва мясцовае сігналізуе: прыйшлі чужыя людзі з незразумелай, непадобнай на еўрапейскую знешнасцю», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.

***Другая задача для беларускіх ваенных, якую паставіў на нарадзе Прэзідэнт, — не дапусціць удару «ў спіну» расійскім Узброеным Сілам, не дазволіць перарэзаць ім шляхі забеспячэння арміі.***

***Трэці кірунак асаблівай небяспекі, на які звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, — дзеянні супраць войскаў Саюзнай дзяржавы.*** «Мы цалкам задуму не ведаем, таму прыходзіцца дзейнічаць па ўсіх кірунках. Магчыма, іх задумы — супраць размяшчэння Узброеных Сіл нашых і расійскіх часцей, што засталіся пасля вучэнняў на нашай тэрыторыі», — звярнуў увагу кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адзначыў: беларускія ваенныя павінны бачыць, як рухаюцца і дзе размяшчаюцца сілы наёмнікаў.

***Яшчэ адна прычына для неспакою — Чарнобыль.*** Па словах Аляксандра Лукашэнкі, расійскі калега Уладзімір Пуцін учора ў тэлефоннай размове паведаміў, што адбываецца ў раёне Чарнобыльскай АЭС.

«Мы самі бачым: іх інфармацыя супадае з нашай — спынена падача электраэнергіі на Чарнобыльскую станцыю. Вы ж разумееце, сама станцыя выпрацоўвае энергію, але ж і спажывае, каб працаваць, шмат энергіі. Там сховішча ядзерных адходаў, і для гэтага працэсу неабходная як мінімум халодная вада для ахалоджвання. А гэта электрычнасць, а электрычнасці няма. Задзейнічаны рэзервовыя магутнасці. І сёння ноччу, раніцай нашы спецыялісты працавалі на Чарнобыльскай станцыі. Міністру энергетыкі даручана арганізаваць гэту работу, каб імгненна падаць туды электраэнергію», — расказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, беларускія інжынеры павінны аднавіць законсерваваную ў савецкія часы лінію электраперадачы паміж АЭС і Беларуссю. Такім чынам да станцыі будуць падаваць электрычнасць. Гэта дапаможа ў штатным рэжыме забяспечыць бяспеку Чарнобыльскай станцыі, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Аварыйныя сістэмы могуць працаваць месяц-паўтара, але гэта аварыйныя. А калі адключацца?! Усё — Фукусіма. Таму неабходна прадугледзець усе варыянты», — заявіў Прэзідэнт.

Ён зноў звярнуўся да пагранічнікаў з загадам кантраляваць дзеянні наёмнікаў, якія з невядомымі мэтамі ідуць да Чарнобыльскай АЭС.

Дадаткова абцяжарваюць сітуацыю на беларуска-ўкраінскай граніцы бежанцы з Украіны. Сярод іх, па словах Аляксандра Лукашэнкі, — дзеці, старыя, жанчыны, у тым ліку і цяжарныя.

«Я прашу, каб Брэсцкі і Гомельскі губернатары трымалі гэта на кантролі. Яшчэ раз трэба ім прапанаваць: калі не хопіць месца, хай іх размяшчаюць у санаторыях. Мы павінны прыняць гэтых бедных людзей. Гэта бедныя людзі, якія па трое сутак, па тыдні нічога не елі», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Рэзюмуючы ўступнае слова на нарадзе, Прэзідэнт заўважыў, што праблем не стане меней. Ён яшчэ раз паўтарыў: Беларусь не збіраецца нікога правакаваць. «Але мы павінны бачыць: як толькі пераступіў нашу граніцу — адказ павінен быць імгненны. Генерал Лапо (Анатоль, старшыня ДПК. — «**Зв.**») ведае. Баяздольнасць Узброеных Сіл у гэтай сітуацыі павінна быць на самым высокім узроўні», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго, Беларусь мае кампактную дзеяздольную армію. Дзяржава прымае меры па забеспячэнні Узброеных Сіл новымі сучаснымі ўзорамі ўзбраення. Удасканальваецца падрыхтоўка войскаў да выканання задач па прызначэнні, сістэматычна праводзяцца вучэнні.

«Нашай арміі трэба развівацца з улікам сучаснага досведу вядзення ваенных дзеянняў. Хачу пачуць ваша меркаванне аб сітуацыі ва Украіне і чаму гэты вопыт нас вучыць. На сёння мы ўжо бачым асаблівасці правядзення вайсковай аперацыі ва Украіне. Маем інфармацыю аб працягу нарошчвання колькасці і характары дзеянняў груповак войскаў каля заходніх граніц Беларусі», — заявіў Прэзідэнт.

Ён канстатаваў, што ваенным яшчэ трэба абагульніць і вывучыць досвед вядзення баявых дзеянняў у цэлым за ўвесь перыяд аперацыі. Але некаторыя меры ваенныя, на думку Аляксандра Лукашэнкі, мусяць прымаць ужо сёння.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Рабочы візіт у Маскву

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка здзейсніць рабочы візіт у Расійскую Федэрацыю, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У Маскве 11 сакавіка адбудуцца перагаворы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Лідары краін абмяркуюць актуальныя пытанні двухбаковых адносін, развіццё саюзнай кааперацыі, эканамічнае ўзаемадзеянне ва ўмовах санкцыйнага ціску. На парадку дня таксама абстаноўка ў рэгіёне і ва Украіне.

## У тэму

### «МЫ АДСОЧВАЕМ УСЕ МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ АДБЫВАЮЦЦА НА ЗАХОДНІХ ГРАНІЦАХ»

**Віктар ХРЭНІН, міністр абароны Беларусі,** заявіў, што асноўная задача, пастаўленая на нарадзе, — назіраць за падзеямі і забяспечваць прыкрыццё тылу нашага асноўнага саюзніка, які зараз выконвае спецаперацыю.

«Мы адсочваем усе мерапрыемствы, якія адбываюцца на заходніх граніцах. Мы чуем алармісцкія заявы ад шэрагу палітыкаў. Мы бачым, як ідзе ўзмацненне быццам бы ўсходняга фланга НАТА. Ужо, па нашых ацэнках, прыбыло да 10 тысяч чалавек у краіны захаду, — сказаў міністр. — Гучаць сёння просьбы разгортвання яшчэ дадатковых батальёнаў паблізу нашых граніц».

Адзначыў ён і ўзмацненне авіяцыйнай групоўкі заходніх краін, палёты якой праходзяць недалёка ад беларускіх граніц з мэтамі разведкі.

Для папярэджання пагроз, акцэнтаваў Віктар Хрэнін, Прэзідэнтам пастаўлена задача несці дзяжурства ва ўзмоцненым рэжыме. «Сілы імгненнага рэагавання знаходзяцца ў гатоўнасці да выканання задач па прызначэнні. На паўднёвых граніцах сёння пяць батальённа-тактычных груп выконваюць задачы па прыкрыцці паўднёвай граніцы, дзе таксама непакояць наёмнікі, якія заходзяць на тэрыторыю Украіны без кантролю», — заявіў міністр абароны.

Ён дадаў, што наёмнікі небяспечныя непрадказальнасцю сваіх дзеянняў, нестандартнай тактыкай паводзін.

«Яны будуць наносіць урон і мірным людзям, і грамадзянскай інфраструктур. Яны ні з кім не будуць цырымоніцца. Гэта наёмнікі, якія працуюць за грошы. Гэта забойцы», — канстатаваў кіраўнік ваеннага ведамства.

Паводле яго, словы Прэзідэнта аб тым, што «мы будзем змагацца і паміраць на сваёй зямлі», для беларускіх ваенных людзей гучаць як задача.

«Мы, усе ваеннаслужачыя, знаходзімся ў сябе, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і выконваем задачы толькі па забеспячэнні бяспекі нашай краіны», — сказаў Віктар Хрэнін.

Грамадства

# НЕЧАКАНЫ ПАДАРУНАК

**Указам Прэзідэнта Беларусі ў сувязі з Міжнародным жаночым днём 8 Сакавіка памілаваны чатыры асуджаныя Гомельскай папраўчай калоніі. Жанчыны адбывалі пакаранне за супрацьпраўныя дзеянні падчас пратэснай актыўнасці. Усе яны шчыра раскаяліся ў зробленым. Адразу пасля абвяшчэння ўказа аб іх памілаванні ўжо былыя асуджаныя пакінулі калонію, каб вярнуцца да сваіх родных.**

Магчымасць быць з сям'ёй, дзецьмі, самымі блізкімі людзьмі — гэта тое, чаго яны, на жаль, праз свае неабдуманыя дзеянні часова пазбавіліся. У гэтым прызналіся ўсе чатыры памілаваныя Прэзідэнтам жанчыны.

Адной з іх — Настассі — усяго 20 гадоў. Дзяўчына была асуджаная за гвалт у адносінах да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Атрымала два гады пазбаўлення волі. Але Актам памілавання вызвалена цяпер, пасля адбывання ў калоніі крыху менш за год. Дома Настассю чакае брат. Наконт сваіх першых эмоцый пасля атрымання звесткі аб памілаванні дзяўчына расказала, што нават разгубілася. На пытанне, ці разумее, што ёй дадзены шанц перагледзець сваё жыццё, адказвала рашуча:

— Вядома, разумею. Цаню гэта. Мне ўсяго 20 гадоў, і ўсё жыццё наперадзе. Гэта была памылка, якой больш не дапушчу.

У свой час дзяўчына вучылася на педагога дашкольнай адукацыі, вучобу не скончыла. Цяпер у найбліжэйшых планах Анастасіі — працяг адукацыі.

Сярод тых, хто, дзякуючы Акту памілавання Прэзідэнта, змажа зноў вярнуцца да сваёй сям'і, — Наталля. Медработніца з Брэста была асуджаная і адбывала пакаранне ў гомельскай калоніі за абразу ў адрас кіраўніка дзяржавы.

— Вельмі моцна раскайваюся. Ды я адразу шкадавала аб тым, што зрабіла... Быў проста такі эмацыянальны стан... Былі эмоцыі, і, можа, не разумела нават, што вымаўляла. Прашу прабачэння ў Прэзідэнта.


Фота БелТА.

І прасіла просьбу аб памілаванні. Я вельмі ўдзячная, што кіраўнік дзяржавы паверыў мне. Паверыў, што гэта было не са зла. Дзякуй яму, — прызналася Наталля.

Да заканчэння тэрміну адбывання пакарання жанчыне заставалася 5 месяцаў. Дома яе чакаюць дачка і ўнукі.

— Гэта ўвогуле ў жыцці найлепшы падарунак, што сам Прэзідэнт паверыў і памілаваў. У жыцці такіх падарункаў больш не будзе, і не трэба... Пакуль ва ўсё гэта яшчэ не верыцца... Тут кожны дзень без родных, без сям'і... Гэта, вядома, цяжка. Пераасэнсоўваеш усё. Разуменне прыходзіць ужо з таго моманту, калі цябе выводзяць з залы суда. Вось тады і ўсведамляеш, што звыклае жыццё спынілася, што з табой адбываецца тое, аб чым раней нават не думаў, — падзялілася сваімі эмоцыямі памілаваная.

Да пазбаўлення волі Наталля займалася доглядам за ляжачымі пажылымі людзьмі. Расказала, што хоча і далей аказваць дапамогу састарэлым.

— Не віна ж кіраўніка дзяржавы ў тым, што адбылося. Сам чалавек у першую чаргу вінаваты ў тым, што адбываецца ў яго жыцці, — аб тым, як перагледзела свае жыццёвыя прынцыпы, расказала яшчэ адна памілаваная — Людміла з Пружан.

Жанчына пры гэтым неахвотна тлумачыла прычыну, з якой атрымала тэрмін у калоніі. Вядома, няма чым ганарыцца. Але цвёрда запэўнівае, што раскаялася, поўнасцю асэнсавала сваю віну.

Каля дзесяці гадоў таму ў яе быў уласны вясельны салон. Потым занялася дапамогай бяздомным жывёлам. Гэтай дзейнасцю плануе займацца і далей. Дома ж, прызнаецца, вяртання дачкі вельмі чакае 81-гадовая маці. Таму для Людмілы цяпер найлепшы падарунак — магчымасць хутчэй убачыць, абняць і супакоіць самага роднага чалавека.

Чацвёртую памілаваную Прэзідэнтам — Алу з Баранавіч — дома чакаюць трое дзяцей і ўнукі. Адсутнасць зносін з імі, як прызналася жанчына, была для яе самым цяжкім у калоніі. Асэнсаванне таго, што страціла «на волі», прыйшло вельмі хутка:

— Прыйшло поўнае ўсведамленне таго, што адбылося, калі не бачу дзяцей, не маю зносін з імі. Мяне гэта адразу як працверазіла, — паясніла Ала. — Галоўная выснова, якую зрабіла, — заўсёды важна заставацца са сваёй думкай, а не весціся на чужое. І не паддавацца эмоцыям. Спадзяюся, што ў далейшым не паўтару такіх памылак.

Жанчына была асуджаная за абразлівыя каментарыі ў адрас улад. Яна расказала, што, на шчасце, не стала дрэнным прыкладам для сваіх траіх дзяцей:

— Дзеці, наадварот, адгаворвалі мяне ад падобных рэчаў. Пыталіся, як магу весціся на такое ў інтэрнэце, як магу ў такое верыць? Дзяцей жа ўсё задавальняе. Вучацца ў школе, адзін — ва ўніверсітэце. Старэйшы сын ужо працуе... Шчаслівая, што хутка іх убачу, — адзначыла Ала.

Да зняволення жанчына працавала касірам у магазіне. Цяпер марыць далей наладжваць жыццё: падымаць дзяцей, зноў пачаць працаваць.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# «Мы разам пішам гісторыю беларускай дзяржаўнасці»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

У дачыненні да лютаўскага рэферэндуму варта казаць аб цэлым шэрагу асаблівасцяў. Па-першае, гэта сукупнасць негатыўных знешніх фактараў, сярод якіх і спроба дзяржаўнага перавароту ў Рэспубліцы Казахстан, і задзейнічанне сіл АДКБ для нармалізацыі абстаноўкі, і рэалізацыя мяжуючых са злачынствам «дэмакратычных» метадаў пераадолення міграцыйнага крызісу нашымі еўрапейскімі суседзямі, і небывалы санкцыйны ціск на Беларусь, і чарговая хваля COVID, і масавыя пратэсты супраць звязаных з гэтым абмежаванняў, і нагнятанне абстаноўкі паблізу нашых граніц, і спецыяльная аперацыя па дэмілітарызацыі і дэнацыфікацыі Украіны. Па-другое, гэта глыбокая прапрацоўка праекта абноўленай Канстытуцыі і эфектыўная інфармацыйная кампанія па тлумачэнні сутнасці змен, якія ўносяцца ў Асноўны Закон. Па-трэцяе, сапраўды ўсенароднае абмеркаванне прапанаваных змен, актыўная пазіцыя беларускага грамадства, усебаковая ацэнка новых палажэнняў і рэальны дыялог дзяржавы і народа. Дастаткова адзначыць, што ў рамках абмеркавання праекта Канстытуцыі было пададзена каля дзевяці тысяч прапаноў па яго змесце.

***— Вы неадназначна казалі аб сацыяльнай накіраванасці беларускай палітыкі. Як гэты тэзіс знайшоў адлюстраванне ў абноўленай Канстытуцыі?***

— Сацыяльная справядлівасць і клопат аб людзях — базавыя каштоўнасці нацыянальнай мадэлі дзяржаўнасці на працягу апошніх дзесяцігоддзяў. Гэта чарговы раз падкрэсліў Прэзідэнт краіны ў штогадовым Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу ў студзені 2022 года. Справядлівасць, адказнасць, клопат — простыя і зразумелыя прынцыпы беларускай палітыкі, у адпаведнасці з якімі выбудоўваюцца ўзаемаадносіны народа і ўлады, рэалізоўваюцца сацыяльныя меры і гарантыі. Мы паслядоўна будуем дзяржаву для народа, адаптуючы ўласнае заканадаўства да сучасных умоў. З Канстытуцыі не выдалена ні адна норма, якая датычыцца сацыяльных гарантый: бясплатныя адукацыя, ахова здароўя, пенсіённае забеспячэнне, падтрымка ўразлівых катэгорый насельніцтва, фінансавае стымуляванне нараджальнасці. Дадаткова замацоўваецца палажэнне аб тым, што «дзяржава садзейнічае духоўнаму, маральнаму, інтэлектуальнаму і фізічнаму развіццю моладзі, стварае неабходныя ўмовы для яе свабоднага і эфектыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, рэалізацыі патэнцыялу моладзі ў інтарэсах усяго грамадства». Прынцыпы, агучаныя кіраўніком дзяржавы, паслядоўна рэалізоўваюцца ў практыцы на карысць усіх беларусаў, чарговы раз пацвярджаючы: словы ўлады не разыходзяцца са справамі, што зусім забыта ў краінах «заходняй дэмакратыі».

***— Адным з найважнейшых элементаў сацыяльнага блоку з'яўляецца здароўе нацыі. Што ў гэтым кірунку плануецца дадаткова зрабіць?***

— Сёння Беларусь уваходзіць у 50 найлепшых краін па паказчыках эфектыўнасці нацыянальнай сістэмы аховы здароўя, апярэджваючы ЗША, а таксама знаходзіцца ў лідарах па камфорце ўмоў для мацярынства. Штогод у краіне адкрываюцца новыя і мадэрнізуюцца лячэбныя ўстановы. Дзеючая Канстытуцыя гарантуе ўсім беларускім грамадзянам права на ахову здароўя. Разам з тым гэта норма дапоўнена палажэннем «уключаючы бясплатнае лячэнне за кошт дзяржаўных сродкаў у парадку, устаноўленым законам», якое канкрэтызуе адказнасць улады. Вопыт барацьбы з пандэміяй COVID-19 з'явіўся асновай для замацавання ў Канстытуцыі палажэння аб тым, што «грамадзяне абавязаны прымаць меры па захаванні і ўмацаванні ўласнага здароўя», паколькі безадказныя паводзіны асобнага чалавека ствараюць пагрозу для навакольных, перакрэсліваючы намаганні ўсяго грамадства.

***— Разам з тым «адукаваная» Еўропа чарговы раз не прызнала вынікі беларускага рэферэндуму па Канстытуцыі і абвінаваціла Беларусь у адсутнасці дэмакратыі...***

— Гэта вынік двайных стандартаў заходняй палітыкі і крызісу міжнародных дэмакратычных інстытутаў. Чарговы раз успамінаецца грыбаедаўскае: «А суддзі хто?». Нацыянальны эгаізм, грэбаванне інтарэсамі сваіх партнёраў і нават саюзнікаў, эгацэнтрызм, знеуважанне міжнародных нормаў — неад'емныя элементы палітыкі вядучых сусветных гульцоў. Паводле даследаванняў Школы кіравання імя Дж. Кенэдзі Гарвардскага ўніверсітэта, толькі 7 % маладых амерыканцаў лічаць ЗША «здаровай дэмакратыяй». Разам з тым «прасоўванне дэмакратыі» — гэта галоўная ідэя Захаду, які сёння адчувае найглыбейшы сістэмны крызіс, звязаны з фарміраваннем шматпалярнага светаўладкавання. Адпаведна, рэферэндумы (выбары) у нашай краіне, якая праводзіць самастойную палітыку, ніколі не будуць прызнаныя ні Амерыкай, ні Еўропай. Ім не патрэбная суверэнная і незалежная Беларусь, а неабходная марыянеткавая дзяржава, якая ўваходзіць у «санітарны кардон» на граніцы з Расіяй.

Мы, беларусы, жывём і будзем жыць па законах, ухваленых нашым народам, выбудоўваць сяброўскія адносіны з усімі, хто да гэтага імкнецца, самастойна фарміраваць дзяржаўную палітыку, кіруючыся прынцыпам павагі інтарэсаў іншых краін. Што да палажэнняў унутранай і знешняй палітыкі, то беларускі народ можа выпрацоўваць і ўдакладняць іх без старонняй дапамогі, аб чым сведчаць вынікі галасавання на рэспубліканскім рэферэндуме 2022 года. Больш за 82 % грамадзян, якія прынялі ў ім удзел, выбралі шлях далейшага эвалюцыйнага развіцця, прапанаваны Прэзідэнтам, падтрымалі існуючую ўладу і адобрылі крокі па рэалізацыі намечаных планаў. Дэмакратыя — гэта ўлада народа, а рэферэндум — універсальны інструмент рэалізацыі грамадзянскага права на ўдзел у кіраванні дзяржавай. 27 лютага беларускі народ зрабіў свой выбар. Якой будзе Беларусь заўтра, залежыць ад кожнага з нас! Ужо сёння, нягледзячы на знешні ціск, грунтуючыся на палажэнні абноўленай Канстытуцыі, мы разам пішам гісторыю нашай дзяржаўнасці, абараняючы гістарычную памяць, прытрымліваючыся духоўных каштоўнасцяў, ствараючы краіну для годнага жыцця, якое перададзім сваім дзецям і ўнукам.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Лаўроў назваў перагаворы з Украінай у Беларусі безальтэрнатыўнымі

Расія настроеная весці перагаворы з Украінай у Беларусі сур'ёзна. Аб гэтым заявіў кіраўнік МЗС РФ Сяргей Лаўроў па выніках сустрэчы з украінскім калегам Дзмітрыем Кулебам, паведаміла РІА «Навіны». Кіраўнік МЗС Украіны заявіў, што перагаворы былі складанымі. Паводле яго слоў, размова працягнулася каля 1,5 гадзіны пры пасрэдніцтве Турцыі. Па словах Сяргея Лаўрова, сустрэча, якая прайшла ў Анталі, не падмяняе сабой асноўныя кантакты дэлегацый Расіі і Украіны ў Беларусі. Перагаворшчыкі імкнуцца «ўзгадняць тыя рэчы, якія па агульным прызнанні павінны быць вырашаны ў кантэксце ўзаемадзеяння ўрэгулявання ўкраінскага крызісу», сказаў міністр. «На апошнім раўндзе перагавораў у Беларусі расійскі бок прадставіў гранічна канкрэтныя, ужо ў форме праекта юрыдычнага дакумента, меркаванні. І ўкраінскі бок, узяўшы гэтыя прапановы ў прапрацоўку ў Кіеве, запэўніў, што ў хуткім часе дасць на іх канкрэтны адказ», — падкрэсліў Сяргей Лаўроў.

### Юн Сок Ёля абралі прэзідэнтам Рэспублікі Карэя



Кандыдат у прэзідэнты Рэспублікі Карэя ад вядучай апазіцыйнай партыі «Сіла народа» Юн Сок Ёль атрымлівае перамогу на выбарах, яго асноўны канкурэнт Лі Чжэ Мён ад кіруючай Дэмакратычнай партыі «Табура» прызнаў паражэнне: «Я зрабіў усё магчымае, але не апраўдаў вашых чаканняў». Юн Сок Ёль падзякаваў сваім прыхільнікам, перш чым адправіцца ў штаб-кватэру партыі. Ён зменіць на пасадзе прэзідэнта краіны Мун Чжэ Іна. Пра гэта паведаміла паўднёвакарэйскае агенцтва Yonhap. Паводле даных Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Карэя, пасля падліку 98,9 % галасоў за Юн Сок Ёля прагаласавала 48,6 % выбаршчыкаў, за Лі Чжэ Мёна — 47,78 %. Агенцтва Yonhap тлумачыць, што вынікі выбараў могуць істотна паўплываць на далейшае развіццё Паўднёвай Карэі, паколькі кандыдаты разыходзяцца ў пунктах гледжання па пытаннях як унутранай, так і знешняй палітыкі, у тым ліку па праблеме ўзаемаадносін з КНДР.

### У Аўстраліі аб'явілі рэжым надзвычайнага становішча з-за паводак

Прэм'ер-міністр Аўстраліі Скот Морысан аб'явіў у краіне надзвычайнае становішча з-за маштабных паводак на ўсходнім і паўночна-ўсходнім узбярэжжы кантынента. Пра гэта гаворыцца ў заяве ўрада краіны, паведаміла ТАСС. Урад выдзеліць дадатковае фінансаванне пацярпелым абшчынам, якое дапаможа аднавіць разбураныя прадпрыемствы і гарадскую інфраструктуру. Маштабныя паводкі на паўночна-ўсходнім і ўсходнім узбярэжжы Аўстраліі пачаліся ў сярэдзіне лютага з-за працяглых лівеняў. У выніку паводак загінула не менш чым 20 чалавек, яшчэ некалькі лічацца зніклымі без вестак, каля 240 тысяч чалавек страціла свае дамы і маёмасць. Найбольш складанай застаецца сітуацыя ў найбуйнейшым горадзе краіны Сіднеі, дзе моцныя залевы працягваюцца больш як два тыдні запар.

Парламенцкі дзённік

# НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ ДАВЕРУ

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА і пасол Ірана Саід ЯРЫ абмеркавалі пытанні двухбаковага супрацоўніцтва**

**Вітаючы пасла, спікер ніжняй палаты парламента назваў гэтую сустрэчу сімвалічнай: адбылася яна напярэдадні ісламскага свята Наўруз. Павіншаваўшы дыпламатаў і пажадаўшы росквіту краіне, Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што ўмацаванне двухбаковага супрацоўніцтва паміж краінамі будзе садзейнічаць таму, каб Беларусь і Іран развіваліся і далей.**



Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што ў верасні мінулага года ў Душанбэ адбылася сустрэча прэзідэнтаў дзвюх дзяржаў, дзе былі дасягнуты дамоўленасці па трох важных кірунках. «Гэта фарміраванне дарожнай карты развіцця нашага супрацоўніцтва, аптымізацыя работы змяшанай двухбаковай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве, а таксама завяршэнне рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, — заўважыў Уладзімір Андрэйчанка. — Гэтыя, а таксама пытанні міжпарламенцкага супрацоўніцтва абмяркоўваліся і падчас майго візіту ў вашу краіну ў рамках інаўгурацыі прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі спадара Эбрахіма Раісі, сустрэчы са спікерам спадаром Галібафам у жніўні мінулага года. Летась у верасні ўсе прапановы беларускага боку па змесце дарожнай карты былі перададзены іранскаму боку падчас сустрэчы міністраў замежных спраў у рамках Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый».

— Ужо не толькі Іран, а і Рэспубліка Беларусь, а таксама наш агульны партнёр — Расія, сутыкнуліся з беспрэцэдэнтнымі санкцыямі, ціскам з боку Злучаных Штатаў Амерыкі, іх саюзнікаў, — заявіў спікер ніжняй палаты парламента. — Мэты іх мы добра ведаем: яны, мякка кажучы, непрыстойныя. Па вялікім рахунку гэта злачынныя мэты. І толькі аб'яднаўшыся і разам узаемадзейнічаючы, мы можам выстаяць у гэтых умовах. Мы зацікаўленыя ў развіцці нашых адносін і спадзяёмся, што прапановы беларускага боку па дарожнай карце будуць у найбліжэйшы час разгледжаны.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Іран у Беларусі Саід ЯРЫ** паведаміў аб перспектыве ўсебаковых адносін з Беларуссю. «Ва ўсіх кірунках ёсць патэнцыял для ўзаемадзеяння, — лічыць пасол. — Прыярытэт для нас — узаемадзеянне і супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы з Рэспублікай Беларусь, дружалюбнай для нас краінай. Таксама хачу адзначыць, што ў сферы навукі і тэхналогій, а таксама адукацыі ёсць магчымасці для супрацоўніцтва. Галоўная падстава для развіцця ўсіх гэтых кірункаў — добрыя адносіны на высокім узроўні ў палітычнай сферы паміж нашымі краінамі. У нас высокі ўзровень даверу, мы спадзяёмся ў хуткім часе развівацца па ўсіх кірунках больш, чым раней».

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ**, Іран з'яўляецца дружалюбнай краінай, наша ўзаемадзеянне развіваецца літаральна па ўсіх кірунках. «Вядома, яно абмежаванае санкцыямі, якія несправядліва ўведзены ў адносінах да Ірана пасля выхаду з ядзернай здзелкі Злучаных Штатаў Амерыкі, — удакладніў парламентарый. — Мы ўважліва сочым за тым працэсам і падтрымліваем намаганні міжнароднай супольнасці па вяртанні да міжнародных дамоўленасцяў, якія будуць прымальныя для ўсіх бакоў. У гэтым выпадку ў нас з'явяцца сапраўды сур'ёзныя перспектывы ўзаемадзеяння практычна ва ўсіх галінах: у сферы сельскай гаспадаркі, машынабудавання, нафтаперапрацоўкі, лагістыкі. Ужо цяпер у нас дастаткова актыўна развіваецца ўзаемадзеянне ў сферы адукацыі, навуковага супрацоўніцтва».

Дэпутат звярнуў увагу на яшчэ адзін факт. «Іран знаходзіцца пад уплывам заходніх санкцый ужо больш чым 40 гадоў, — падкрэсліў Андрэй Савіных. — Тым не менш яны знайшлі спосабы супрацьдзеяння гэтаму санкцыйнаму ціску і з'яўляюцца, па сутнасці, адной з найбуйнейшых эканомік Блізкага Усходу. Гэты вопыт таксама важны цяпер, калі санкцыі становяцца звычайным інструментам барацьбы з канкурэнтамі з боку калектыўнага Захаду».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# ЦІ ВАРТА БЕГАЦЬ ПА ВАЛЮТУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таму нядзіўна, што ў эфіры тэлеканала СТБ **старшы выкладчык кафедры эканамічнай тэорыі і маркетынгу БДТУ Юлія АБУХОВІЧ** назвала дадзеную сітуацыю ў краіне «спекуляцыйным курсам валюты». Але толькі з аднаго боку.

«З іншага боку, мы не павінны забываць, што наша валюта прывязаная да кошыка валют, дзе 50 % — гэта расійскі рубель», — адзначыла эксперт. Таму прасадка расійскага рубля, па яе словах, адаб'ецца і на беларускай валюце. Разам з тым, усе ваганні беларускага рубля ў мінулыя гады былі звязаныя менавіта з праблемамі, якія адчуваў расійскі. Аднак беларускі рубель — «дастаткова моцная валюта», і «людзі пачынаюць думаць», — паведаміла эксперт. «Хутчэй за ўсё, перажыўшы 2020 год, мы пачалі крытычна ставіцца да таго, што адбываецца. Мозг пачалі ўключаць, як кажа цяпер моладзь», — падкрэсліла Юлія Абуховіч.

## На знешніх рынках — падзенне расійскага рубля

Аналітыкі адзначаюць, што калі казаць аб знешніх рынках, то за мінулы тыдзень пара еўра/долар умерана знізілася на 0,7 %.

Больш важным і відавочным фактарам было паніжэнне пазіцый расійскага рубля. Асноўная прычына падзення расійскай валюты — гэта сітуацыя ва Украіне. Але яшчэ адным важным фактарам стала замарожванне золатавалютных рэзерваў Расіі, прынамсі, той іх часткі, якая захоўваецца ў краінах Захаду. Гэта значыць, што расійскі Цэнтрабанк не можа выкарыстоўваць ні долары, ні еўра для інтэрвенцый на сваім валютным рынку.

У выніку за тыдзень цана долара ў Расіі павысілася да значна вышэйшай за 100 рублёў, або больш чым на 30 %. Адносна беларускага рубля, натуральна, долар і еўра падаражэлі, а расійскі рубель патаннеў больш чым на 15 %.

Дарэчы, валютны кошык да сярэдзіны тыдня паспеў абнавіць максімум з пачатку года, нягледзячы на тое, што па выніках тыдня знізіўся.

## Наступствы будуць для ўсіх

Сітуацыя на валютным рынку — абсалютна прадказальная і зразумелая рэакцыя на тое, што ўвесь свет бачыць у інтэрнэце і па тэлевізары, выказаў сваё меркаванне беларускі **эксперт фондавага рынку і фінансавы кансультант нашай краіны Міхаіл ГРАЧОЎ.** У выпадку абвастрэння сітуацыі вакол Украіны таксама адбылося некаторае аслабленне беларускага рубля. «Цалкам адназначна — нічога добрага ў гэтым няма. Наступствы будуць для беларускай, для расійскай і для ўсёй сусветнай эканомікі, фінансавай сістэмы.

На яго думку, калі рабіць прагноз на найбліжэйшыя дні, не выключана далейшае падзенне як расійскага, так і беларускага рубля. Але верагодна тое самае адбудзецца і з еўра, і з доларам. «Усе індэксы валяцца. Расце цана на долар, на каштоўныя металы — найперш на золата. Калі падзеі будуць развівацца і далей неаптымістычна, то мы ўбачым цану на золата вышэй як 2000 за унцыю з высокай доляй верагоднасці. Гэта не трэба сусветнай эканоміцы. Таму што, акрамя валютнага складніка фінансавага рынку, ёсць яшчэ і рынак каштоўных папер», — адзначае Міхаіл Грачоў.

Беларускі валютны рынак аналагічна рэагуе на сусветную сітуацыю: спачатку аслабеў да сусветных валют, пасля некаторай стабілізацыі сітуацыі — умацаваўся да долара і еўра. Цяпер — зноў аслабеў.

«Гэтыя ваганні валютнага кошыка дазваляюць балансаваць беларускаму рублю. І гэта дасягаецца за кошт таго, што «падае» адно плячо, а другое расце ў цане. Але калі ацэньваць гэта на бытавым узроўні, то, калі ў нас асноўная частка валютных зберажэнняў знаходзіцца ў доларах, то ўмацаванне яго для фінансавай сістэмы не ёсць вельмі добра. Павінен быць збалансаваны курс, і калі адна з валют расце не з эканамічных прычын, то гэта адназначна негатыўная з'ява ў фінансавай сістэме», — упэўнены эксперт.

«Беларускі рубель летась даваў добрыя паказчыкі. Толькі ў канцы снежня трохі не ўтрымаўся. У цэлым усё было вельмі добра, унутраных фактараў і цяпер для змены курсу рубля папросту няма. У краіне ў прынцыпе з фінансавага пункту гледжання падстаў для рэзкага росту рубля няма».

Ды ёсць адно «але». Прывязка беларускага рубля да расійскага нікуды не падзелася, і гэта не магло не адбіцца на курсах.

«Цана за барэль нафты вышэйшая за 100 долараў, аб такой цане раней можна было толькі марыць, даходы ў Расіі шыкоўныя, у іх прафіцыт бюджэту за мінулы год — 500 мільярдаў. Усё добра. З фінансавага пункту гледжання расійскаму рублю нічога не пагражае», — мяркуе Міхаіл Грачоў. Якой будзе сітуацыя на расійскім фінансавым рынку — яшчэ залежыць ад таго, наколькі моцныя будуць санкцыі, і ад таго, як адкажа на абмежаванні Масква, каб засцерагчы расіян ад іх наступстваў.

На думку аналітыка, калі адбудзецца зніжэнне градуса напружання, то абодва рублі — і расійскі, і беларускі — будуць умацоўвацца. Ён звяртае ўвагу, што палітыка непрадказальная, але рынак так ці інакш будзе імкнуцца да стабільнасці. «І як толькі рынак убачыць, што ўсё стабілізавалася, адыграе ўсё назад. Таму што рынак не любіць непрадказальнасці».

Паводле яго слоў, беларускі рэгулятар у выпадку небяспечнай сітуацыі з рублём можа таксама ўжываць нейкія інструменты для ўтрымання раўнаважнага становішча. «Яны дазваляюць мікшыраваць гэтыя рызыкі. **У Нацбанка ёсць рэзервы, рэсурсы і тэхналогіі, якія дазваляюць рэгуляваць скачкі на валютным рынку»,** — дадае фінансавы аналітык.

## У чым жа захоўваць свае сродкі?

Што датычыцца зберажэння сродкаў, многія фінансісты рынку прапануюць пакідаць іх у той валюце, якая патрэбная ў хуткім часе. Калі плануе выдаткоўваць беларускія рублі з карткі, то купляць долары ці еўра трэба акуратна, каб не страціць на ваганнях курсаў. А лепш дачакацца моманту, калі спадзе ажыятаж. Уласна, шмат у чым з-за яго курс паўзе ўверх. Дарэчы, захоўваць зберажэнні таксама можна ў больш устойлівых валютах, напрыклад, швейцарскіх франках.

## Што будзе з крэдытамі на жыллё?

Як вядома, з пачатку сакавіка ў нашай краіне павысілася стаўка рэфінансавання з 9,25 % да 12 %, а разам з ёй падаражэюць і крэдыты. Разам са стаўкай рэфінансавання вырастуць і стаўкі па прадастаўленні або канфіскацыі ліквіднасці. Калі казаць аб раней выдадзеных крэдытах, у якіх стаўка не фіксаваная, а плаваючая і прывязаная да аднаго з гэтых паказчыкаў, натуральна, крэдытная стаўка вырасце.

На думку аналітыкаў, тут не вельмі прыемная навіна ў тым, што цяпер крэдытаў на куплю жылля будуць выдаваць значна менш. Калі наогул будуць. Новыя санкцыі супраць банкаў, адключэнне ад SWIFT — гэта ўсё можа істотна пагоршыць ліквіднасць банкаў. А калі будуць праблемы з ліквіднасцю, банкам будзе не да крэдытавання, асабліва не да доўгатэрміновага крэдытавання ў беларускіх рублях.

Але казаць пра тое, ці спыняць банкі крэдытаванне, складана, адзначае эксперт. У кожнага банка свае праблемы, свая ліквіднасць, свая падушка бяспекі і свае санкцыі.

## Што значыць адключэнне ад SWIFT для банкаў і іх кліентаў?

Адключэнне ад SWIFT, калі яно здарыцца, прывядзе да таго, што банкі будуць цалкам адрэзаныя ад знешняга свету, але камунікацыя з іншымі фінансавымі ўстановамі будзе складанейшая і даражэйшая.

Адключэнне ад SWIFT не азначае, што банкі цалкам страцяць магчымасць праводзіць міжнародныя плацяжы. Гэта можна рабіць у так званым ручным рэжыме — з дапамогай электроннай пошты, тэлекса. Але другі бок, з якім узаемадзейнічае беларускі банк, павінен пагадзіцца на плацяжы ў такім рэжыме.

Акрамя SWIFT, ёсць іншыя сістэмы абмену фінансавымі паведамленнямі. Напрыклад, усе беларускія банкі далучаныя да расійскай альтэрнатывы SWIFT — сістэмы перадачы фінансавых паведамленняў Цэнтрабанка РФ. Гэта значыць, што застаецца акно для абмену інфармацыяй з расійскімі банкамі. Да згаданай сістэмы падключаныя некаторыя банкі Казахстана і іншых краін СНД, з імі таксама захаваецца сувязь.

Калі на картку прыходзіла зарплата або пенсія, то для вас нічога не зменіцца. На разлікі карткамі ўнутры краіны адключэнне ад SWIFT таксама не ўплывае, як тлумачыў раней Нацбанк.

Інакш кажучы, сам факт «бану» для банка не азначае, што ў яго кліентаў узнікаюць нейкія праблемы пры аперацыях унутры краіны. Але калі вы захочаце перавесці грошы са свайго рахунку сваякам або сябрам у іншую краіну, то сутыкняцеся з праблемамі. Таму што дадзеная аперацыя якраз ідзе праз SWIFT. У каментарыі, які Нацбанк даваў раней з нагоды магчымага адключэння, адзначалася, што за межамі Беларусі можна разлічвацца карткамі міжнародных плацежных сістэм у беларускіх рублях.

Можна таксама выкарыстоўваць картку плацежнай сістэмы «Белкарт» у краінах прысутнасці плацежнай сістэмы «Мір». Гэта Расія і іншыя краіны — удзельніцы ЕАЭС, Узбекістан, Балгарыя, Кіпр, Турцыя, Вялікабрытанія, ААЭ і Тайланд.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Блізкая ўлада

## Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 12 сакавіка, з 9.00 да 12.00, праводзяць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васільевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Сцяпанавіч КАРАНІК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатольевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Гучная справа

## ТЭРАКТ УЧЫНЕНЫ Ў АДНОСІНАХ ДА ПАСОЛЬСТВА БЕЛАРУСІ Ў ІТАЛІІ

### Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе МЗС

**Невядомыя ў масках раніцай 9 сакавіка падышлі да будынка беларускай замежустановы, трымаючы ў руках неўстаноўленыя прадметы. «Пасля тыя іх падпалілі і перакінулі на тэрыторыю пасольства. Адразу ж пасля таго зламыснікі з месца здарэння зніклі, — расказалі БелТА ў МЗС. — Выбух аднаго з устройстваў адбыўся ў непасрэднай блізкасці ад газавай трубы, што складае непасрэдную небяспеку для ўсяго будынка і можа сведчыць аб адпаведных мэтах зламыснікаў. Адзін з прадметаў не здэтанаваў. У выніку яго візуальнага агляду ўстаноўлена, што гэта паўнацэнная самаробная выбуховая прылада, начыненая поракам».**

У выніку выбуху нанесены істотны ўрон будынку пасольства. У тым ліку выбіты вокны ў консульскім памяшканні, дэфармаваны металічная лаўка, якую ўзрыўной хваляй перакінула праз паўтараметровую ўнутраную агароджу і адкінула на 5-7 метраў убок, металічная шафа для захоўвання рэчаў асоб, што прыбываюць на консульскі прыём, асобныя бетонныя пліты.

«Супрацоўнікамі праваахоўных органаў Італіі, якія прыбылі на месца, здарэнне папярэдне кваліфікаванае як тэрарыстычны акт. Спецыялістамі праведзены ўсе неабходныя следчыя дзеянні, ідзе адпаведная работа. Італьянскі бок заявіў аб сваёй гатоўнасці ўзмацніць ахову замежустановы», — заявілі ў беларускім знешнепалітычным ведамстве.

На шчасце, у выніку здарэння супрацоўнікі дыпмісіі не пацярпелі.

Надвор'е

## ВЯСНА ЗАТРЫМАЛАСЯ...

**Не па сезоне халоднае надвор'е чакаецца ў Беларусі ў бліжэйшыя дні, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Паводле прагнозаў сіноптыкаў, у бліжэйшыя дні ўплываць на надвор'е будзе шырокі і халодны антыцыклон з цэнтрам над еўрапейскай тэрыторыяй Расіі, у сувязі з чым істотных ападкаў па краіне не чакаецца. «Толькі раніцай і ўдзень 12 сакавіка панаванне антыцыклону на ўсходзе краіны зменіць малаактыўны атмасферны фронт і верне адзін з зімовых атрыбутаў — невялікі снег. Не варта чакаць і асаблівай цеплыні. Паўночна-ўсходні вецер будзе падтрымліваць у краіне не па сезоне халоднае надвор'е», — адзначылі ў Белгідрамеце.

**У пятніцу, 11 сакавіка,** будзе без ападкаў. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 6-13 градусаў марозу, месцамі — мінус 14-17. Удзень будзе ад мінус 1 да плюс 5.

**У суботу, 12 сакавіка,** будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і ўдзень месцамі па ўсходзе краіны магчымы кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2-9 градусаў марозу, пры праясненнях — мінус 10-12. Удзень будзе ад нуля да плюс 7.

**У нядзелю, 13 сакавіка,** будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай на асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2-8 градусаў марозу, месцамі — да мінус 10. Удзень будзе 1-8 градусаў цяпла.

**У панядзелак і аўторак, 14-15 сакавіка,** пераважна будзе без ападкаў. Уначы і раніцай на асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1-8 градусаў марозу, месцамі — да мінус 10. Удзень будзе 2-9 градусаў цяпла.

Занятасць

# ЁСЦЬ З ЧАГО ВЫБІРАЦЬ

## Спецыялісты расказалі пра сітуацыю на рынку працы

**Забеспячэнне занятасці — адзін з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. Што адбываецца на рынку працы цяпер, якія прафесіі запатрабаваны і за які тэрмін у сярэднім беспрацоўны можа знайсці новую работу, расказалі спецыялісты.**

Мерапрыемствы, якія праводзяць у нашай краіне ў рамках праграмы «Рынак працы і забеспячэнне занятасці», накіраваны на забеспячэнне збалансаванасці попыту і прапановы, садзейнічанне павышэнню якасці працоўнай сілы і яе канкурэнтаздольнасці, заахвочванне да працоўнай дзейнасці эканамічна неактыўнага насельніцтва. Паводле інфармацыі **намесніка начальніка ўпраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алены ДАКУКІНАЙ,** летась у службы занятасці звярнулася каля 150 тысяч беларусаў, было працаўладкавана 110 тысяч чалавек. Сярэдні перыяд, падчас якога беспрацоўны шукае работу, — каля трох месяцаў.

Як адзначыла Алена Дакукіна, узровень беспрацоўя ў краіне скарачаецца. Летась ён складаў 3,8 % ад агульнай колькасці працаздольнага насельніцтва. Колькасць беспрацоўных скарацілася на 6,5 % у параўнанні з 2020 годам. Летась назіралася ажыўленне на рынку працы: попыт быў як сярод наймальнікаў, так і сярод працоўнай сілы.

Адным з элементаў інфраструктуры, якая дапамагае беспрацоўным, з'яўляецца агульнарэспубліканскі банк вакансій. Гэта электронны рэсурс, дзе размешчана звыш 90 тысяч вакансій. Акрамя таго, беспрацоўны таксама можа размясціць тут сваё рэзюмэ. Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя, калі беспрацоўны найчасцей шукаюць працу самастойна праз інтэрнэт. За мінулы год зарэгістравана 13 мільёнаў зваротаў да агульнарэспубліканскага банка вакансій. Найбольшы попыт на рынку працы — на рабочыя прафесіі.

Яшчэ адной новай формай паслуг службы занятасці з'яўляюцца электронныя кірмашы вакансій. Калі ў 2020-м іх правялі 370, то ўжо летась — 725.

Асобны акцэнт службамі занятасці робіцца на патрэбы наймальнікаў. Каля 4 тысяч беспрацоўных летась накіравана на перанавучанне. З іх 77 % — па заказе наймальніка.

— 2022 год у сферы занятасці насельніцтва будзе дастаткова насычаны. Плануюцца распрацоўка і ўкараненне новых нарматворчых ініцыятыў. У бягучым годзе прадугледжана распрацоўка праекта закона аб занятасці насельніцтва, які мае на ўвазе магчымасць рэгістрацыі грамадзян у якасці беспрацоўных незалежна ад месца іх рэгістрацыі па месцы жыхарства. Гэта дасць магчымасць забяспечыць максімальную мабільнасць грамадзян, якія шукаюць працу, за кошт аказання ім пры рэгістрацыі больш шырокага спектра паслуг, — расказала Алена Дакукіна.

Асаблівую ўвагу будуць удзяляць сёлета занятасці моладзі. Прадугледжана ранняя прафарыентацыйная работа, а яе прыкладам можа служыць акцыя «Дзень з прадпрыемствам», якую службы занятасці праводзілі па ўсёй краіне для навучэнцаў школ. Наступным крокам стане арганізацыя часовай працоўнай занятасці навучэнцаў ва ўстановах адукацыі ў вольны ад вучобы час.

З 2022 года дзяржаўная служба занятасці ўкараняе праактыўны фармат супрацоўніцтва з наймальнікамі. Работа будзе пабудавана па двух асноўных прынцыпах: дапамагчы пастроіць аптымальную кар'еру саіскальніку і набраць штат работадаўцу. У кожным раёне ўжо вызначаны прадпрыемствы, якія адчуваюць патрэбу ў кадрах звыш 10 % ад спісачнай колькасці. Да канца першага квартала ў кожным рэгіёне будуць зацверджаны адпаведныя дарожныя карты. Для аналізу эфектыўнасці ўкаранення гэтага механізму будзе праводзіцца маніторынг. Гэтыя меры дазволяць адрасна вырашаць пытанні занятасці насельніцтва ў асобных рэгіёнах.

У 2022 годзе плануецца аднавіць работу па правядзенні кірмашоў вакансій. У сталіцы агульнагарадскі кірмаш вакансій пройдзе 20 красавіка. Будуць прадугледжаны секцыі для работы з моладдзю, для грамадзян, якія працяглы перыяд не працуюць, і для тых, хто толькі выйшаў на рынак працы, расказала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ.**

Акрамя таго, камітэт робіць акцэнт на маладзёжную групу. Гэта прафарыентацыйныя мерапрыемствы, якія праходзяць на базе арганізацый. Усё для таго, каб маладыя людзі маглі знаёміцца з працоўнымі месцамі і прафесіямі, якія запатрабаваны на рынку працы.

— Трэба ўдзяляць вялікую ўвагу прафарыентацыі па тых прафесіях, якія сёння запатрабаваны на рынку працы. Штотыдзень праводзіцца такія прафарыентацыйныя мерапрыемствы, куды могуць звярнуцца і грамадзяне з ліку моладзі, зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных, і тыя, хто плануе выйсці на рынак працы. Гэта выпускнікі 9—11-х класаў, якія яшчэ не могуць сарыентавацца ў выбары прафесіі, — падкрэсліла Таццяна Кудзевіч.

У Мінскай вобласці адкрыта каля 15 000 вакансій, палова з іх — у сельскай мясцовасці. У цэлым на аднаго беспрацоўнага прыпадае 18 вакансій, гэта значыць, абраць ёсць з чаго. Попыт на спецыялістаў у гарадах і сельскай мясцовасці розніцца: калі ў гарадах запатрабаваны медыкі, інжынеры, бухгалтары, то ў сельскай мясцовасці — трактарысты, электраманцёры.

Як адзначыла **начальнік упраўлення па занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінаблвыканкама Вераніка АЗАРКЕВІЧ,** летась дапамога ў працаўладкаванні аказана больш як 15 000 саіскальнікам. Асабліва спецыялісты дапамагаюць найбольш уразлівымі катэгорыям насельніцтва — інвалідам, пенсіянерам, былым зняволеным.

**Алена КРАВЕЦ.**

Моцныя духам

# РАШЭННЕ АДХІЛІЦЬ НАШЫХ ПАРАЛІМПІЙЦАЎ АД ГУЛЬНЯЎ НЕСПРАВЯДЛІВАЕ

## Праўда з першых вуснаў

**Перад стартам XIII зімовых Паралімпійскіх гульняў у Пекіне да беларускіх і расійскіх спартсменаў не было ніякіх пытанняў. Міжнародны паралімпійскі камітэт не выстаўляў дэлегацыям ніякіх прэтэнзій. А рашэнне аб адхіленні беларусаў і расіян ад удзелу ў Гульнях несправядлівае і неправамернае. Пра гэта заявілі прадстаўнікі Нацыянальнага паралімпійскага камітэта на адмысловай прэс-канферэнцыі.**

«Прэзідэнт Міжнароднага паралімпійскага камітэта Эндру Парсанс падкрэсліваў, што прытрымліваецца нейтралітэту і будзе прытрымлівацца ўстаноўленых законаў. Мы сустракаліся з украінскімі калегамі, і ў нас не было ніякіх праблем, толькі дзелавыя адносіны, нават калі ўжо было абвешчана аб спецаперацыі. Але прэзідэнт украінскага паралімпійскага камітэта разаслаў лісты з просьбай адхіліць беларускіх і расійскіх спартсменаў. Склікаў прэс-канферэнцыю, на якую амаль нікога не запрасіў. І гэтыя дзеянні паўплывалі ўжо на другое рашэнне Міжнароднага паралімпійскага камітэта. Усе былі проста шакаваныя гэтым рашэннем, нам нават не далі шанцу неяк абараніцца», — расказаў **генеральны сакратар Нацыянальнага паралімпійскага камітэта Мікалай ШУДЗЕЙКА.** На Гульнях ён быў шэфам місіі.

Як вядома, спачатку беларускім і расійскім спартсменам дазволілі выступаць на Паралімпіядзе ў нейтральным статусе. Але ранкам наступнага дня было прынята рашэнне аб поўным адхіленні каманд. У сілу яно ўступіла адразу пасля апублікавання. Паралімпійскі камітэт Беларусі накіраваў ліст на адрас кіраўніка Міжнароднага паралімпійскага камітэта са сваім бачаннем гэтай сітуацыі. У ім, у прыватнасці, гаворыцца, што рашэнне аб адхіленні ад Гульняў абсалютна несправядлівае і найперш ударыла па спартсменах, якія гадамі рыхтаваліся да галоўных стартаў чатырохгоддзя.

«Ва ўсіх дакументах было ўказана, што звярталіся нацыянальныя паралімпійскія камітэты, а не спартсмены. Спартсмены напэўна разумелі, колькі было затрачана сіл. І забараняць выступаць толькі на падставе нацыянальнасці несправядліва. Да нас падыходзілі японцы, італьянцы, усё разумелі, што было няправільнае рашэнне», — дадаў Мікалай Шудзейка.

**Старшыня Нацыянальнага паралімпійскага камітэта Алег ШЭПЕЛЬ** звярнуў увагу на два прынцыповыя моманты. Па-першае, у афіцыйнай заяве сказана, што пад пагрозай знаходзіцца бяспека ўсіх спартсменаў. Але за бяспеку адказваў кітайскі бок, які гарантаваў, што ўсё будзе добра. Па-другое, адзначаецца напружаная абстаноўка ў алімпійскай вёсцы. Але, па словах Алега Шэпеля, ні аднаго прадстаўніка Міжнароднага паралімпійскага камітэта там не было і ніхто не глядзеў, якая там насамрэч абстаноўка.

«Спартсмены — не палітыкі. Навошта іх уцягваць у гэтую палітыку? Людзі з абмежаванымі магчымасцямі прыехалі спаборнічаць, а іх гэтага пазбавілі. Вельмі дрэнна, што гэта закранула менавіта спартсменаў. Калі нешта не падабаецца, вышліце кіраўнікоў. Але калі гэта датычыцца людзей, якія чатыры гады напружваліся, як рабы на галерах, — гэта абсурд. Яны адкрылі скрыню Пандоры. Цяпер кожныя Паралімпійскія гульні арганізатары будуць чакаць з уздрыгваннем, зараз усё можна, на законы можна не глядзець. Мы адназначна супраць палітыкі ў спорце. Раней спорт быў з элементамі палітыкі. Але зараз спорту проста няма, а толькі палітыка», — заявіў Алег Шэпель.

**Першы намеснік міністра спорту і турызму Вячаслаў ДУРНОЎ** падкрэсліў, што палітыка ў спорце павінна быць толькі ў адным выпадку: калі на турніры ўзнімаецца сцяг і гучыць гімн, каб усе разумелі, якая краіна перамагла. Ён расказаў, што Міністэрства спорту і турызму адпрацоўвае пытанне, як напоўніць каляндар беларускіх спартсменаў спаборніцтвамі ў краінах СНД, Расійскай Федэрацыі. «Я ўпэўнены, што мы напоўнім каляндар нашых спартсменаў, каб яны павышалі сваю кваліфікацыю. І калі ўсё вернецца ў звычайнае рэчышча, упэўнены, клас нашых спартсменаў мы яшчэ пакажам. Я думаю, што ад гэтага пацярпіць уся сістэма спорту. Але будзем спадзявацца, што здаровы сэнс пераможа», — сказаў Вячаслаў Дурноў. Ён адзначыў, што захоплены нашымі паралімпійцамі, іх сілай духу, вытрымкай і верай у сябе. Цікавы факт: вяртаючыся дадому, спартсмены спявалі беларускія песні ў аэрапорце.

Цяжка ўявіць, што адбываецца ў душы спартсменаў, якіх пазбавілі галоўных стартаў. **Трохразовая чэмпіёнка Паралімпійскіх гульняў па лыжных гонках і біятлоне Святлана САХАНЕНКА** прызналася, што поўнае ўсведамленне таго, што адбылося, яшчэ не наступіла. Пакуль на душы пачуццё незавершанасці, неразумення і крыўды.

«Беларусь і Расія дыктуюць лідарства ў нашых відах спорту. Рост вынікаў паказвае, што мы вельмі моцныя і можам складаць канкурэнцыю. Як аказалася, не ўсім гэта падабаецца. Нас ударылі па самым хворым, нас пазбавілі таго, чаго мы вартыя. Мяне абурае, што Міжнародны паралімпійскі камітэт не абараніў сваіх спартсменаў. Мы такія ж спартсмены, як і ва Украіне. Камусьці можна быць абароненымі, а камусьці — не. Гэта несправядліва і няроўнасць. Гэтак не павінна быць. Паралімпійская сям'я павінна за сваіх спартсменаў трымацца, там усе аднолькавыя. Ёсць лыжная траса, дзе кожны спаборнічае і паказвае сваё майстэрства. Але нам яшчэ вырашылі паказаць, што ёсць і іншая барацьба. Нам застаецца толькі быць моцнымі і даказваць, што нас не зламаць», — эмацыянальна падзялілася Святлана Саханенка. Яна таксама прызналася, што са слязамі на вачах глядзела спаборніцтвы Паралімпійскіх гульняў.

Аднак шанц даказаць сваё майстэрства ў беларускіх спартсменаў будзе. Яны прымуць удзел у альтэрнатыўных Паралімпійскіх гульнях «Мы разам. Спорт». Турнір адбудзецца з 16 да 21 сакавіка ў расійскім Ханты-Мансійску. Плануецца, што, акрамя каманд Беларусі і Расіі, будуць удзельнічаць і іншыя краіны. Беларусь прадставяць тыя ж спартсмены, якія павінны былі змагацца за ўзнагароды Гульняў у Пекіне і, магчыма, найбліжэйшыя рэзервісты. Гэты турнір стане своеасаблівым кампенсаваннем фізічных і маральных затрат беларускіх паралімпійцаў.

Па словах Святланы Саханенкі, гэта правільнае рашэнне: «Паралімпійскі медаль нічога не заменіць. Але нам аддалі даніну павагі і далі магчымасць выступіць у альтэрнатыўных спаборніцтвах. Дзякуй, што нас падтрымалі, што мы не адны. Самае галоўнае, што нашы блізкія жывыя і здаровыя. А мы будзем далей рыхтавацца і змагацца за сваю краіну і за тое, якія мы людзі».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Навінкі кнігавыдання

# Супраць міжнароднага тэрарызму

**У Выдавецкім доме «Звязда» па заказе і пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выходзіць раман Мікалая ЧАРГІНЦА «Маёр Ветраў».**




Прызнаны майстар дэтэктыўнага жанру ў сваім вострасюжэтным творы ўздымае актуальныя праблемы міжнароднага тэрарызму і наркатрафіку.

Для галоўнага героя рамана маёра Рамана Ветрава гонар, адданасць справе, разуменне абавязку — не проста словы. Ветэран баявых дзеянняў у Афганістане, афіцэр сілавых структур спецпрызначэння, ён уражвае здольнасцю ў любой сітуацыі знаходзіць выйсце.

Вытрымка сумленнага вайскоўца, высокі прафесіяналізм, мужнасць дапамагаюць Ветраву атрымаць перамогу над злачыннымі планамі найбуйнейшага наркагандляра.

Досвед пісьменніка Мікалая Чаргінца заснаваны на яго багатым веданні міжнародных падзей, на вопыце ўдзелу ў баявых дзеяннях савецкіх войскаў у Афганістане. Празаік не аднойчы звяртаецца да падобных тэматычных абсягаў.

Яго творы, якія захоўваюць у сабе элементы дэтэктыўнага жанру, вылучаюцца асаблівым дынамізмам, напоўнены драматургіяй жыцця, паказваюць чалавечыя характары ў самых няпростых абставінах.

Раман «Маёр Ветраў» адрасаваны шырокаму колу чытачоў. І найперш яго варта прачытаць моладзі, падлеткам.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Дыпламатычнае інтэрв'ю

# «НАС ВЕДАЮЦЬ У НАЙБУЙНЕЙШАЙ КРАІНЕ ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ І ДАВЯРАЮЦЬ ЯК НАДЗЕЙНАМУ ПАРТНЁРУ»

**Месяц таму Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Бразілія Сяргей Лукашэвіч уручыў даверчыя граматы Прэзідэнту Бразіліі Жаіру Балсанару. У гэты самы дзень споўнілася 30 гадоў усталяванню дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Бразіліяй. «Звязда» скарысталася двайной нагодай распытаць кіраўніка беларускай місіі ў самай буйной краіне Паўднёвай Амерыцы пра двухбаковыя адносіны і задачы, якія вырашае зараз наша пасольства.**

***— Сяргей Уладзіміравіч, перш за ўсё дазвольце павіншаваць вас з уручэннем даверчых грамат Прэзідэнту Бразіліі! Раскажыце, як праходзіў прыём, якія былі галоўныя тэмы гутаркі з Жаірам Балсанару?***

— Перад тым як распавесці аб сустрэчы, я хацеў бы адзначыць, што Бразілія стабільна ўваходзіць у ТОП-10 гандлёвых партнёраў Беларусі ў свеце. Больш за тое, Беларусь уваходзіць у ТОП-3 пастаўшчыкоў калійных угнаенняў у Бразілію, яна выконвае важную ролю ў забеспячэнні лідзіруючага становішча нашага лацінаамерыканскага партнёра на сусветным рынку харчавання.

Думаю, менавіта з прычыны выкладзеных вышэй аб'ектыўных фактаў гутарка з Прэзідэнтам Бразіліі прайшла ў вельмі цёплай, па-сапраўднаму сяброўскай абстаноўцы. Пры ўдзеле міністра замежных спраў Бразіліі Карласа Франса ўдалося абмеркаваць шэраг вострых пытанняў, якія даводзіцца вырашаць абодвум бакам ва ўмовах санкцыйнага ціску з боку недружалюбных Беларусі краін.

Знакавым паказчыкам шырокага спектра актуальных пытанняў двухбаковага ўзаемадзеяння стала і працягласць сустрэчы: наша гутарка доўжылася ў два разы даўжэй, чым размова Прэзідэнта Бразіліі з пасламі іншых краін, што, безумоўна, сведчыць аб значнай увазе найбуйнейшай краіны Лацінскай Амерыкі і адной з найбуйнейшых эканомік свету.

***— Што вы паспелі ўжо зрабіць за час свайго знаходжання ў гэтай краіне ў якасці пасла?***

— Не буду хаваць, некаторыя нашы заходнія партнёры «не даюць засумаваць», таму, адразу прыехаўшы ў Бразілію ў кастрычніку 2021 года, я з галавой, як кажуць у народзе «без прамаруджвання», акунуўся ў вырашэнне праблем, якія перашкаджаюць планамернаму развіццю нашых адносін з гэтай выдатнай краінай. Ужо за невялікі перыяд удалося правесці сустрэчы з ключавымі фігурамі бразільскай палітыкі, людзьмі, якія непасрэдна прымаюць рашэнні.

Маёй галоўнай мэтай на гэтым этапе было данясенне праўдзівай і неперакручанай інфармацыі аб сітуацыі ў нашай краіне, перспектывах і складанасцях у нашых партнёрскіх адносінах, раскрыць праўду аб прыродзе санкцый, накіраваных супраць Беларусі. Нашы бразільскія калегі разумеюць, што санкцыі фактычна з'яўляюцца нічым іншым, як інструментам несумленнай канкурэнцыі, прычым накіраванасць санкцый шматвектарная.

Падрабязней растлумачу на прыкладзе. Асобныя санкцыі супраць Беларусі істотна абцяжарваюць, а месцамі і робяць немагчымай аплату бразільскімі фермерамі калійных угнаенняў і дастаўку ўгнаенняў праз марскі порт горада Клайпеды ў Бразілію. Ад гэтага пакутуюць многія. На мой погляд, больш за ўсіх пакутуюць бразільскія фермеры, якія ва ўмовах гарачага клімату і беднасці глеб (асабліва ў некаторых рэгіёнах) не могуць вырошчваць не тое што вялікія ўраджаі сваёй прадукцыі (кава, соя, кукуруза, гародніна і садавіна), але і хоць нешта, што не згарыць пад пякучым сонцам у перасушанай глебе.

Хто ж будзе галоўным выгадаатрымальнікам у гэтай сітуацыі? Па-першае, галоўныя канкурэнты Бразіліі на сусветным рынку харчавання — фермеры ЗША і ЕС, а па-другое, паўночнаамерыканскія вытворцы калійных угнаенняў, якія ўжо сёння імкнуцца хутчэй заняць законнае месца Беларусі на сусветным рынку калійных угнаенняў.

Аднак хачу звярнуць вашу ўвагу, што ў апошнія тыдні тэмай, якая найбольш актыўна абмяркоўваецца у бразільскім грамадстве, стала спецаперацыя Расіі на Украіне. У гэтым кантэксце ўзрасла колькасць ілжывай інфармацыі пра нібыта негатыўную ролю і ўдзел Беларусі, якая стала актыўна распаўсюджвацца СМІ Бразіліі з падачы заходніх крыніц. Мы аператыўна ўключыліся ў прасоўванне нашага пункту гледжання ў медыяпрасторы краіны знаходжання.



Намі актыўна выкладаецца пазіцыя Беларусі як адзінай мірнай пляцоўкі для перагавораў. Мной у інтэрв'ю найбуйнейшым бразільскім выданням CNN Brasil, Globo, Correio Braziliense, Broadcast, Valor Economico, Brashlia in Foco, Jovem Pan і многім іншым да гледачоў і чытачоў даводзіцца сумленная і адкрытая інфармацыя аб ролі Беларусі ў вырашэнні гэтага канфлікту пачынаючы з 2014 года.

***— Санкцыі з боку трэціх краін, напэўна, не адзіная складанасць для работы на рынку Бразіліі?***

— Санкцыйная праблематыка востра стаіць у цяперашні момант, але і без яе існуе шэраг цяжкасцяў у тым, каб трапіць і трымаць пазіцыі на рынку Бразіліі. Усё ж трэба выразна разумець, што значная геаграфічная аддаленасць мае на ўвазе наяўнасць шэрагу адрозненняў не толькі ў ментальным і камунікацыйным плане, але і ў дзелавой практыцы, што цягне неабходнасць унясення карэкціровак у парадак вядзення бізнесу.

Пасольства на сістэмнай аснове вывучае дзелавую практыку Бразіліі, аналізуе і назапашвае яе, пасля чаго накіроўвае неабходную інфармацыю беларускім суб'ектам гаспадарання, іх аб'яднанням, гандлёвым палатам і іншым зацікаўленым бакам. Напрыклад, часта камерцыйныя прапановы беларускіх экспарцёраў перагружаны інфармацыяй, маюць недапушчальна вялікі аб'ём, ён можа дасягаць 50—60 старонак тэксту, а манера выкладання гэтай інфармацыі незразумелая для мясцовых жыхароў і дзелавых колаў. З гэтай прычыны пасольства дае беларускім экспарцёрам, якія жадаюць выйсці на бразільскі рынак, канкрэтныя рэкамендацыі па адаптацыі сваіх тавараў, друкаваных матэрыялаў, маркетынгавых стратэгій, каб у максімальна кароткія тэрміны і з мінімальнымі ўкладаннямі заняць сваю нішу.

Такая арыентаванасць беларускай дыпламатычнай місіі на дасягненне вынікаў у гандлёва-эканамічнай сферы дае свой плён. Так, па выніках 2021 года дасягнуты рост па многіх напрамках беларускага экспарту ў Бразіліі і выкананы ўсе даведзеныя паказчыкі.

Шэраг беларускіх тавараў займае моцныя пазіцыі на бразільскім рынку: гэта інсектыцыды і гербіцыды, група тавараў нафтахімічнага комплексу, вырабы з металу. Некаторыя з іх прадэманстравалі ў 2021 годзе значны рост, напрыклад, пастаўкі льняных тканін выраслі ў пяць разоў, соладу — у тры разы, а вымяральных прыбораў — у два разы.

У цэлым, пералік таварных пазіцый павялічыўся за год амаль на 20 працэнтаў, што з'яўляецца добрым задзелам для далейшага нарошчвання гандлёвых адносін паміж дзвюма краінамі. Пасольствам таксама вядзецца работа па арганізацыі візіту беларускіх экспарцёраў на найбуйнейшую ў рэгіёне міжнародную выставу AGRISHOW, якая пройдзе ў Бразіліі ў красавіку 2022 года.

***— 30-гадовы шлях — гэта шмат ці мала для дыпламатычных адносін?***

— Па сусветных мерках нашы дыпламатычныя адносіны з Бразіліяй дастаткова маладыя. Але для такога малога перыяду супрацоўніцтва нам удалося зрабіць шмат, галоўны вынік гэтых намаганняў — Беларусь ведаюць у найбуйнейшай краіне Лацінскай Амерыкі, ведаюць са станоўчага пункту гледжання і нам давяраюць як надзейным партнёрам.

Больш за тое, я хацеў бы звярнуць увагу на той факт, што са згаданых вышэй топ-10 партнёраў Беларусі ў свеце Бразілія з'яўляецца самай аддаленай. Аднак, нягледзячы на значную геаграфічную аддаленасць Беларусі і Бразіліі, удалося выбудаваць моцны каркас двухбаковых адносін, заснаваны на гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, партнёрстве ў галіне культуры, спорту і адукацыі. Мяркуйце самі: бразільскія студэнты навучаюцца ў Беларусі, і больш за 10 тысяч кіламетраў паміж краінамі не з'яўляецца для іх перашкодай.

У цэлым, мне хацелася б акцэнтаваць увагу на значнасці як Беларусі для Бразіліі, так і Бразіліі для Беларусі. Няхай геаграфічная аддаленасць дзвюх краін і надалей не будзе перашкодай для развіцця партнёрскіх адносін. Пасольства ў сваю чаргу працягне заставацца апорай Беларусі ў Бразіліі доўгія гады.

Ужо зараз нам варта думаць аб хутчэйшым пашырэнні сваёй дыпламатычнай прысутнасці ў гэтай перспектыўнай краіне далёкай дугі з ухілам у эканоміку. Бразілія — пятая па велічыні краіна свету, дзе пражывае больш за 214 мільёнаў чалавек. На мой погляд, гэта патрабуе павелічэння нашай дыпламатычнай прысутнасці ў такіх цэнтрах дзелавой актыўнасці, як Сан-Паўла — фінансавым і дзелавым цэнтры Бразіліі з насельніцтвам больш за 12 мільёнаў чалавек. Відавочна, што нельга сабраць ураджай, не пасеяўшы. Наяўнасць беларускага пасольства толькі ў адміністрацыйным і палітычным цэнтры — сталіцы Бразілія, з прычыны вялізнага памеру гэтай краіны, не можа даць той эфект, які можна дасягнуць, размясціўшы нашу «кропку ўваходу» ў вышэйзгаданай эканамічнай сталіцы Бразіліі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Сітуацыя

## Мінпрыроды звярнулася ў Савет Еўропы з-за сітуацыі з будаўніцтвам агароджы ў Белавежскай пушчы

**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Андрэй ХУДЫК накіраваў зварот у адрас генеральнага дырэктара Савета Еўропы па пытаннях дэмакратыі Сняжаны Самарджыч-Маркавіч, паведамілі ў прэс-службе Мінпрыроды.**

Міністэрства прадаўжае работу па прыцягненні ўвагі міжнароднай супольнасці да праблемы ўзвядзення штучных загарод з бетону, жалеза і калючага дроту «карцэрціна» ў трансгранічных прыродных аб'ектах Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча» і «Заходняе Палессе» на граніцы з Польшчай.

«У пісьме міністра выказана глыбокая занепакоенасць сітуацыяй, што складваецца на граніцы Беларусі з Польшчай, і змешчаны заклік ініцыяваць перад Саветам Еўропы разгляд пытанняў правядзення аператыўнага маніторынгу гэтай сітуацыі, прыняцце мер, накіраваных на недапушчэнне траўміравання і гібелі жывёл, а таксама на забеспячэнне свабоднага перамяшчэння дзікіх жывёл у мэтах абмену генафондам», — расказалі ў міністэрстве.

Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЮТСЯ:

АГРОНОМ, ЗООТЕХНИК

**Требования:** высшее профильное образование, опыт работы в сельском хозяйстве, готовность и желание обучаться. Дисциплинированность, инициативность, исполнительность, умение работать с большим объемом информации, умение организовать и координировать работу, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

**Предлагаем:**

✔ Работу в современной компании с иностранным капиталом.
✔ Трудоустройство согласно ТК РБ.
✔ Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
✔ Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
✔ Возмещение расходов по найму жилого помещения.
✔ Система мотивации получения результатов труда.
✔ Корпоративная безлимитная мобильная связь.
✔ Социальный пакет согласно коллективному договору.

**Контакты:**

Резюме отправлять на e-mail: **mp@rodanagro.com**
Тел.: **+375 (33) 399-38-60**
**+375 (29) 318-22-65**
(отдел кадров)
УНП 592000776

Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ

ТРАКТОРИСТ-МАШИНИСТ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА

**Требования:** опыт работы на энергонасыщенных тракторах, дисциплинированность, инициативность, исполнительность, ответственность, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

**Предлагаем:**

✔ Работу в современной компании с иностранным капиталом.
✔ Трудоустройство согласно ТК РБ.
✔ Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
✔ Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
✔ Возмещение расходов по найму жилого помещения.
✔ Система мотивации получения результатов труда.
✔ Корпоративная безлимитная мобильная связь.
✔ Социальный пакет согласно коллективному договору.

**Контакты:**

Резюме отправлять на e-mail: **wp@rodanagro.com**
Тел.: **+375 (29) 935-70-20**
**+375 (29) 318-22-65**
(отдел кадров)
УНП 592000776

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
11 сакавіка 2022 г. № 9 (645)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ІНІЦЫЯТЫВА







Фота Маргарыты УШКЕВІЧ.

# ЦІ БУДЗЕ КУРОРТНЫ ПАСЁЛАК З ПЛЯЖНАЙ ЗОНАЙ?

## Добраўпарадкаванне возера Малочнае ў Гродзенскім раёне пачнецца ўжо сёлета

**ПАКУЛЬ толькі сіламі Парэцкага сельскага Савета і раённай ЖКГ. Але рыхтуецца маштабны праект па стварэнні тут цэлага комплексу для летняга адпачынку. Мяркуецца, што будзе наведзены парадак на самім пляжы, з'явяцца гандлёвыя павільёны, душавыя, месцы для барбекю, альтанкі, пешаходныя і веласіпедныя дарожкі і многае іншае.**

Аграгарадок Парэчча — даволі адметны населены пункт. З яго пачалася гісторыя Беларускай чыгункі — менавіта адсюль роўна 160 гадоў таму адправіўся першы поезд на Гродна. А яшчэ пасёлак вядомы прыгожым возерам Малочнае. Менавіта дадзеная акалічнасць у свой час стала адной з ключавых пры ўзвядзенні тут санаторыя «Парэчча» Белагразздраўніцай.

У летнія дні курортнікі імкнуцца да вады — возера ўсяго за колькі дзясяткаў метраў ад карпусоў. Таксама сюды прыязджаюць сотні гараджан з абласнога цэнтра. Такім чынам, у спякоту, што называецца, яблыку няма дзе ўпасці. А вось пляжная зона хоць і ёсць, але абсалютна не добраўпарадкаваная. Акрамя двюх кабінак для раздзявання і некалькіх сметніц, тут нічога няма. Мясцовыя ўлады ў свой час збіраліся заняцца гэтай тэрыторыяй, але не знайшлі дастаткова сродкаў. Таму купанне апошнія гады наогул забароненае, аб чым сведчылі шыльды на дрэвах. У такім «завіслым» стане аказаўся мінулы летні сезон на Малочным.

Увогуле, праблема добраўпарадкавання цягнецца тут даволі даўно. Часткова — з-за невызначанага ўласніка тэрыторыі. Лічылася, што санаторый, які знаходзіцца ў гэтай зоне, павінен узяць на сябе нагрузку па навядзенні парадку на пляжы. Але там прапанавалі выкарыстаць сродкі раённага бюджэту, у які, дарэчы, паступае курортны збор і ад санаторыя. У рэшце рэшт так і адбылося.

Сесія райсавета некалькі гадоў таму прыняла рашэнне выдаткаваць 50 тысяч рублёў на праект добраўпарадкавання прыбярэжнай тэрыторыі і пляжнай зоны. Паступова работа зрушылася з месца.

Як паведаміў **старшыня Парэцкага сельвыканкама Андрэй МАЦКЕВІЧ**, праект падрыхтаваны і знаходзіцца на стадыі ўзгаднення. Пакуль вядома, што добраўпарадкаванне будзе зроблена ў лясной зоне, прыбярэжнай тэрыторыі і непасрэдна ў акваторыі возера. Тут з'явяцца пешаходныя і веласіпедныя дарожкі, ліхтары, зоны адпачынку, альтанкі, іншыя архітэктурныя формы. Непасрэдна на пляжы — навесы, раздзявальні, душавыя. Не будзе недахопу і ў кантэйнерах для смецця. Таксама праект прадугледжвае выратавальную станцыю і пракат лодак.

Па словах старшыні сельвыканкама, тэрыторыя ляснога масіву, а гэта 2 гектары плошчы, належыць сельскаму Савету. Сёння яна перададзена ў часовае карыстанне раённай ЖКГ для таго, каб камунальнікі правялі працэдуру закупкі. На дадзены момант ужо ёсць падрадчык, які займаецца зацвярджэннем праекта па добраўпарадкаванні тэрыторыі каля возера. Калі праект зацвердзяць, пачнецца распрацоўка праграмы фінансавання, каб гэта ажыццявіць.

— Але чакаць год-два ўсё роўна нельга, — лічыць старшыня сельвыканкама. — Людзі хочуць адпачываць цяпер. І мы разумеем, што, маючы такую жамчужыну, як Малочнае возера, было б не вельмі правільна адмаўляць жыхарам у адпачынку каля вады. Таму мы сіламі сельскага Савета, ЖКГ, з дапамогай санаторыя «Парэчча», пры падтрымцы Гродзенскага райвыканкама будзем імкнуцца ўжо сёлета арганізаваць месца адпачынку.

стар. 18

АКТУАЛЬНА

## «Міжнародны спорт становіцца інструментам маніпуляцый і шантажу»

**Прэзідыум Савета Рэспублікі звярнуўся з заявай у сувязі са зневажаннем Захадам гуманістычных нормаў і прынцыпаў.**

У дакуменце звяртаецца ўвага на тое, што калектыўны Захад працягвае незаконную, беспадстаўную палітыку санкцыйнага ціску на суверэнную дзяржаву — Рэспубліку Беларусь, адкрыта парушаючы гуманістычныя нормы дабра, спагады і справядлівасці.

— У сваіх учынках палітыкі Захаду канчаткова страцілі здаровы сэнс і пачуццё адказнасці, перайшлі ўсе межы чалавечнасці, — падкрэсліваецца ў заяве. — Пад удар трапілі беларускія спартсмены. Іх пазбаўляюць спаборніцтваў, магчымасці выступаць пад дзяржаўным сцягам.

Аўтары акцэнтуюць: па-за межамі разумення — атака на паралімпійцаў, людзей мужных і стойкіх, якія з'яўляюцца яркім прыкладам пераадолення цяжкасцяў і перамогі над сабой.

— Такія дзеянні Міжнароднага Паралімпійскага камітэта знаходзяцца па-за рамкамі гуманізму і падлягаюць асуджэнню, — гаворыцца ў дакуменце.

Прэзідыум Савета Рэспублікі нагадвае, што з самых старажытных часоў спорт аб'ядноўваў людзей, выхоўваў прыстойнасць, сумленнасць, развіваў дух салідарнасці. Толькі ў сумленнай барацьбе нараджаецца надзея на перамогу.

— На жаль, міжнародны спорт становіцца інструментам маніпуляцый і шантажу нядобрасумленных заходніх палітыкаў. Такая ж сітуацыя — у навуцы, культуры, адукацыі і шэрагу іншых гуманітарных сфер, — канстатуецца ў дакуменце.

Парламентарыі ўпэўненыя: дзеля асабістых палітычных дывідэндаў і матэрыяльных выгод заходнія палітыкі гатовыя знішчыць духоўна-маральныя каштоўнасці — асновы чалавечай цывілізацыі. Паводле ацэнкі членаў Прэзідыума Савета Рэспублікі, гэта недапушчальна.

— Заклікаем заходніх палітыкаў і парламентарыяў спыніцца і адумацца, спыніць рэалізоўваць безразважную і антыгуманную палітыку ў дачыненні да Беларусі і беларускага народа. Узаемаадносіны павінны будавацца выключна на аснове раўнапраўнага дыялогу, даверу і ўзаемапавагі, — падкрэсліваецца ў звароце.

<u>Таццяна РУНЕЦ:</u>

## «Нізкі і антыгуманны ўчынак»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:**

— Рашэнне Міжнароднага Паралімпійскага камітэта аб недапушчэнні беларускіх і расійскіх спартсменаў-паралімпійцаў да ўдзелу ў алімпійскіх спаборніцтвах інакш як антыгуманным і нізкім учынкам не назавеш, — перакананая сенатар.

Яна падкрэслівае: атлеты, якія сваім прыкладам дэманструюць мужнасць штодзённага пераадолення фізічных нягод, матывуюць вялікую колькасць людзей, сёння сутыкнуліся з несправядлівасцю заходніх функцыянераў ад спорту.

— Іх пазбавілі магчымасці выступаць за сваю краіну, спаборнічаць пад яе дзяржаўным сцягам і ў выпадку перамогі — пачуць дзяржаўны гімн на медальным п'едэстале. Прычым такі крок калектыўны Захад распачаў у абход нормаў і асноў чалавечай маралі, што знаходзіцца па-за межамі разумення адэкватнага чалавека, — упэўненая парламентарый.

Таццяна Рунец канстатуе, што сёння мы становімся сведкамі таго, як цалкам палітызаванае рашэнне чыноўнікаў ад спорту становіцца прамым зневажаннем запаветаў П'ера дэ Кубертэна — ініцыятара сучасных Алімпійскіх гульняў: гаворка пра тое, што спорт знаходзіцца па-за палітыкай.

— Ва ўсе часы спорт выступаў аб'ядноўчым фактарам, здольным прымірыць на спартыўнай арэне народы, дзяржавы і цэлыя кантыненты, — нагадвае сурazмоўніца і з жалем працягвае. — У цяперашняй сітуацыі ў наяўнасці нежаданне заходняй цывілізацыі пачуць голас розуму. Засталося толькі імкненне як мага больш балюча ўкусіць праціўніка. Гэта нізка і подла!

Сенатар сцвярджае: такія дзеянні сведчаць аб агрэсіўнай пазіцыі заходняга свету ў адносінах да Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і падрываюць асновы ўсяго алімпійскага руху.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## НА ВАРЦЕ ЗАКОННАСЦІ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ у рамках разгляду зваротаў грамадзян аказаў дапамогу ў вырашэнні праблемных пытанняў.**

Як расказалі ў профільнай камісіі, пры садзейнічанні парламентарыя адна з заяўніц была прынята Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь па пытанні спынення вытворчасці па крымінальнай справе адносна гібелі яе сына.

Па даручэнні члена Прэзідыума Савета Рэспублікі пракуратура сталіцы вывучыла матэрыялы праверак па зваротах у дачыненні да шэрагу службовых асоб і прадстаўнікоў таварыстваў з абмежаванай адказнасцю, а таксама індывідуальных прадпрымальнікаў у прыватнасці, што аказвалі паслугі па ачыстцы сістэм вентыляцыі ў кватэрах жыхароў Мінска па завышанай цане і пры неналежнай якасці, і адмяніла пастанову аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы.

Таксама пракуратура горада Магілёва, разгледзеўшы зварот, распачала крымінальную справу ў дачыненні да службовых асоб таварыства з абмежаванай адказнасцю, якія выкарыстоўвалі ашуканскую схему па ачыстцы сістэм вентыляцыі для авалодання грашовымі сродкамі жыхароў абласнога цэнтра.

***

## КЛЮЧАВАЯ ЎМОВА СТАБІЛЬНАСЦІ

**Па ініцыятыве старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяны РУНЕЦ адбылася рабочая сустрэча па пытанні ўдасканалення заканадаўства для забеспячэння своечасовай выплаты заработнай платы.**

У нарадзе ўзяла ўдзел **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.**

— Своечасовая выплата зарплаты — адна з ключавых умоў сацыяльнай і эканамічнай стабільнасці. Як неаднаразова адзначаў кіраўнік дзяржавы, ведамасная падпарадкаванасць арганізацыі не з'яўляецца вызначальным фактарам. Мясцовыя органы ўлады нясуць адказнасць за ўсе прадпрыемствы, размешчаныя на давераной тэрыторыі, — падкрэсліла парламентарый.

Удзельнікі абмеркавалі прапановы па карэкціроўцы заканадаўства ў сферы аплаты працы.

— Вядома, лёгкіх метадаў вырашэння гэтага адчувальнага пытання проста няма. Але, на мой погляд, выключна адміністрацыйным уздзеяннем абмяжоўвацца не варта. У першую чаргу трэба скарачаць ланцужкі ўзаемных неплацяжоў, працаваць са сваімі дэбіторамі, каб на разліковы рахунак арганізацый паступалі сродкі для выплаты заробку, — падкрэсліла Таццяна Рунец.

***

## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ узяў удзел у пасяджэнні адміністрацыі Заводскага раёна сталіцы.**

На парадку дня знаходзіліся пытанні прафілактыкі наркаманіі і процідзеяння незаконнаму абароту наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, падвядзенне вынікаў работы па капітальным рамонце жыллёвага фонду раёна ў 2021 годзе і задачы на 2022 год.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, для далейшага ўдасканалення сістэмы мер па прафілактыцы наркаманіі, выяўленні прычын і ўмоў, якія спрыяюць наркаманіі, зацверджаны план мерапрыемстваў, накіраваных на супрацьдзеянне незаконнаму абароту наркотыкаў, прафілактыку іх спажывання, у тым ліку сярод дзяцей і моладзі, сацыяльную рэабілітацыю асоб з наркаманіяй, па Заводскім раёне Мінска на 2022 год.

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «Памяць аб Вялікай Айчыннай вайне — святое для кожнага беларуса і расіяніна»

## Ход падрыхтоўкі адмысловага расійска-беларускага праекта «Цягнік памяці» абмеркавалі ў Савеце Рэспублікі

**Пад кіраўніцтвам спікера верхняй палаты парламента прайшла нарада, на якой абмеркавалі падрыхтоўку сумеснага расійска-беларускага праекта «Цягнік памяці».**

Адкрываючы мерапрыемства, Наталля Качанава нагадала, што праект ініцыіраваны Саветам Федэрацыі і Саветам Рэспублікі, удзельнікамі якога стане моладзь Беларусі і Расіі.

— У Год гістарычнай памяці для нас гэта вельмі важна: памяць аб Вялікай Айчыннай вайне — святое для кожнага беларуса і кожнага расіяніна, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента.

Яна адзначыла, што сумесны праект з'явіўся на падставе аналагічнага, які летась быў прэзентаваны напярэдадні 9 Мая.

— Вельмі знакава, што ў ім будзе браць удзел моладзь — старшакласнікі, — звярнула ўвагу Наталля Качанава і выказала меркаванне, што праект стане штогадовым. — Кожны раз гэта будуць новыя выпускнікі і штогадовае папаўненне патрыётаў сваёй краіны — Беларусі і Расіі.

Старшыня Савета Рэспублікі перакананая: дружба моладзі абедзвюх краін гарантуе, што ў далейшым дзяржавы будуць разам.

— І захаванне агульнай для нас памяці аб Вялікай Айчыннай вайне будзе перадавацца



Фота БелТА.

з пакалення ў пакаленне, — упэўнена яна.

Паводле яе думкі, праект павінен стаць маштабным, запамінальным і вельмі цікавым для моладзі.

Арганізатары мяркуюць, што ў праекце возьмуць удзел па сто выпускнікоў з кожнага боку, якія праедуць па розных гарадах Беларусі і Расіі. Стартуе праект у Брэсце 22 чэрвеня — у дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны, а фінішуе ў беларускай сталіцы 3 ліпеня — у дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Таксама запланаваныя прыпынкі ў розных гарадах Беларусі і Расіі.

— З году ў год мы будзем мяняць маршрут, наколькі гэта магчыма, — адзначыла Наталля Качанава. — Што датычыцца Беларусі, то, мне здаецца, у нас любы горад, любы рэгіён — гэта гісторыя. Гэта памятныя знакі, брацкія магілы, пахаванні. Таму можна пашыраць гэтую геаграфію.

Дарэчы, мерапрыемствы «Цягніка памяці» павінны інтэгравацца ў чарговы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, правядзенне якога запланавана сёлета з 24 да 26 чэрвеня ў Гродне. Цягнік зробіць прыпынак у абласным цэнтры падчас правядзення форуму.

Як перакананы **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ,** сёння бакам вельмі важна праводзіць супольную палітыку па захаванні гістарычнай памяці і працаваць з моладдзю па ўвекавечанні подзвігу, які быў здзейснены савецкім народам у гады Вялікай Айчыннай вайны.

— Мерапрыемствы «Цягніка памяці» запланаваныя на працягу 15 дзён і аб'ядноўваюць маладых людзей, якія з'яўляюцца пераможцамі розных міжнародных конкурсаў, бяруць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці сваіх устаноў адукацыі, фактычна гэта найлепшыя прадстаўнікі навучэнскай моладзі, — расказаў міністр адукацыі.

Паводле яго слоў, маршрут будзе пабудаваны такім чынам, каб выпускнікі змаглі наведаць цэлы шэраг гарадоў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, азнаёміцца з мясцінамі баявой славы, наведаць адпаведныя музеі, сустрэцца са сваімі аднагодкамі.

— Мяркуецца сустрэча ўдзельнікаў «Цягніка памяці» са Старшынёй Савета Рэспублікі сходу Наталляй Качанавай, каб яшчэ раз паглядзець на тыя гістарычныя падзеі праз прызму сучасных рэалій, — рэзюмаваў Андрэй Іванец.

Адзначым, што ўдзел у нарадзе бралі намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Леанід Заяц, члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Віктар Лісковіч і Сяргей Рачкоў, кіраўнік прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Мар'яна Шчоткіна, кіраўніцтва міністэрстваў адукацыі, аховы здароўя, транспарту і камунікацый, культуры, інфармацыі, фінансаў, унутраных спраў.

Падчас нарады таксама абмяркоўваліся пытанні лагістыкі, харчавання, бяспекі і культурнай праграмы для ўдзельнікаў праекта.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

ПАДЗЕЯ

# ДЗЕЛЯ ЗДАРОЎЯ

## Абноўлены кабінет камп'ютарнай тамаграфіі адкрылі ў Лунінцы

**У Лунінецкай цэнтральнай раённай бальніцы пачаў працаваць новы суперсучасны камп'ютарны тамограф. Раней тут быў тамограф 2004 года выпуску, які ў свой час перадалі райбальніцы з адной сталічнай медустановы ў 2010 годзе. З апаратам абыходзіліся надзвычай беражліва, і ён адпрацаваў даволі доўга, але рэсурс свой вычарпаў цалкам, і летась яго спісалі.**

Гэты час, пакуль КТ у Лунінцы не было, пацыенты вымушаныя былі ездзіць на абследаванне ў Пінск альбо Столін. Тым часам вялася мадэрнізацыя памяшкання, рыхтаваўся кабінет, і ў пачатку года доўгачаканае абсталяванне паступіла ў раён.

Паводле слоў **галоўнага ўрача Лунінецкай цэнтральнай раённай бальніцы Святланы ХЛЕБУС,** ранейшы тамограф быў аднаспіральны, і на ім медыкі ўмудраліся спраўляцца з цэлым шэрагам неабходных даследаванняў:

— А новы апарат «Адані», 128-спіральны, для нас — ледзь не на ўзроўні космасу. Перавагі яго відавочныя, не толькі скарачаецца час даследавання, на 70 % памяншаецца прамянёвая нагрузка на арганізм пацыента. Апарат забяспечвае дакладную дыягностыку. Выяўляць захворванні розных органаў і сістэм цяпер можна на самых ранніх стадыях.

Як сказаў **загадчык аддзялення прамянёвай дыягностыкі ЦРБ Віктар НЕМЕЦ,** апарат з часам можна аснашчаць яшчэ большай колькасцю абсталявання для павелічэння спектра даследаванняў. Перавагай доктар назваў якасць адлюстравання, якая мадэлюецца камп'ютарнай праграмай і дае дакладную выяву органа ці сістэмы пры анкалогіі, захворваннях сардэчна-сасудзістай сістэмы, печані і, вядома, паталогіі лёгкіх пры каранавіруснай інфекцыі.

На новы апарат для Лунінца з рэспубліканскага бюджэту выдаткавана больш за 1,2 мільёна рублёў, яшчэ 200 тысяч рублёў з раённага бюджэту пайшло на мадэрнізацыю кабінета КТ.

Як адзначыў на ўрачыстым адкрыцці **намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК,** новы камп'ютарны тамограф разлічаны на абслугоўванне не толькі жыхароў Лунінеччыны, але і суседніх раёнаў. Найноўшае абсталяванне такім чынам устанаўліваецца па ўсёй краіне, каб зрабіць яго максімальна даступным нават для жыхароў самых аддаленых населеных пунктаў. Цяпер закупка дарагога медыцынскага абсталявання праводзіцца цэнтралізавана і на парытэтных умовах з рэгіёнамі. Дзякуючы аб'ёмам гэта дазваляе паменшыць кошт тэхнікі, а дзякуючы зацікаўленасці мясцовых органаў улады аператыўна праводзяцца ўсе падрыхтоўчыя работы. Лунінец у гэтым сэнсе можна назваць прыкладам. Напрыклад, новае інфекцыйнае аддзяленне летась было ўведзена ў эксплуатацыю ў рэкордна кароткі тэрмін.

**Старшыня абласнога савета дэпутатаў, сенатар Юрый НАРКЕВІЧ** падкрэсліў, што ў вобласці аддаецца шмат увагі развіццю аховы здароўя:



Фота з сайта газеты «Зара».

— У нас будуюцца і адкрываюцца новыя бальніцы і паліклінікі, купляем новае абсталяванне і аўтамабілі хуткай дапамогі, у вобласці выбудавана дакладная сістэма развіцця і падтрымкі галіны.

Сёлета плануецца замена камп'ютарнага тамографа ў Драгічыне, у хуткім часе вобласць атрымае сем рэанімабіляў, адзін з якіх накіруецца ў Лунінецкую ЦРБ. Атрымае бальніца і новыя апараты ШВЛ. А яшчэ ў Лунінцы неўзабаве паявіцца свая кіслародная станцыя. Цяпер вядуцца праектныя работы, якія намечана завяршыць у другой палове года і пачаць рэканструкцыю аб'екта. Налета станцыя будзе ўведзена ў эксплуатацыю, такім чынам раённая медыцына перастане залежаць ад пастаўшчыкоў медыцынскага кіслароду. Працягнуцца рамонт і рэканструкцыя аб'ектаў аховы здароўя ў іншых раёнах.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Сядзі і глядзі

# ЗАКАХАНЫЯ ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ

**Прыхільнікам лірычных кінааповедаў варта звярнуць увагу на кінастужкі «Закаханы па ўласным жаданні» і «Не магу сказаць «бывай» у суботнім эфіры на «Беларусь 3».**

Абедзве кінаработы сёлета адзначаюць 40-годдзе з моманту выхаду на экраны. Лірычная камедыя «Закаханы па ўласным жаданні» Сяргея Мікаэляна



знаёміць гледачоў з гісторыяй былога спартсмена Ігара і сур'ёзнай бібліятэкаркі Веры. Дваіх людзей выпадкова зводзіць лёс, але ніхто з іх нават не ўяўляе, чым скончыцца гэтая гісторыя, дзе ў кожнага свае мэты... Ролі галоўных герояў на экране ўвасабляюць Алег Янкоўскі і Яўгенія Глушэнка, назіраць за якімі — асаблівае задавальненне. Гэта адзначылі як чытачы часопіса «Савецкі экран» (прысудзіўшы першае месца Янкоўскаму ў намінацыі «Найлепшы акцёр года»), так і на сусветных кінафестывалях, дзе актрысу Яўгенію Глушэнку адзначылі як найлепшую выканаўцу жаночай ролі.

Не менш цікавай і кранальнай гісторыяй з'яўляецца і меладрама «Не магу сказаць «бывай» Барыса Дурава. Па сюжэце сціп-



лая Ліда знаёміцца з Сяргеем на дыскатэцы. Для яе тое спатканне — каханне з першага позірку, а вось для хлопца — проста выпадковая сустрэча. Але пасля жыццё ўсё раскладзе па палічках, і іх шляхі зноў сыдуцца... Можа, таму, што сапраўдныя пачуцці заслугоўваюць другі шанц і здольныя на сапраўдныя цуды?

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 141

Сваю новую задачу даслаў нам майстар спорту Мікалай Бельчыкаў з Барысава (гл. дыяграму).

**Белыя:** Кра4, Фf8, Кс8, Kd3, пп. b5, e6 (6).

**Чорныя:** Kpb7 (1).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru



* * *

У Рагачове прайшло першынство Беларусі сярод юнакоў і дзяўчат да 18 гадоў. Прызавую тройку юнацкага турніру (32 удзельнікі, у тым ліку 3 майстры ФІДЭ) склалі Аляксей Грыгаровіч, Барыс Вайнячук і майстар ФІДЭ Іван Рунец. У дзявочым турніры (25 удзельніц, у тым ліку 1 майстар ФІДЭ) перамагла майстар ФІДЭ Ксенія Зелянцова, на другім месцы — Марына Хоміч, на трэцім — Юлія Лявонава.

Яраслаў Навумовіч — Аляксей Грыгаровіч. 1. e4 c6 2. d4 d5 3. e5 Cf5 4. h4 h5 5. c4 e6 6. Kc3 Cb4 7. Фb3 a5 8. a3 dc 9. C:c4 C:c3+ 10. Ф:c3 Ke7 11. Cg5 Kd7 12. Ke2 Kb6 13. Kf4 Фd7 14. C:e7 Ф:e7 15. Cd3 C:d3 16. K:d3 0-0 17. Kc5 Kd5 18. Фg3 f6 19. 0-0 fe 20. Ф:e5 Ф:h4 21. K:e6 Лf6 22. Лae1 Лe8 23. Лe4 Ф:e4 24. Ф:e4 Лf:e6 25. Фh4 Лe4 26. Ф:h5 Kf4 27. Фg5 Л:d4 28. Лb1 a4 29. b3 Ke2+ 30. Kph2 Лe5 31. Ф:e5 Лh4x

Вікторыя Дорашава — Ксенія Зелянцова. 1. c4 d6 2. d4 e5 3. e3 Kd7 4. Kc3 g6 5. Cd3 Cg7 6. Kge2 Ke7 7. b4 ed 8. ed Kc6 9. Kd5 K:d4 10. K:d4 C:d4 11. Фe2+ Kpf8 12. Cb2 Cg7 13. C:g7+ Kp:g7 14. 0-0 c6 15. Фb2+ f6 16. Kf4 Ke5 17. Ce2 Cf5 18. Лad1 Фd7 19. Лd2 Лhe8 20. Лfd1 Kf7 21. h4 Лe5 22. g3 Лae8 23. Kg2 Фe7 24. Ke3 Л:e3 25. fe Ф:e3+ 26. Kpg2 Ce4+ 27. Kpf1 Ф:g3 28. Cd3 Фh3+ 29. Kpg1 Фh1+ 30. Kpf2 Фh2+ 31. Kpf1 C:d3+, 0:1.

* * *

У Мінску адбыўся турнір па хуткіх шахматах, дзе сярод 50 удзельнікаў з Беларусі, Расіі і Узбекістана было 3 гросмайстры, 1 міжнародны майстар, 4 майстры ФІДЭ і 1 жаночы майстар ФІДЭ. Перамог міжнародны майстар Дзяніс Лазавік (Беларусь), 2—4 месцы падзялілі гросмайстры Мікіта Афанасьеў (Расія), Аляксей Аляксандраў (Беларусь) і майстар ФІДЭ Арцём Стрыбук (Беларусь).

* * *

Камісія па шахматнай кампазіцыі Федэрацыі шахмат Свярдлоўскай вобласці і часопіс «Уральскі праблеміст» арганізоўваюць конкурсы, прысвечаныя ўральскім кампазітарам.

Міжнародны мемарыяльны конкурс па задачах-двуххадоўках «Аляксандр Казлоў — 125».

Суддзя — Вячаслаў Пільчанка. Задачы на дыяграмах з поўным рашэннем і каментарыямі дасылаць да 1 верасня 2022 года на электронны адрас: pilchenkovk@yandex.ru

Міжнародны мемарыяльны конкурс па эцюдах «Павел Бабіч — 115 і Браніслаў Алімпіеў — 85». Суддзя — Валерый Калашнікаў. Эцюды на дыяграмах з поўным рашэннем і каментарыямі, а таксама ў фармаце PGN дасылаць да 31 мая 2022 года на электронны адрас: kalashnikov.valerij@yandex.ru

Міжнародны мемарыяльны конкурс па задачах-трохходоўках «Фелікс Расамаха — 85». Суддзя — Валерый Шавырын. Задачы на дыяграмах з поўным рашэннем і каментарыямі дасылаць да 2 жніўня 2022 года на электронны адрас: problemist64@yandex.ru

Міжнародны мемарыяльны конкурс па задачах-шматходоўках і задачах на зваротны мат у 3—10 ходаў «Уладзімір Жалтаножка — 80». Суддзя — Валерый Кірылаў. Задачы на дыяграмах з поўным рашэннем і каментарыямі дасылаць да 14 жніўня 2022 года на электронны адрас: konstantin.kirillov.79@yandex.ru

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Kf6. Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сваё кіно

## Адкрыць наноў вядомыя імёны

**На наступным тыдні ў эфіры «Беларусь 3» пройдуць цікавыя кінапаказы для тых, хто любіць даследаваць гістарычнае мінулае і натхняцца біяграфіямі людзей, якія адкрываюць нам вядомых асоб з нечаканых ракурсаў. На канале ўбачым шматсерыйны гісторыка-прыгодніцкі серыял «Дзяржаўная граніца» і дакументальныя фільмы з цыкла «Імёны Беларусі».**




Паказ гісторыка-прыгодніцкага серыяла «Дзяржаўная граніца» ад рэжысёра Барыса Сцяпанава, які здымалі на кінастудыі «Беларусьфільм» у 1980—1988 гадах, стартуе ў аўторак. У першай серыі дзеянне адбываецца ў 1917 годзе, калі ў маладой рэспубліцы Саветаў прымаецца дэкрэт аб граніцы і пачынаецца стварэнне пагранічнай службы. Герой фільма, былы афіцэр Асобнага корпуса пагранічнай варты, прымае прапанову ўзначаліць мытную службу Савецкай дзяржавы. Даведаемся з фільма таксама пра тое, як змагаліся першыя савецкія пагранічнікі з незаконным вывазам каштоўнасцяў...

У вячэрнім эфіры аўдыторыю чакае дакументальны фільм «Імёны Беларусі. Максім Гарэцкі» Арыны Бокун (2021). Лёс аўтара першага беларускага хорару з'яўляецца не менш вострасюжэтным, чым яго кнігі. Беднасць, жахі вайны, арышты, расстрэл... А вось у прамежках паміж жыццёвымі катаклізмамі літаратар і вучоны паспяваў пісаць кнігі і праводзіць сур'ёзныя даследаванні беларускай мовы, фальклору, літаратуры. Работы Максіма Гарэцкага дазволілі яму ўваскрэснуць у памяці людзей праз гады забыцця...

Другі фільм «Мірнае лета 21-га года» серыяла «Дзяржаўная граніца» ўбачым у сераду. Цяпер разам з героямі кінастужкі гледачы апынуцца на ўчастку савецка-польскай граніцы, якая летам 1921 года пастаянна парушалася «агентамі міжнароднага капіталу». Па заданні польскай разведкі група злачынцаў пераапранаецца ў форму чырвонаармейцаў і нападае на прыгранічны савецкі гарадок. Пры гэтым гіне начальнік асобага аддзела Краўцоў, а яго жонка атрымлівае раненне. Аднак у планы ворагаў умешваецца чэкіст Гамаюн, і ўвесь ход аперацыі мяняецца...

А вось у чарговай серыі дакументальнага праекта «Імёны Беларусі» распавядуць пра Яна Чэрскага. Выпускнік Шляхецкага інстытута ва ўзросце 18 гадоў быў назаўсёды сасланы ў Сібір за ўдзел у паўстанні 1863 года. Але там юнака выратоўвае навука, і адтуль ён вяртаецца вядомым вучоным. А пасля адпраўляецца ў чарговую экспедыцыю, якая стане для яго апошняй.

Трэцюю серыю «Дзяржаўная граніца. Усходні рубеж» (1982) убачым у чацвер. Дзеянне гэтай кінастужкі пераносіць нас ужо ў 1929 год на савецка-кітайскую граніцу. Яе героі праяўляюць сябе і дэманструюць прафесіяналізм ва ўмовах змоў і правакацый. Чацвёрты фільм, «Чырвоны пясок», на экраны выйдзе ў пятніцу. Тут нас чакае аповед пра барацьбу савецкіх пагранічнікаў з фарміраваннем басмачоў на далёкіх паўднёвых граніцах Савецкага Саюза.

Яшчэ адна серыя дакументальнага цыкла «Імёны Беларусі» расказвае пра Андрэя Уласенку. У 1868 годзе малады аграном з Магілёўшчыны вынайшаў прататып сучаснага камбайна. Нават заходнія аналагі саступалі новай тэхніцы ў якасці. Аднак чаму навінка так і не трапіла ў масавую вытворчасць, а геніяльны вынаходнік памёр невядомым?

Прадставяць нашай увазе і дакументальны фільм пра Айзека Азімава. Мала хто ведае, што аўтар некалькіх соцень мастацкіх і навукова-папулярных твораў, сусветна вядомы фантаст родам з былога мястэчка Вялікага Княства Літоўскага... Свае родныя Пятровічы пісьменнік успамінаў усё жыццё, але так там і не пабываў. А прычынай стала тое, што аўтар раманаў пра міжгалактычныя пералёты не любіў вандраваць.

**Алена ДРАПКО.**


**«Са «Звяздою» — спадручней!»**

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або на I паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 прасаў Holt HT-IR-010 і суперпрыз — пыласос Samsung VCC4131S3A/XEV. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 26 красавіка 2022 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2022 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або на першае паўгоддзе 2022 года і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 41 ад 1 сакавіка 2022 года.





**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4159 ад 24.02.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал 2022 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________

____________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________
(аддзяленне сувязі)

на II квартал 2022 года

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ________ (індэкс) ________

____________

Удачы ў розыгрышы!

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 1.05** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «Кругаварот» (12+).**
**13.05, 15.25 Драма «Занадта шмат палюбоўнікаў» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларускі час.
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**0.45** Арэна.
**01.20** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 11.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.55** «Зразумець. Дараваць» (16+).
**10.15** «На тыдзень» (16+).
**11.35** «Хортан» (0+).
**13.00** «Вось такія людзі» (12+).
**13.50 Трылер «Чужыя» (16+).**
**16.10** «Тры першыя спатканні» (16+).
**17.00 Дзеянне «Зялёны шаршань» (12+).**



**18.55** «На кручку» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).**
**22.15** Хачу ў тэлевізар!
**22.20 Серыял «Такая работа» (16+).**
**0.05** «Экстрасенсы-дэтэктывы» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.10** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 15.20, 20.30, 23.30** Навіны культуры.
**8.15, 18.55 «Сіцыліянская абарона». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**9.45** «Нацыянальны хіт-парад».
**10.35 «Права на стрэл». Маст. фільм (12+).**
**12.40** «Суразмоўцы».
**12.55** «Наперад у мінулае».
**13.20, 21.05** «Апошні дзень» (12+) [СЦ].
**14.00, 21.40 «Святло ў акне». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**15.30** «Навукаманія» (6+).
**15.55** «Кадры жыцця».
**16.50** «Ганна Карэніна». Балет.
**18.40** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Кафедра».

### Беларусь 5

**6.00** Тэніс. WTA.
**8.00** Азбука спорту.
**8.15, 10.30** Біятлон. Кубак свету.
**9.45** Вялікі спорт.
**11.35** Піт-стоп.
**12.05** Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
**14.05** Футбол. Суперкубак Беларусі — 2022. Жанчыны. ФК «Мінск» — «Дынама-Мінск».
**16.05** Хакей для ўсіх.
**16.35** Гульня галавой.
**17.20** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «ВітЭн» (Орша) — «Барысаў-90».
**19.20** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама-Мінск». Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — ХК «Гомель».
**21.40** На мяжы фолу.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлас» — «Манчэстэр Сіці».
**0.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.10** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Асаблівасці нацыянальнай работы» (12+).
**13.15, 23.25 Серыял «Парогі» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** «Прапаганда» (16+).
**21.35 Серыял «Янычар» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40 «Шакал». Серыял (16+).**
**12.30, 20.40** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.10** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50** «Вялікія таямніцы» (16+).
**18.30** «Па сутнасці».
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».
**22.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**23.55** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**0.35** «Самая карысная праграма» (16+).
**1.30** «Мінтранс» (16+).

### МІР

**5.00 Серыял «Люты-2» (12+).**
**8.35, 10.20 Маст. фільм «Паляванне на Вервольфа» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «Беларускі стандарт» (12+).
**13.15, 18.05** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.15, 3.00** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 3.45, 4.30** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.10** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25, 20.10** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.55, 21.55** «Слабае звяно» (12+).
**22.55** «Назад у будучыню» (16+).
**23.50 Серыял «Свае» (16+).**
**1.15** Дак. фільм «Магутны чалавек» (16+).
**1.45 Мастацкі фільм «Маё каханне» (12+).**

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Тайны Беларусі» (16+).
8.40, 9.40, 11.00, 12.50, 14.40, 15.40, 17.00, 21.40, 23.40, 1.05, 2.40, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Яловая субмарына» (18+).
13.30 Маст. фільм «Вельмі верная жонка» (18+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.10 Маст. фільм «Шэрыя ваўкі» (18+).
22.00 «Колба часу» (16+).
23.00 «Блеф-клуб» (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.30 Маст. фільм «Кодэкс ганьбы» (18+).

### EuroSport 1

0.00, 6.30, 11.30 Біятлон. КМ. Жанчыны (6+).
0.55, 20.20 The Minute (16+).
1.00, 20.15 Навіны (16+).
1.05, 5.00, 9.00 Веласпорт. Гран-пры Дэнена (16+).
2.30 Веласпорт. «Нокеры — Кёрсе». Мужчыны (16+).
3.30, 7.00, 12.15 Горныя лыжы. КМ. Жанчыны (16+).
4.15, 8.00, 13.00, 13.45 Горныя лыжы. КМ. Мужчыны (16+).
10.30 Конны спорт. Турнір Вялікага шлема (6+).
17.40 Біятлон. КМ. Мужчыны.
19.10 Скачкі на лыжах з трампліна. КМ. Мужчыны.
20.25 Аўтагонкі на вынослівасць. «1000 міль Себрынг».

### Кінакамедыя

1.10 Чаго хочуць жанчыны? (16+)
3.25 Дурдом на колах (12+).
5.15 Мача і батан (16+).
7.15 Мача і батан-2 (16+).
9.10 На рыбалку! (12+)



11.00 Таксі-3 (16+).
12.35 Таксі-4 (16+).
14.10 Дзядуля нялёгкіх паводзін (6+).
15.55 Аферысты Дзік і Джэйн (12+).
17.35 Таксі-5 (18+).
19.30 Белыя людзі не ўмеюць скакаць (16+).
21.35 Галівудскія копы (12+).
23.45 Асліпленыя жаданнямі (16+).

### ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.30 «Гадзіннік кахання» (16+).
10.25 «Паглядзім» (12+).
10.55 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.10 «Любоўная магія» (16+).
12.45, 18.00, 1.40 «Сляпая» (16+).
13.50, 19.10, 2.40 «Варажбітка» (16+).
14.55, 3.35 «Апакаліпсіс» (16+).
16.00, 0.45 «Знахаркі» (16+).
17.00 «Ведзьмакі свету» (16+).
20.20 «Які танцуе з ваўкамі» (16+).
4.25 «Суд ідзе». Серыял (16+).

### ТБ1000

5.00, 5.40, 17.15, 18.05 Элементарна (16+).
6.25 Гонар і прадузятасць (12+).
8.35 Яшчэ адна з роду Балейн (16+).
10.40 Джэйн Эйр (12+).
12.55 Ілюзія падману (12+).



15.00 Ілюзія падману-2 (12+).
19.00 Адзінаццаць сяброў Оўшэна (16+).
21.05 Дванаццаць сяброў Оўшэна (16+).
23.25 Трынаццаць сяброў Оўшэна (16+).
1.30 Словы (12+).
3.10 Воблasці цемры (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

6.35 Мафія: гульня на выжыванне (16+).
8.15 Танцы да смерці (12+).
10.10 Маёр Гром: чумны доктар (12+).
12.35 Белы снег (6+).
15.00 Каманда мары (6+).
16.30 Нефутбол (12+).
18.05 Юлечка (16+).
20.00 Прыварот. Чорны шлюб (16+).
21.35 Нявеста (16+).
23.15 Былая (18+).
0.50 Дзень да (18+).
2.15 Сябры сяброў (16+).
3.40 Свята пад замком (16+).
4.55 Самы лепшы дзень (16+).

### National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.25 Панарама 360 градусаў. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
7.15, 8.10 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
9.00, 9.55 Інстынкт выжывання (16+).
10.45, 23.25, 0.20 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
11.40 Дзікі тунец (16+).
12.30, 16.45, 19.15, 20.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
13.20, 14.10, 17.35 Аўта-SOS (16+).



15.00, 21.45 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
15.55 Злавіць кантрабандыста (16+).
18.25, 18.50 Фабрыка ежы (16+).
21.00, 3.25 Галандская берагавая ахова ў Карыбскім моры (16+).
22.35 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
1.05, 1.50 Асушыць акіян (16+).
2.40 Тайная гісторыя караблекрушэнняў (16+).
4.10 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
4.55, 5.35 Гульні розуму (16+).

### Discovery

8.00, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40 Як гэта зроблена? (12+)
11.10 Хуткія і гучныя (12+).
12.05, 13.00 Залатая ліхаманка (16+).
13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10 Склады (12+).
17.35 Круты цюнінг (12+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Разбуральнікі легенд (16+).
23.05, 1.50, 2.45, 3.40, 5.14 Смяротны ўлоў (18+).
0.00, 6.01 Аперацыя «Выратаванне дома» (18+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліюецца са скрытымі субцітрамі.*

## пятніца, 18 сакавіка



### Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25, 18.15** Зона Х (16+).
**9.10 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 1.05** «Скажынемаўчы».
**11.50, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Драма «Кругаварот» (12+).**
**13.55** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.40, 15.25 Драма «Ангеліна» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Сэнс жыцця (12+).
**17.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў (16+).
**22.50 Драма «Шэпт» (12+).**
**0.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.05** Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.05** «Экстрасенсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00 Серыял «Такая работа» (16+).**
**12.40** «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
**13.15 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).**
**14.10** «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
**15.05** Анімацыйны серыял «Казачныя гісторыі» (0+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**16.55** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**17.35** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**19.10 «Клон». Серыял (16+).**
**20.05, 21.15** «Тата папаў» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**22.05** «Вяселле ўслепую» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 15.00, 20.30, 23.20** Навіны культуры.
**8.15, 15.50 «Учора скончылася вайна». Серыял (12+) [СЦ].**
**9.50** «Гісторыя Беларусі. Бітвы».
**10.20, 21.05 «Добраахвотнікі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.10** «Сіла веры».
**12.40, 18.00** «Дзяржаўная граніца» (12+) [СЦ].
**15.10** «Артэфакты».
**15.35** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**17.25** «Жывая спадчына».
**17.50** «Імёны Беларусі. Андрэй Уласенка». Дак. фільм (6+) [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.40** «Зэльдовіч. Тэорыя гарэння і выбуху». Гісторыка-біяграфічны фільм (12+) [СЦ].

### Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.15, 9.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.
**9.15** Вось гэта спорт!
**11.35, 20.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету ў памяшканні.
**16.05** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**16.40** Фактар сілы.
**17.15** Авертайм.
**17.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Мінск» — «Дынама-Мінск».
**19.50** Спорт-цэнтр.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вулверхэмптан» — «Лідс».

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.35** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 22.50 Серыял «Парогі» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.45, 18.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**18.50** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** «Дзве зоркі. Бацькі і дзеці» (12+).

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.00** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20, 20.40, 0.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.10** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.30, 16.50 «Масгаз. Формула помсты». Серыял (16+).**
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».

### МІР

**5.00 Серыял «Фантом» (16+).**
**9.20, 10.20 Серыял «Свае» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «У гасцях у лічбы» (12+).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.20** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.15 Мастацкі фільм «Пунсовыя ветразі» (12+).**
**19.15** «Слабае звяно» (12+).
**20.15** «Гульня ў кіно» (12+).
**21.00** «Сусветная гульні розуму» (12+).
**21.35 Мастацкі фільм «Вабанк» (12+).**



**23.30 Мастацкі фільм «Вабанк-2» (12+).**
**1.05 Мастацкі фільм «Крэмень» (16+).**
**2.25 Мастацкі фільм «Двайняты» (0+).**
**4.35** Мультфільмы (0+).

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Аб самым галоўным» (12+).
**12.35** «Кропкі над і» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «60 хвілін» (12+).
**17.30 Фільм «Трамвай у Парыж» (12+).**
**21.05 Серыял «Лізавета» (16+).**
**22.10, 23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 7.25, 8.20, 16.40, 19.50, 22.05, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**
**7.10** Сфера інтарэсаў.
**7.40** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.05** «НЗ.by».
**8.55** Пракурорская праверка (16+).
**10.25 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.45** Беларуская супержанчына.
**16.55** «Чакай мяне» (12+).
**17.55** Дэтэктыў «Пёс» (16+).
**20.05** «Следства вялі...» (16+)
**21.35, 22.50** «Краіна талентаў» (12+).
**0.10** Дак. цыкл «Вечная Айчынная» (12+).

### 8 канал

**7.00, 15.10, 19.55, 21.10, 1.10** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.25** Мультпарад (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (12+).**
**8.15, 10.50 Драма «Белыя ночы» (16+).**
**10.00 Серыял «В'етнам».**
**12.30** «Драйв выжывання» («Формула-1»).
**13.10 Камедыя «Аферыстка» (16+).**
**15.15** «Хачу ў кіно» (12+).
**16.35** «Гатуй як шэф» (12+).
**16.35 Серыял «Ніткі лёсу» (12+).**
**18.10 Трылер «Дзіця робата» (16+).**
**20.00 Серыял «Першая мадэль» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.15 «Героі коміксаў на экране». «Першы мсціўец» (12+).**
**23.10 Серыял «Змей» (18+).**

## серада, 16 сакавіка



### ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00, 9.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**11.00, 23.15** «КВЗ. Панашаму» (16+).
**12.00** «Наш рамонт» (16+).
**12.30** «Дурні і дарогі» (16+).
**13.05** Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
**14.05, 18.30** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**15.35** Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
**17.00, 0.55** «Форт Баярд» (16+).
**20.00** Серыял «Модны сіндыкат» (16+).
**21.00** Фільм-катастрофа «Агонь» (12+).
**0.00** Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
**2.20** Серыял «Кадэцтва» (12+).
**3.55** «Адна за ўсіх» (16+).
**5.10** «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.40, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05, 20.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 18.05, 1.35** «Новы погляд на дагістарычную эпоху». Дак. фільм [СЦ].
**8.35** «Першыя ў свеце».
**8.50** «Баль у «Савоі». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.00** XX стагоддзе.
**12.10** «Забытае рамяство».
**12.25, 22.15** «Бярозка». Серыял [СЦ].
**13.20, 2.30** Жыццё выдатных ідэй.
**13.50** Штучны адбор.
**14.30** «Іншае жыццё Наталлі Шмяльковай. Уладзімір Якаўлеў» [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Кіно.
**15.20** «Біблейскі сюжэт».
**15.50** «Белая студыя».
**16.35, 0.55** Усерасійскі юнацкі сімфанічны аркестр пад кіраваннем Юрыя Башмета «Трыпціх».
**17.20** Больш, чым каханне.
**19.00** Хто мы? [СЦ]
**19.45** «Галоўная роля».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.50** «Абсалютны слых».
**21.30** Улада факта.
**23.10** «Школа будучыні» [СЦ].

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» (18+).
**6.55, 8.20, 9.40, 11.00, 13.05, 14.40, 15.40, 17.00, 20.40, 21.40, 23.00, 0.50** Музычная настальгія (12+).
**7.10, 13.30** Маст. фільм «Кодэкс ганьбы» (18+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 0.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**19.05** Маст. фільм «Незабудкі» (18+).
**1.25** «Калі лёс настаўлены на карту». Фільм-канцэрт (12+).
**3.45** Маст. фільм «Пашпарт» (16+).
**5.25** «Блеф-клуб» (16+).

### EuroSport 1

**0.30, 20.00, 21.55, 23.55** Навіны (16+).
**1.30** Конны спорт. Турнір Вялікага шлема (6+).
**2.30, 3.00, 5.00, 10.30, 11.00, 11.45, 22.30.** Горныя лыжы. КМ. Мужчыны (16+).
**3.30, 4.15, 7.15, 8.00** Біятлон. КМ (6+).
**5.45** Біятлон. КМ. Мужчыны (6+).
**6.30** Біятлон. КМ. Жанчыны (6+).
**8.45, 19.30** Тэлечасопіс Cycling Show (16+).
**9.10, 9.45, 13.15, 23.15** Горныя лыжы. КМ. Жанчыны (16+).
**14.30, 20.05** Веласпорт. «Нокеры — Кёрсе». Жанчыны.
**15.50, 21.00** Веласпорт. «Мілан — Турын».
**17.30** Веласпорт. «Нокеры — Кёрсе». Мужчыны.
**22.00** Тэлечасопіс Teqball-шоу (6+).

### Кінакамедыя

**1.20** Асліплены жаданнямі (16+).
**3.00** Скінь маму з цягніка (12+).
**4.35** Чаго хочуць жанчыны? (16+)
**6.50** Ліцэнзія на шлюб (12+).



**8.30** Дурдом на колах (12+).
**10.20** Мача і батан (16+).
**12.20** Мача і батан-2 (16+).
**14.20** Гарэза (12+).
**16.05** На рыбалку! (12+)
**17.55** Таксі-3 (16+).
**19.30** Аферысты Дзік і Джэйн (12+).
**21.05** Паміж намі, хлопчыкамі (16+).
**23.00** Дзе мая тачка, чувак? (12+)

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.50** «Гадзіннік кахання» (16+).
**10.45** «Перыскоп» (16+).
**11.05** «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
**12.20** «Любоўная магія» (16+).
**12.55, 17.00** «Старац» (16+).
**14.05, 18.50, 2.40** «Сляпая» (16+).
**15.15, 20.00, 3.35** «Варажбітка» (16+).
**16.25** «Любоўная магія» (16+).
**18.10** «Уінджы» (12+).
**21.10** «Я ведаю твае сакрэты» (16+).
**22.15** «Мая» (16+).
**23.20** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**0.20** «Лінія абароны» (16+).
**0.55** «Куды прыводзяць мары» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Серыял (16+).

### ТБ1000

**5.50, 6.30, 17.20, 18.05** Элементарна (16+).
**7.25** Прывід (16+).
**10.00** Словы (12+).
**11.50** Воблассі цемры (16+).



**13.45** Ідэнтыфікацыя (16+).
**15.25** Гульня ў хованкі (16+).
**19.00** Вавілон (16+).



**21.40** Воблачны атлас (16+).
**0.40** Я — пачатак (16+).
**2.25** Джобс: імперыя спакусы (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.50** Сябры сяброў (16+).
**7.25** Свята пад замком (16+).
**8.50** Снежная каралева-3. Агонь і лёд (6+).
**10.25** Дзед Мароз. Бітва магаў (6+).
**12.35** Самы лепшы дзень (16+).
**14.30** Ратуйце Колю! (12+)
**16.15** Гудбай, Амерыка (12+).
**18.10** Чэмпіёны (6+).
**20.00** Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней (6+).
**21.45** На вастры (12+).
**23.50** Адзін удых (12+).
**1.30** Прываварот. Чорны шлюб (16+).
**2.55** Недараваны (16+).
**4.40** Чэмпіёны (6+).

### National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.25** Панарама 360 градусаў. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
**7.15, 8.05** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**9.00, 9.55** Інстынкт выжывання (16+).
**10.45, 21.00, 23.30, 0.20, 3.25** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.40** Дзікі тунец (16+).
**12.30, 16.45** Неверагодныя цуды тэхнікі (16+).
**13.20, 14.10, 17.40** Аўта-SOS (16+).
**15.00** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**15.55** Злавіць кантрабандыста (16+).
**18.30, 18.55** Фабрыка ежы (16+).
**19.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**20.10** Аляска: новае пакаленне (16+).
**21.50** Нязведаныя воды з Джэрэмі Уэйдам (16+).
**22.40** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**1.05** Тайная гісторыя караблекрушэнняў (16+).
**1.55, 2.40** Асушыць акіян (16+).
**4.10** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**4.55, 5.40** Гульні розуму (16+).

### Discovery

**8.00, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04, 7.35** Як гэта ўладкавана? (12+)
**8.25, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.20, 9.45, 20.20, 20.45** Багажныя войны (12+).
**10.15, 10.40, 21.15, 21.40** Як гэта зроблена? (12+)
**11.10** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05** Як уладкаваны Сусвет (16+).
**13.00** Давід Андрэс каляcіць па свеце (18+).
**13.55, 14.50, 15.45** Брудная работа (12+).
**17.35** Круты цюнінг (12+).
**18.30** Іржавая імперыя (12+).
**19.25, 4.27** Разбуральнікі легенд (16+).
**23.05, 5.14** Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
**0.00, 0.25, 6.48, 7.12** Дзіўны свет жывёл (12+).
**0.55** Голыя і напалоханыя (18+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.25** Зона Х (16+).
**9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 1.00** «Скажынемаўчы».
**11.50, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Кругаварот» (12+).**
**13.55** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.40, 15.25 Драма «Ангеліна» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларускі час.
**21.00** Панарама.
**21.45** Адзін дзень (12+).
**0.10** Сфера інтарэсаў.
**0.45** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.05** Тэлебарометр.
**9.05, 20.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.05, 23.55** «Экстрасенсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00, 22.10 Серыял «Такая работа» 16+).**
**12.40** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**13.20, 21.15 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).**



**14.10** «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
**15.10** Анімацыйны серыял «Казачныя гісторыі» (0+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**17.35** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**19.10 «Клон». Серыял (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.10** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 15.10, 20.30, 23.10** Навіны культуры.
**8.15, 15.45 «Учора скончылася вайна». Серыял (12+) [СЦ].**



**9.50** «Гісторыя Беларусі. Бітвы».
**10.20, 21.05 «Два капітаны». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.40, 18.00 «Дзяржаўная граніца» (12+) [СЦ].**
**15.20** «Артэфакты».
**17.25** «Жывая спадчына».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.35** «Вітольд Цэраскі. «De rebus omnibus». Гісторыка-біяграфічны фільм (6+) [СЦ].

## Беларусь 5

**7.00, 11.25** Тэніс. WTA.
**9.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Ліль» (Францыя) — «Чэлсі» (Англія).
**10.55** Фактар сілы.
**13.15** Агнявы рубеж.
**13.45** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. ХК «Гомель» — «Нёман» (Гродна).
**15.45** Слэм-данк.
**16.20** Баскетбол. Адзіная ліга ЗГБ. «Астана» (Нур-Султан) — «Цмокі-Мінск».
**18.10** Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
**20.35, 22.45** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.45 Серыял «Парогі» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+).
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе»(16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.55 Серыял «Янычар» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.00** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**10.40 «Шакал». Серыял (16+).**
**12.30, 20.50, 0.50** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.10** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.40** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.30, 16.50 «Масгаз. Формула помсты». Серыял (16+).**
**20.20, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.25** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.35** «Міншчына».

## МІР

**5.00, 3.45 Серыял «Фантом» (16+).**
**8.40, 10.10, 23.50 Серыял «Свае» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 18.05** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.15, 3.00** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.10** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25, 20.10** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.55, 21.55** «Слабое звяно» (12+).
**22.55** «Назад у будучыню» (16+).
**2.00 Маст. фільм «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» (12+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Аб самым галоўным» (12+).
**12.35** «Кропкі над і» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «60 хвілін» (12+).
**17.30 Серыял «Трымайся за аблокі» (12+).**
**21.05 Серыял «Лізавета» (16+).**
**22.10, 23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 7.25, 8.20, 16.40, 19.50, 22.05, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**



**7.10** Сфера інтарэсаў.
**7.40** «Зламацы стэрэатыпы» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 22.10** «НЗ.by».
**8.55** Пракурорская праверка (16+).
**10.25 Баявік «Маркіз д'ябла. Смерч» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.45** Беларуская суперажанчына.
**16.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**20.05, 22.30 Серыял «Першы аддзел» (16+).**
**23.45 Серыял «Захоп» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 16.10, 19.55, 21.15, 1.50** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.20** Мультпарад (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (12+).**
**7.55, 10.25, 12.50 Драма «Школьнае каханне» (16+).**
**9.35 Серыял «В'етнам».**
**12.05** «Драйв выжывання» («Формула-1») (16+).
**16.15** «Хачу ў кіно» (12+).
**16.35 Серыял «Ніткі лёсу» (12+).**
**18.10** «Смачнае кіно» «Кухня» (12+).
**20.00 Серыял «Першая мадэль» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Салам алейкум, Беларусь!»
**21.20 Трылер «Квэст для хакера» (16+).**
**23.05 Серыял «Змей» (18+).**

чацвер, 17 сакавіка ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00, 9.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**11.00, 23.25** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**12.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**13.05** Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
**14.05, 18.30** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**15.35** Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
**16.40, 0.55** «Форт Баярд» (16+).
**20.00** Серыял «Модны сіндыкат» (16+).
**21.00** Фільм-катастрофа «Экіпаж» (12+).
**0.00** Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
**2.30** Серыял «Кадэцтва» (12+).
**4.05** «Адна за ўсіх» (16+).
**5.10** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.40, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 1.40** «Новы погляд на дагістарычную эпоху». Дак. фільм [СЦ].
**8.35** «Першая ў свеце».
**8.55** «Баль у «Савоі». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.00** ХХ стагоддзе.
**12.10** «Забытае рамяство».
**12.25, 22.15** «Бярозка». Серыял [СЦ].
**13.20, 2.30** Жыццё выдатных ідэй.
**13.50** «Абсалютны слых».
**14.30** «Іншае жыццё Наталлі Шмяльковай. Венядзікт Ерафееў» [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**15.20** Мая любоў — Расія! [СЦ].
**15.50** «2 Вернік 2».
**16.35, 0.55** Усерасійскі юнацкі сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Юрыя Башмета «Трыпціх».
**17.20** Больш, чым каханне.
**18.05** «Куды пайшлі дыназаўры?» Дак. фільм [СЦ].
**19.00** Хто мы? [СЦ]
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Адкрытая кніга.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.50** Кіно пра кіно [СЦ].
**21.30** «Энігма. Рэнэ Папе».
**23.10** «Школа будучыні» [СЦ].

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (16+).
**7.05, 8.40, 9.40, 11.00, 14.40, 15.40, 17.00, 18.50, 20.40, 21.40, 23.00, 0.55, 2.20, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.30, 1.10** Маст. фільм «Кодэкс ганьбы» (18+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**13.05** Маст. фільм «Незабудкі» (18+).
**18.00** «Ялавая субмарына» (18+).
**19.30** Маст. фільм «Вельмі верная жонка» (18+).
**0.00** «СевАлогія» (18+).

## EuroSport 1

**0.00, 9.00** Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
**0.30, 6.00** Веласпорт. «Нокеры — Кёрсе». Мужчыны (16+).
**2.00, 7.30** Веласпорт. «Мілан — Турын» (16+).
**3.30, 9.30, 13.00, 16.15, 17.00, 19.05, 23.00.** Горныя лыжы. КМ. Мужчыны (16+).
**4.15, 10.30, 11.45, 14.30, 15.30, 22.00.** Горныя лыжы. КМ. Жанчыны (16+).
**5.00** Веласпорт. «Нокеры — Кёрсе». Жанчыны (16+).
**17.35** Біятлон. КМ. Жанчыны.
**20.00** Навіны (16+).
**20.05** Веласпорт. Гран-пры Дэнена (16+).
**21.30** Тэлечасопіс Cycling Show (16+).

## Кінакамедыя

**0.30** Не жартуйце з Зоханам! (16+)
**3.10** Дзядуля лёгкіх паводзін (18+).
**5.00** Дзядуля нялёгкіх паводзін (6+).
**6.45** Аслеплены жаданнямі (16+).
**8.25** Копы ў глыбокім запасе (16+).
**10.25** Таксі (16+).
**12.05** Таксі-2 (16+).
**13.40** Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара (12+).
**15.45** Астэрыкс і Абелікс: місія Клеапатра (12+).
**17.50** Таксі-4 (16+).
**19.30** Мая мачаха — іншапланецянка (12+).



**21.25** Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу (16+).
**23.05** За бортам (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.40** «Гадзіннік кахання» (16+).
**10.35** «Улегцы» (12+).
**11.05** «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
**12.25** «Любоўная магія» (16+).
**13.00, 17.00** «Старац» (16+).
**14.05, 18.45, 2.35** «Сляпая» (16+).
**15.10, 19.55, 3.30** «Ваража-бітка» (16+).
**16.20** «Любоўная магія» (16+).
**18.10** «Уіндзы» (12+).
**21.05** «Я ведаю твае сакрэты» (16+).
**22.10** «Мая» (16+).
**23.15** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**0.15** «10 самых» (16+).
**0.45** «Вайна. Застацца чалавекам» (16+).
**4.25** «Суд ідзе». Серыял (16+).

## ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** Элементарна (16+).
**6.55** Я — пачатак (16+).
**8.55** Воблачны атлас (16+).
**12.00** Код да Вінчы (16+).



**14.45** Анёлы і дэманы (16+).
**19.00** Гонар і прадузятасць (12+).
**21.15** Яшчэ адна з роду Балейн (16+).
**23.25** Джэйн Эйр (12+).



**1.30** Гульня ў хованкі (16+).
**3.05** Ідэнтыфікацыя (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 15.45** Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней (6+).
**8.05** Адзін удых (12+).
**9.50** На вастрыі (12+).
**11.55** Варатар Галактыкі (6+).
**14.05** Чэмпіёны (6+).



**17.40** Маёр Гром: чумны доктар (12+).
**20.05** Мафія: гульня на выжыванне (16+).
**21.50** Танцы да смерці (12+).
**23.40** Дзень да (18+).
**1.15** Белы снег (6+).
**3.15** Каманда мары (6+).
**4.40** Нефутбол (12+).

## National Geographic

**6.00, 6.10** Навуковыя глупствы (16+).
**6.35** Панарама 360 градусаў. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
**7.25, 8.15** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**9.10, 10.00** Інстынкт выжывання (16+).
**10.55, 12.40, 16.50, 1.55, 2.35** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.50** Дзікі тунец (16+).
**13.25, 14.15, 17.40** Аўта-SOS (16+).
**15.10** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**16.00** Злавіць кантрабандыста (16+).
**18.30, 18.55** Фабрыка ежы (16+).
**19.20, 20.10, 21.00, 21.50, 22.40, 0.20, 1.10** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**3.20, 4.05** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**4.50, 5.35** Гульні розуму (16+).

## Discovery

**8.00, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10, 7.35** Як гэта ўладкавана? (12+)
**8.25, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.20, 9.45, 20.20, 20.45** Багажныя войны (12+)
**10.15, 10.40, 21.15, 21.40** Як гэта зроблена? (12+).
**11.10** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05** Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
**13.00, 13.25** Дзіўны свет жывёл (12+).
**17.35** Круты цюнінг (12+).
**18.30** Іржавая імперыя (12+).
**19.25, 4.27** Разбуральнікі легенд (16+).
**23.05, 0.00, 0.55, 5.14, 6.01, 6.48** Залатая ліхаманка (16+).
**1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04** Склады (12+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

Таццяна РУНЕЦ:

# «ДЗЯРЖАВА — ГЭТА ПЕРШ ЗА ЎСЁ ПАРТНЁР, А НЕ АПЯКУН»

## Аб гендарнай роўнасці, змяненнях у Асноўны Закон і ўплыве санкцый

**У эксклюзіўным інтэрв'ю карэспандэнту «МС» старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец расказала аб рабоце над сёлетнімі законапраектамі, сваім вопыце работы ў якасці члена Канстытуцыйнай камісіі, прафесійным выбары і шмат іншага.**



Фота Сяргея ЛУКАШОВА, агенцтва «Мінск-навіны».

### Каштоўны вопыт

***— Таццяна Аркадзьеўна, вы адзіная жанчына — старшыня профільнай камісіі ў Савеце Рэспублікі. Як вам працуецца з калегамі-мужчынамі і як спраўляецеся з задачамі на цяперашняй пасадзе?***

— Вы ведаеце, маё асабістае перакананне — у сучасным свеце гендарны фактар не мае вызначальнага значэння. Ключавыя крытэрыі для кіраўніка любога ўзроўню — прафесіяналізм, кампетэнтнасць і, відома, базавыя чалавечыя якасці. Тады ты лёгка знойдзеш агульную мову з калегамі і зможаш арганізаваць зладжаную работу ў калектыве з любой гендарнай структурай.

Дарэчы, у бягучым скліканні Савета Рэспублікі кожны чацвёрты сенатар — жанчына.

Устрымаюся ад ацэнкі сваёй работы на пасадзе старшыні Пастаяннай камісіі. Адзначу толькі, што ў Пастаяннай камісіі, якую я ўзначальваю, створана выдатная рабочая атмасфера. Нягледзячы на тое што кожны працуе ў сваім рэгіёне, прычым на адказнай пасадзе, мы збіраемся даволі часта і не толькі ў сесіённы перыяд. У 2021 годзе правялі 16 пасяджэнняў Пастаяннай камісіі, на якіх абмяркоўвалі канкрэтныя законапраекты, актуальныя пытанні эканомікі і сацыяльнай сферы, работу ў працоўных калектывах, са зваротамі грамадзян.

***— Вы з'яўляліся адным з членаў Канстытуцыйнай камісіі, якая займалася распрацоўкай і разглядам прапаноў у Асноўны Закон краіны. Са 148 артыкулаў ужо прынятай Канстытуцыі якія найбольш блізкія асабіста Вам?***

— У першую чаргу хачу адзначыць, што дзейнасць у Канстытуцыйнай камісіі была вельмі каштоўным вопытам для мяне і важнай вяхой у маёй кар'еры дзяржаўнага служачага. Але і, вядома, гэта вялікая адказнасць. Таму што задача перад камісіяй стаяла досыць няпростая — у сціслыя тэрміны падрыхтаваць і забяспечыць грамадскае абмеркаванне змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон. Пры гэтым было поўнае разуменне, што карэкціроўка павінна быць комплекснай. Нічога нельга было ўпусціць, ніводзін запыт грамадства.

У гэтай сувязі як непасрэднаму ўдзельніку працэсу мне складана вылучыць асобныя артыкулы. Усе яны мне блізкія і маюць аднолькавую каштоўнасць.

Безумоўна, важна, што ў Канстытуцыі цяпер ёсць асобны артыкул, які прадугледжвае стварэнне на ўзроўні дзяржавы умоў для развіцця моладзі.

Асаблівае значэнне маюць новыя канстытуцыйныя палажэнні аб захаванні гістарычнай памяці і праўды. Гэтыя змены даўно наспелі. Я рада, што грамадзяне Беларусі іх падтрымалі, бо гэта нашы карані, ад якіх ні ў якім разе нельга адрывацца.

Таксама хачу адзначыць навелу з артыкула 21, якая ўсталёўвае сацыяльную адказнасць і абавязак кожнага ўносіць пасільны ўклад у развіццё грамадства і дзяржавы. Бо дзяржава — гэта перш за ўсё партнёр, а не апякун!

Жывую дыскусію на камунікацыйных пляцоўках выклікаў артыкул 32 пра абавязкі бацькоў рыхтаваць дзяцей да грамадска карыснай працы, прывіваць культуру і павагу да законаў, гістарычных і нацыянальных традыцый Беларусі. Мяркую, што гэтая норма ўзмацняе адказнасць бацькоў і, магчыма, дзесьці іх дысцыплінуе.

### Насуперак санкцыям

***— Дзейнасць профільнай камісіі прадугледжвае ўдзел у распрацоўцы законапраектаў, якія ў наступным выносяцца на зацвярджэнне і адабрэнне абедзвюх палат парламента. Што ў плане падрыхтоўкі законапраектаў у Пастаяннай камісіі на бліжэйшы час?***

— Хачу адзначыць, што у нас сёлета дастаткова насычаны нарматворчы парадак дня. Важна, што гэта будзе не проста кропкавая карэкціроўка дзеючых законаў, а замацаванне новых падыходаў да рэгулявання грамадскіх адносін у сферы эканомікі. Яркі прыклад — праект закона «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці». Мэтавыя арыенціры ў дзейнасці над гэтым законапраектам: больш гібкая фінансавая дыягностыка прадпрыемстваў для своечасовага папярэджання іх эканамічнай неплацежаздольнасці, захаванне працоўных калектываў, узмацненне ролі мясцовых органаў улады, павышэнне кваліфікацыі антыкрызісных кіраўнікоў, разумнае стымуляванне іх актыўнасці. Пагадзіцеся, досыць шырокі набор навацый.

Абмяркоўваючы праект новай рэдакцыі закона «Аб ліцэнзаванні», мы з калегамі сышліся на думцы, што неабходна сфарміраваць збалансаваную сістэму ліцэнзавання, якая, з аднаго боку, не павінна стаць бар'ерам для развіцця дзелавой ініцыятывы, бізнесу, а з другога — эфектыўна абараніць правы спажыўцоў, не дапусціць зніжэння якасці прадукцыі, работ, паслуг — гэта значыць стане дзейсным інструментам эканамічнага рэгулявання.

Шэраг прававых навел датычыцца фінансавай сферы. Напрыклад, у праекце закона «Аб змяненні законаў па пытаннях бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці» прапануецца ўдасканаліць падыходы да складання справаздачнасці па адпаведных міжнародных стандартах, у тым ліку скарэціць пералік грамадска значных арганізацый, абавязаных складаць гадавую справаздачнасць па міжнародных стандартах. Гэта дазволіць не праводзіць абавязковы аўдыт такой справаздачнасці і сэканоміць грашовыя сродкі арганізацый, накіраваць іх на абнаўленне тэхналагічнай базы.

Паколькі важным інструментам для прыцягнення інвестыцый у эканоміку з'яўляюцца каштоўныя паперы, а дадзены сегмент фінансавага рынку сёння дынамічна развіваецца, то і прававая база таксама патрабуе ўдасканалення. Законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях рынку каштоўных папер» прадугледжвае такія новаўвядзенні як стварэнне інстытута кваліфікаванага інвестара, укараненне новых відаў фінансавых інструментаў (стрып-аблігацыі, дэпазітарныя аблігацыі), і ў цэлым накіраваны на далейшае развіццё фінансавага рынку Беларусі.

Вядома, традыцыйна на разглядзе ў сенатараў сёлета будзе і пакет бюджэтных законапраектаў. Гэта праекты рэспубліканскага бюджэту і бюджэту Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на наступны год, карэкціроўка Падатковага кодэкса.

> Задача перад Канстытуцыйнай камісіяй стаяла досыць няпростая — у сціслыя тэрміны падрыхтаваць і забяспечыць грамадскае абмеркаванне змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон. Пры гэтым было поўнае разуменне, што карэкціроўка павінна быць комплекснай. Нічога нельга было ўпусціць, ніводзін запыт грамадства.

***— Санкцыі, якія прымяняюцца ў дачыненні да нашай краіны калектыўным Захадам, сёння дэманструюць адваротны эфект: эканоміка краіны паказвае рост. Як бы вы ахарактарызавалі гэты феномен?***

— За такі кароткі прамежак часу не зусім карэктна называць гэта феноменам. Тым больш, трэба разумець адрозненне паміж тэрмінамі «эканамічны рост» і «развіццё». Рост эканомікі вымяраецца канкрэтнымі статыстычнымі паказчыкамі, якія сёння сапраўды дэманструюць станоўчую дынаміку. Але такі рост часта мае кароткатэрміновы кан'юнктурны характар. Ён цыклічны.

Эканамічнае развіццё — больш складаная катэгорыя, неаддзельная ў тым ліку і ад сацыяльнай сферы, якасці жыцця насельніцтва. У гэтай сувязі, на мой погляд, уплыў заходніх санкцый на ўзровень жыцця нашых грамадзян яшчэ толькі трэба будзе ацаніць і асэнсаваць.

У цэлым, я лічу, што санкцыі — гэта заўсёды дрэнна для малой эканомікі адкрытага тыпу, да якой адносіцца і Беларусь. Абмежаванні, якія склаліся, — гэта своеасаблівы экзамен не толькі для ўсёй вертыкалі ўлады, але і для суб'ектаў гаспадарання, малога і сярэдняга бізнесу, спажывецкага рынку.

Важна ўлічваць, што апошнія два гады эканамічная сістэма Беларусі і так адчувала ціск у сувязі з каранавірусам. Таму сітуацыя вельмі няпростая, з такімі выклікамі мы сапраўды яшчэ не сутыкаліся. Але калі захаваем дынаміку росту беларускай эканомікі, павысім яе ўстойлівасць да знешніх шокаў за кошт эфектыўных контрсанкцыйных мер, стымулявання рацыянальнага імпартазамяшчэння, падтрымкі занятасці, дзелавой ініцыятывы, то мы пяройдзем да прынцыпова новага этапу развіцця.

***— Немагчыма жыць адной толькі працай. Якія захапленні і спосабы падтрымання сябе ў тонусе практыкуеце?***

— На жаль, вольнага часу не так шмат. Я стараюся праводзіць яго з сям'ёй. Асабліва эфектыўная «перазагрузка» атрымліваецца пры зносінах з унукамі, ад якіх я атрымліваю магутную дозу пазітыву. Яны як праменьчыкі святла, невычэрпны зарад бадзёрасці. У такія хвіліны я асабліва востра адчуваю патрэбу ў міры, народным адзінстве. Мне хочацца, каб нашы дзеці і ўнукі жылі ў квітнеючай краіне, прыгожай і ўтульнай Беларусі. Таму па абавязку службы стараюся прыкладці максімум намаганняў, каб захаваць і прымножыць дасягненні ў эканоміцы і сацыяльнай сферы.

### Сакрэт прыгажосці

***— У кожнай прыгожай жанчыны павінен быць свой сакрэт. Падзяліцеся?***

— Дзякую за камплімент. Не ўпэўненая, што ў мяне ёсць нейкі сакрэт або ўнікальная формула прыгажосці. Наогул лічу, што сучасныя крытэрыі жаночай прыгажосці часцяком навязаныя заходняй бьюці-індустрыяй. Шчыра кажучы, я не заўсёды разумею і прымаю гэтыя крытэрыі. Таму для беларускіх жанчын абмяжуюся традыцыйным наборам фактараў, якія дазваляюць асабіста мне быць у тонусе або, як кажа моладзь, у рэсурсе: высыпацца, весці здаровы спосаб жыцця, збалансавана харчавацца, не аддавацца нудоце і дрэнным думкам. А яшчэ, вельмі мудрыя словы: прыгажосць у вачах таго, хто глядзіць. Калі побач ёсць мужчына, які шануе і кахае вас, ніякія сакрэты і пластычныя аперацыі не патрэбныя.

***— Давайце ўспомнім сябе зусім юнай: работа ў сферы фінансаў вас вабіла заўсёды, ці ж былі зусім іншыя мары?***

— Мне заўсёды падабаліся дакладныя навукі. А пагадзіцеся, што фінансы — гэта ўсё ж такі сімбіёз эканомікі і матэматыкі. Таму свой выбар я зрабіла лёгка і, як паказаў час, ні разу не расчаравалася ў ім.

Тым больш што свет вельмі хутка мяняецца. Сферу матэрыяльнай вытворчасці або паслуг немагчыма ўявіць без фінансавай сферы. Ад дакладнага планавання і эфектыўнага карыстання фінансавымі рэсурсамі залежыць устойлівае развіццё эканомікі прадпрыемства, рэгіёна і краіны ў цэлым.

***— Ну і ў завяршэнне пагаворым аб сям'і. Вашы блізкія — хто яны?***

— Я з тых людзей, якія аддаюць перавагу не казаць публічна аб сваёй сям'і, аб сваіх блізкіх. Адзначу толькі, што яны заўсёды побач і падтрымліваюць мяне, дзеляцца сваёй станоўчай энергіяй. Мая сям'я, мой дом — гэта маё месца сілы, куды я з радасцю вяртаюся кожны вечар.

**Гутарыла Вольга АНУФРЫЕВА.**

ІНІЦЫЯТЫВА

# СОНЕЙКА НА ПАТЭЛЬНІ,

## або Мясцовае самакіраванне па-студэнцку

**У мінулую пятніцу каля Магілёўскага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій смачна пахла блінамі і пловам. Студэнты ўніверсітэта нагадалі жыхарам горада пра тое, што вясна — пара надзей і абнаўлення, міру і любові.**

Мерапрыемства адбылося дзякуючы маладзёжнаму каардынацыйнаму савету, у які ўваходзяць і студэнцкі прафкам, і БРСМ, і студсаветы — адным словам, самая ініцыятыўная, актыўная і прагрэсіўная моладзь. Знаходлівыя студэнты спалучылі беларускую Масленіцу і ўзбекскі Наўруз, які адзначаецца ў канцы сакавіка. Ва ўніверсітэце вучыцца каля 200 узбекскіх студэнтаў, якім таксама захацелася неяк сябе праявіць.

Некаторыя натхнёныя добрай справай студэнты прыйшлі сюды яшчэ ў пяць гадзін раніцы, каб замясіць вялікі чан цеста. А потым некалькі гадзін запар пяклі на сваёй вучэбнай універсітэцкай «кухні» мучныя «сонейкі».

Пакуль народ бойка ласаваўся блінамі ва ўнутраным дворыку, група ўзбекскіх студэнтаў гатавала плоў.





— Калі мы расказалі нашым узбекскім сябрам, як сустракаем вясну, яны адразу ж пажадалі прадэманстраваць сваё кулінарнае мастацтва, — уводзіла ў курс справы прарэктар па выхаваўчай рабоце Вольга Мацыкава, пакуль мы з ёй ішлі глядзець на працэс. — Мы думалі, што ўзбекскі плоў аднолькавы ва ўсіх рэгіёнах. Але студэнты нас прасвятлілі, што ёсць ташкенцкі і бухарскі. Кожны гатуецца па сваёй рэцэптуры са сваімі сакрэтамі. І яны вырашылі таксама ўсіх пачаставаць. Рабяты адразу ж папярэдзілі, што сапраўдны плоў гатуецца толькі на свежым паветры, яму патрэбныя сапраўдны агонь і дровы.

У якасці печак выкарыстоўваліся своеасаблівыя буржуйкі. На адной з іх булькацеў ташкенцкі плоў, на другім — бухарскі. Варыва ў вялікіх чанах дыхала, як жывое, і распаўсюджвала вакол сябе прыемны пах.

— Нічога асаблівага — прапапраны рыс, мяса, морква, цыбуля, кмін, — паведаміў пра тонкасці прыгатавання студэнт трэцяга курса Фарух Хаітаў. — Выкарыстоўваем два віды алею — сланечнікавы і зігірны халоднага адціскання. Апошні мы прывезлі з Узбекістана. Мяса ідзе або птушынае, або ялавічына. Гэтым разам закупілі птушку. У чане 6 кілаграмаў рысу, 6 — морквы, 4 — мяса. На 70 чалавек, думаем, хопіць.

Фарух запэўнівае, што ва Узбекістане таксама сустракаюць Масленіцу, бо яго радзіма — шматнацыянальная дзяржава. Але ўзбекам бліжэй да сэрца Наўруз. І плоў — яго асноўная страва. Для беларускай Масленіцы вырашылі зрабіць упершыню.

Узбекскія студэнты кажуць, што беларуская Масленіца — своеасаблівае свята, але ў ім ёсць нешта агульнае і з іх узбекскімі традыцыямі. Народ збіраецца, дзеліцца пазітывам, радуецца і частуецца любімымі стравамі.

— 21 сакавіка на Наўруз мы яшчэ будзем гатаваць сумаляк з прарошчанага зерня пшаніцы — чорную кашу, якая доўга варыцца, — абяцаюць студэнты. — І яшчэ плоў — софі, другі від бухарскага плову. Страва гатуецца на пары, усе прадукты пры гэтым варацца, а не абсмажваюцца, як у першым варыянце.

Пакуль сачыла, як варыцца плоў, бліны амаль усе разышліся. Адказныя за іх раздачу Сяргей Аганісян і Таццяна Жыліна змаглі перавесці дух і расказаць падрабязнасці гатавання бліноў.

— Сакрэт добрых бліноў — гэта добры настрой, — кажа Таццяна. — Мы іх рабілі ў сценах роднага ўніверсітэта, і таму кожны дадаў туды крышачку свайго станоўчага настрою і сардэчнай цеплыні. А інакш і нельга гатаваць ежу. Атрымаліся сардэчныя бліны. Акрамя таго, цесту абавязкова трэба даць выбрадзіць. Тады «сонейкі» атрымаюцца пышныя і смачныя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

# ЦІ БУДЗЕ КУРОРТНЫ ПАСЁЛАК З ПЛЯЖНАЙ ЗОНАЙ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

З'явіліся і сродкі для пачатку работ. Парэцкі сельскі Савет у абласным спаборніцтве па добраўпарадкаванні тэрыторый увайшоў у тройку лідараў. На абласной сесіі старшыні сельвыканкама ўручаны грамата і грашовы прыз. Усе сродкі якраз плануецца накіраваць на возера Малочнае.

— Многія жыхары звяртаюцца да нас з пытаннем: калі будзе працаваць пляж? Летні сезон апошнія гады даволі гарачы, а наш аграгарадок у гэтым сэнсе вельмі папулярны, як у саміх месцічаў, так і жыхароў Гродна і вобласці. Таму асноўныя сілы перад пачаткам сезона будзем накіроўваць менавіта на гэту тэрыторыю. Калі ўзяць не вельмі дарагія аб'екты, але значныя для адпачынку, тады будзе вынік. Мы бачым, куды прыкласці намаганні, што неабходна ў першую чаргу, — падкрэсліў суразмоўнік.

Трэба сказаць, што за апошнія некалькі гадоў аграгарадок Парэчча значна абнавіўся. Адрамантаваныя фасады дамоў, устаноўлена дзіцячая пляцоўка, якой тут раней не было, пастаўлены лаўкі.

І хоць само возера яшчэ скаванае лёдам, папярэднія работы відавочныя. На прыбярэжнай тэрыторыі пачалася расчыстка зоны адпачынку ад сухастою і аварыйных дрэў. Калі пацяплее, тут займуцца работамі непасрэдна на самім пляжы. У сельвыканкаме лічаць, што зона адпачынку павінна адпавядаць і статусу пасёлка. Некалькі гадоў таму аграгарадок Парэчча ўключаны ў спіс 16 населеных пунктаў Беларусі, якія павінны стаць цэнтрамі турызму і адпачынку нацыянальнага значэння.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

### У тэму

**Святлана ГАСПАДАРОВА, старшыня Каранёўскага сельскага выканаўчага камітэта Смаргонскага раёна:**

— Сродкі, якія мы атрымалі за перамогу ў абласным конкурсе па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, планаем выдаткаваць на працяг такой дзейнасці, а таксама на азеляненне нашых аграгарадкоў. Садзім туі, клёны, івы. І гэтым займаюцца самі людзі, у нас немала ініцыятыўных жыхароў. Да таго ж многія прыйшлі да разумення, што вакол павінна быць чыста і прыгожа. Калі людзі самі нешта робяць для агульнай карысці, тады і ставяцца да вынікаў працы інакш, як да свайго ўласнага. Калі мы нешта ўзяліся рабіць, мы павінны гэта давесці да канца. Добраўпарадкаванне — адзін з важных напрамкаў у рабоце сельскага Савета.

ВЭБІНАР

## Парламентарыі — за мір і бяспеку

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, член Бюро Пастаяннага камітэта Міжпарламенцкага саюза па пытаннях міру і міжнароднай бяспекі Сяргей РАЧКОЎ у рэжыме відэасувязі прыняў удзел у вэб-семінары па пытаннях спынення некантраляваных патокаў стралковай зброі і лёгкіх узбраенняў.**

Як паведамілі ў профільнай камісіі, мерапрыемства арганізавана МПС сумесна з парламенцкім форумам па стралковай зброі і лёгкіх узбраеннях, Жэнеўскім цэнтрам палітыкі бяспекі, форумам «Парламентарыі за нераспаўсюджванне і адмену ядзернай зброі» і нямецкім некамерцыйным фондам «Сусветны савет будучыні» для абмену думкамі па канкрэтных тэмах, што датычацца пытанняў бяспекі.

Гэта была чацвёртая сустрэча ў серыі пасяджэнняў у падтрымку сумеснага даклада «Забеспячэнне нашай агульнай будучыні».

На вэбінары была агучана передавая парламенцкая практыка, якая датычыцца выкаранення некантраляваных патокаў зброі і скарачэння ваенных выдаткаў, прадэманстраваны ініцыятывы МПС і парламенцкага форуму па стралковай зброі і лёгкіх узбраеннях, распрацаваны інструменты і кіраўніцтва для парламентарыяў.

— Штогод ад стралковай зброі і лёгкіх узбраенняў гіне больш за 220 тысяч чалавек. У сувязі з сучасных выклікаў, такіх як пандэмія COVID-19 і ўзрослая геапалітычная напружанасць, прадухіленне і зніжэнне ўзроўню гвалту, звязанага з выкарыстаннем стралковай зброі і лёгкіх узбраенняў, важна як ніколі, — перакананы Сяргей Рачкоў.

Старшыня профільнай камісіі перакананы: у сувязі з гэтым парламентарыі павінны выкарыстоўваць рэсурс перадавых нацыянальных і міжнародных практык, міжнародную базу дакументаў і дагавораў для памяншэння ўздзеяння, якое некантраляваны патокі зброі аказваюць на грамадства.

— Абапіраючыся на рэкамендацыі кіраўніка аб стралковай зброі і лёгкіх узбраеннях сумеснага даклада «Забеспячэнне нашай агульнай будучыні», вэбінар дазволіў падкрэсліць парламенцкія магчымасці і падзначыць праблемы, з якімі парламентарыі павінны змагацца ў сувязі з некантраляваным распаўсюджваннем стралковай зброі і лёгкіх узбраенняў, — рэзюмаваў сенатар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 10 сакавіка 2022 года.

# УСПАМІНАННЕ ПРА БУДУЧАЕ

**У праваслаўных завяршаецца першы тыдзень Вялікага посту, які распачаўся з Даравальнай нядзелі. Гэта і стала нагодай для размовы з магістрам багаслоўя, протаіерэем Уладзімірам ДАЎГАПОЛАВЫМ, настаяцелем прыхода храма святой роўнаапостальнай княгіні Вольгі ў горадзе Мінску. Але ў гутарцы мы закранулі і іншыя тэмы.**



## ПРА ВЫБАР

***— Айцец Уладзімір, чаму менавіта з даравання пачынаецца Вялікі пост? Гэта ж яшчэ і адна з галоўных умоў для прычасця. Чаму дараванне адно адному крыўды мае такое вялікае значэнне ў хрысціянстве?***

— Вялікі пост — гэта шэсце, шлях да Пасхі, Свята святаў, калі мы ўспамінаем уваскрэсенне Хрыста пасля ўспамінання Яго распяцця. Насамрэч такім жа ўспамінам з'яўляецца любая Літургія: мы збіраемся разам, каб пераламіць Хлеб і падзяліць агульную Чашу, збіраемся ў выкананне Запавету Госпада і тым самым успамінаем Яго смерць і Уваскрэсенне. І гэта не ўспаміны пра мінулае, і не ўспаміны пра Чацвер, калі перад сваім распяццем Ён так некалі зрабіў разам са сваімі вучнямі. Гэта ўспамінанне пра будучае. Еўхарыстыя — гэта вобраз Шлюбнай вячэры ў Царстве Божым, якое ўжо тут патроху з'яўляецца, але ў пэўны момант чалавечай гісторыі з'явіцца ў поўнай сіле. Гэта адбудзецца пасля Другога прышэсця Хрыста і Страшнага суда, які Царква ўспамінае за тыдзень да пачатку Вялікага посту.

Калі гэта будзе вячэра ў Царстве Божым, то на яе трапяць тыя, хто там будзе. І адна з умоў трапіць у Царства Божае — дараванне. Чаму? Што такое дараванне? Гасподзь заклікае ў Царства Божае ўсякага чалавека. Бог, са свайго боку, зрабіў усё неабходнае, каб любы чалавек мог туды ўвайсці. Але ад нас залежыць, захочам мы гэта зрабіць або не. У прыватнасці, для некаторых людзей (гіпатэтычна мы ў гэта верым) паўстане такі выбар, і яны могуць не захацець туды ўвайсці, бо ўбачаць, што Гасподзь ужо запрасіў у Царства Божае некага, хто ім прыкры або ненавісны. Чалавек, у сэрцы якога засталіся непрыязнасць, варожасць, злосць да любога, хто жыве на зямлі, нават у Царстве Божым будзе пакутаваць. Бо там не будзе ні катэгорыі часу, ні катэгорыі прасторы. Як я кажу прыхаджанам: там не схаваешся па ізаляваных памяшканнях, па сваіх маленькіх утульных кватэрках ад людзей, якіх не любіш. Усе будуць побач. Таму нянавісць, крыўда на любога чалавека закрываюць для нас уваход у Царства Божае. Вось чаму такое важнае значэнне ў Царкве надаецца дараванню.

***— Гэта зразумела, калі патрабуецца работа над сабой з тым, каб з раззлаванага або высакамернага стаць больш мяккім і добрым, больш цярпімым да іншых. Але ж тут размова пра крыўдзіцеля. Ён — злы, жорсткі, абыякавы... Ён здзейсніў зло ў адносінах да цябе. Ты нічога дрэннага не рабіў, проста не можаш яму дараваць. Атрымліваецца, што ён можа аказацца ў Царстве Божым, а ты — не. Так?***

— Менавіта так. Бо для Бога мы ўсе — дзеці. Скажыце, вось у бацькоў могуць быць нелюбімыя дзеці?

***— Мяркую, што не.***

— Бог, якім мы Яго ведаем у хрысціянстве, — Любоў. Гэта адна з асноўных Яго якасцяў. Менавіта з-за любові Ён стварыў чалавека, а потым прыйшоў у гэты свет, каб памерці дзеля таго, каб любімае Яго стварэнне магло жыць. У Евангеллі шмат разоў падкрэсліваецца, што Бог любіць кожнага чалавека. І заклікае хрысціян быць такімі ж дасканалымі, як і Ён. Гасподзь пасылае дождж і добрым, і злым... Гэтая якасць Бога нязменная. У незалежнасці ад таго, што робіць чалавек, Бог ёсць Любоў і жадае чалавеку дабра.

***— Памятаеце, у Дастаеўскага Іван Карамазаў заяўляе: «Не хачу я, нарэшце, каб маці абдымалася з катам, які разадраў яе сына сабакамі! Не смее яна дараваць яму!»? Неяк я пра дараванне разважала з калегамі, і адна з іх сказала: «Галавой я ўсё разумею, але і ўсведамляю, што ніколі не змагу палюбіць таго, хто паліў людзей у печах Бухенвальда, расстрэльваў у Курапатах паэтаў, здзекаваецца цяпер з людзей ва ўсякіх формах». І я не змагла з ёй паспрачацца. Ці магчыма ўсім дараваць?***

— У абсалютным сэнсе — так. Гэта сапраўды так.

***— Прывяду яшчэ адзін, канкрэтны і блізкі для мяне прыклад. Я перапісваюся з маці 7-гадовага хлопчыка, якога год таму забіў родны бацька. Па версіі следства, нешта пераключылася ў галаве мужчыны падчас алкагольнага ап'янення. Гэта здарылася ў Маскве, 3 сакавіка суд адхіліў іск, забойцу адправілі на прымусовае лячэнне... Калі нават такое трэба дараваць, то як гэта зрабіць? Ёсць у хрысціянства рэцэпт?***

— Дараваць трэба любыя рэчы. Але, па-першае, Бог не чакае ад чалавека цудаў, Ён разумее, што чалавек — слабая істота, часам для даравання патрэбны гады. Па-другое, калі мы хочам дабіцца выніку



ў сваіх маральных намаганнях, мы павінны дзейнічаць у супрацоўніцтве з Богам. Гэта якраз магчыма ў Царкве, бо Царква, як мы верым, — не проста нейкая рэлігійная арганізацыя, не проста чалавечая суполка. Гэта — богачалавечы арганізм, дзе Бог па сваёй ласцы, па сваім добраахвотным дары (які ніхто не заслужаны, не адпрацаваны, які не зароблены чалавекам) кампенсуе нашы недахопы. І гэта, зноў жа, доўгі працэс. У Царкве гэта называецца пакаяннем — змяненнем самога сябе. Гэта тое, чым мы закліканыя займацца ўвесь час жыцця, а асабліва — у Вялікі пост.

Часам праз гады, праз дзесяцігоддзі, калі чалавек разумее, што ён сам не можа дасягнуць даравання, не можа дараваць крыўдзіцелю, ён адчуе, што Бог дае яму гэта як дар.

***— Ён адчуе, што яго раптам адпусціла?***

— Так. Адпускае — калі казаць простай мовай. Чалавек адчувае, што гэта не яго заслуга. Гэта не ён перапрацаваў у сабе, перахварэў у сабе. Бог проста сваёй ласкай дае яму гэты дар — дараванне.

***— Ці можа чалавек, які яшчэ не атрымаў такі дар, падыходзіць да Чашы?***

— Павінен. Бо Чаша — гэта не ўзнагарода пераможцу, а лекі для чалавека, які асэнсаваў сваю хваробу, свой грэх. І прагне вылечвання ад гэтай хваробы.

***— Пра які грэх вы кажаце? Трэба шукаць у сябе нейкі грэх? Імкнуцца неяк яго ў сабе ўбачыць?***

— Злосць і нянавісць да любога чалавека — гэта ўжо грэх.

***— Гэта значыць, тое, што ты не можаш дараваць, — ужо грэх?***

— Вядома. Ты шчыра кажаш Богу: я сам, сваімі сіламі гэта зрабіць не магу, разумею, што гэта дрэнна, але не магу з сабой справіцца.

Дазвольце такую аналогію: падчас прычасця мы ядзім Цела Хрыста і п'ём Кроў Яго. Праз гэта становімся адной жывой часцінкай, адзіным нейкім органам богачалавечага Цела — Царквы. Што бывае, скажам, з пальцам, калі ў яго перастае трапляць кроў і неабходныя рэчывы?

***— Адмірае.***

— Тое самае адбываецца з чалавекам, калі ён не сілкуецца Целам і Кроўю Хрыста. Духоўна ён пачынае паміраць. Пачынаецца распад яго асобы.

***— Нарэшце, што значыць — дараваць? Ці дастаткова перастаць адчуваць нянавісць да крыўдзіцеля? Або трэба абавязкова яго палюбіць?***

— Праграма максімум — палюбіць. Праграма мінімум — пагадзіцца на тое, каб гэтаму чалавеку было добра, каб ён быў шчаслівы. І каб вас гэта не чапляла, і каб вы не казалі Богу: «Чаму? Чаму Ты яго церпіш?»

***— Цяжкая задача.***

— Хрыстос ад нас гэтага патрабуе не беспадстаўна. Ён сам так рабіў. Ён прыйшоў загадзя да тых людзей, якія, як Ён ведаў, будуць Яго ненавідзець, здраджваць Яму, будуць з Яго здзекавацца, заб'юць Яго. Але Ён пайшоў на гэта добраахвотна, бо ведаў, што гэта неабходна для іх выратавання. Ён сваё жыццё аддаў дзеля тых, хто Яго не чакаў, не любіў, не жадаў — каб яны маглі жыць вечна. Каб іх вылечыць.

***— Праз уласны прыклад?***

— Так. Таму Ён шчыра можа патрабаваць гэтага ад нас. Бо быў гэтакім жа чалавекам, як і мы. І з'яўляецца такім жа Чалавекам, як і мы. Гэта не патрабаванне нейкага бога, які недзе далёка, зусім не падобны на нас і патрабуе ад нас тое, чаго мы па сваёй прыродзе не можам дасягнуць.

***— Значыць, Хрыстос дараваў усім, хто яго не прыняў?***

— Мы памятаем, пра што Ён прасіў на крыжы: «Ойча! Даруй ім, бо яны не ведаюць, што робяць».

## ПРА СТРАХ

***— Мы часта скардзімся на часы, у якія жывём, а потым здараецца нешта, і разумееш, што раней было ўсё добра. Вось і зараз: здаецца, што нядаўна ўсё было лепей. Але ж у хрысціянства асаблівае стаўленне да катастроф. Хрыстос заклікае людзей нічога не баяцца. Я правільна разумею?***

— Хрыстос заклікае баяцца таго, што можа забіць нашу душу. Д'ябла і граху. Грэх нас аддзяляе ад Бога, пазбаўляе вечнага жыцця, ён з'яўляецца тым тромбам, які перашкаджае кровазвароту і доступу да нас ласкі Божай. Д'ябал — той, хто стварае ўмовы, каб тромб утварыўся.

***— А калі адбываюцца катаклізмы? Глабальныя катастрофы? Войны альбо пагроза вайны? Як па-хрысціянску да гэтага ставіцца?***

— Мяркую, спакойна. Магчыма, у мяне ёсць так званая прафесійная прывычнасць да падобнага. Святар, як лекар, павінен умець крыху абстрагавацца ад эмоцый, каб не губляць самавалодання і цвярозасці. Бо без іх немагчыма дапамагчы тым, хто пакутуе. Два, тры, чатыры, пяць гадоў таму ў маім жыцці таксама было вельмі шмат болю, смерці, хвароб. У жыцці людзей, з якімі я блізкі, адбываліся цяжкія катастрофы. Гэта здаралася з людзьмі, якія прыходзяць у храм, з якімі мы разам молімся.

Насамрэч у час, які мы лічым мірным і спакойным, шчаслівым, здараюцца аварыі, трагедыі, страшныя страты. У людзей хварэюць і паміраюць дзеці. Часам раптоўна. Год таму прыходзілася развітвацца з маленькай дзяўчынкай двух-трох гадоў, якая была з сям'ёй на дачы і патанула ў надзьмутым басейне. Як вы думаеце, для яе бацькоў зараз час горшы, чым пасля трагедыі?

***— Наўрад ці.***

— Вядома, калі пакутуе шмат людзей, болю больш. Калі боль нават аднаго чалавека — гэта боль усёй Царквы, усяго грамадства, дык што казаць пра смерць, страты і пакуты ў час катастроф ці войн? Напэўна, без веры ў Бога ад такога болю можна страціць розум. Але наша вера ў тое, што жыццё чалавечае не заканчваецца, калі цела кладзецца ў зямлю, надае сэнс усяму, што адбываецца: усім пакутам, болю, нават смерці. Мы верым, што наша жыццё — проста пэўны этап. Смерці не пазбегне ніхто. І смерць заўсёды балючая. Важна толькі тое, як чалавек сваё жыццё пражыў. Я сведка таго, як людзі, якія нават мала гадоў пражылі, самі свяціліся святлом Божага Царства і вельмі многіх супакойвалі, суцяшалі, давалі надзею жыць і верыць, вучылі любові.

## ПРА СУСТРЭЧУ

***— Ёсць такая прымаўка: «Не прыйдзе трывога — не ўспомніш і Бога». Людзі часта прыходзяць у храм з-за страху перад нечым. Або каб атрымаць нейкую палёгку, збаўленне ад хваробы, ад складаных абставін. Студэнты перад экзаменамі бягуць ставіць свечку. Бацькі хрысцяць дзіця, каб абараніць ад нечага благога. Але ці правільна так адносіцца да Бога? Быццам бы ў краму па прадукты: я табе свечку, а Ты мне — абарону ад усяго кепскага.***

— Такі матыў распаўсюджаны, але я не сказаў бы, што ён пераважае. І ён можа быць добрай кропкай уваходу чалавека ў адносіны з Богам. Уявіце сітуацыю: дзіця з дзіцячага дома ўсынаўляе сям'я. Што дзіця бачыць спачатку ў сваіх прыёмных бацьках? Ён бачыць у іх тых, хто яго накорміць смачнай хатняй ежай, купіць рэчы, пра якія ён даўно марыў, але ў яго няма вопыту сямейных адносін. Гэтак жа і многія людзі, калі прыходзяць у храм, яны прыходзяць з нейкімі вельмі простымі просьбамі.

Ёсць і іншыя матывы. Прыходзяць тыя, у каго ўсё добра. Не ў тым сэнсе, што яны вельмі багатыя. У іх звычайнае, простае, добрае жыццё, але яны адчуваюць пустэчу. Нечага не хапае. Душа ўсім гэтым насыціцца не можа.

***— Магчыма, гэта больш правільны матыў?***

— Разумееце, з прычыны таго, што мы ўсе — унікальныя (Бог выдатны творца, цудоўны мастак і не стварыў людзей трох-чатырох відаў), у кожнага свой шлях да Бога. І казаць, што нейкі з іх няправільны, не лічу магчымым.

***— А калі адбываецца сапраўдная сустрэча з Богам?***

— У кожнага гэта адбываецца па-рознаму. Мне здаецца, што выдатныя адносіны — гэта калі чалавек любіць Бога і любіць іншых людзей. Калі ён нічога не чакае ад Бога, у той жа час жыве для Яго, дыхае для Яго, стараецца жыць у Яго прысутнасці — такім чынам, каб апраўдаць Яго любоў, Яго давер.

***— Калі шчыра сам сабе ён можа сказаць: я люблю Бога?***

— Так. І давярае Яму ў тым сэнсе, што ўсе абставіны жыцця, якія адбываюцца з ім, усе катастрофы, катаклізмы, прымае з даверам да Бога. Як малое дзіця давярае сваім бацькам. Малыя ведаюць: калі яны на руках у маці з татам, усё добра. Можна да іх прытуліцца, паварнуцца, і ўсе страхі адыдуць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

***(Здымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА зроблены ў час вячэрняга багаслужэння ў храме прыхода Святой Роўнаапостальнай княгіні Вольгі.)***

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297) 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего Шпакова Олега Петровича.

Повторные электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019/6 в экономическом суде Могилевской области будут проведены: **28 марта 2022 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Детский оздоровительный лагерь «Ромашка», Могилевская обл., Бобруйский р-н, д. Панюшковичи (состав лота на beltorgi.by) | 1 315 114,50 | 939 367,50 |

**Местонахождение предметов торгов – Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, тел. для ознакомления +375 29 698-53-53.**

Для участия в торгах необходимо в срок с 12.03.2022 09.00 по 25.03.2022 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 календарных дней со дня завершения электронных торгов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет торгов в соответствии с условиями договора купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 29 марта 2022 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 25 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Информация о земельном участке: лоты №№ 1–2** расположены на земельном участке с кадастровым номером **324550100001001409** общей площадью **1,2046 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Чапаева, 108. **Условие продажи (лоты №№ 1–2):** После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов) для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст.ст. 19, 45 «Кодекса Республики Беларусь о земле» установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки), через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 340/С-315934** общей площадью **1 447,9** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание АБК** | **80 250,00** | 4 012,50 | 8 025,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 340/С-315933** общей площадью **571,6** кв. м, назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – **здание столовой** | **22 875,00** | 1 143,75 | 2 287,50 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 340/С-304011** общей площадью **638,9** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **мастерская ПМК-81. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324550100001013051** общей площадью **0,0737 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Чапаева, 108/11 | **20 100,00** | 1 005,00 | 2 010,00 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 340/С-304012** общей площадью **352,8** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **растворобетонный узел. Капитальное строение с инв. № 340/С-304009**, общей площадью **541,7** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **склад цемента. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324550100001013053** общей площадью **0,6649 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Чапаева, 108/3 | **18 225,00** | 911,25 | 1 822,50 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой**»): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 марта 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 25 марта 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.01.2022 г. № 10 (29632). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Добрушского районного потребительского общества (продавец), в лице ликвидатора Беланова Р.Н. извещает о проведении 23 марта 2022 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-50774** площадью **100,1 кв. м**, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **магазин «Запчастей». Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, пр-т Луначарского, 11А. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100002000030** общей площадью **0,0312 га (право постоянного пользования). Ограничение (обременение):** договор аренды № 77/18 от 15.06.2018 г., площадь, сданная в аренду, – **100,1 кв. м** | **37 476,00** | 3 747,60 |

**Продавец:** Добрушское районное потребительское общество, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (044) 590-84-01 – Валентина Александровна. Шаг аукционных торгов** – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 марта 2022 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 марта 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно срокам заключенного договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 28.01.2022 г. № 18 (29640). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: тел./факс 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| Наименование | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|
| **Здание насосной** (здание нежилое) общей площадью 549,7 кв. м, инвентарный номер 620/С-21264, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25 | **117 580,64** бел. руб. |

**Сведения о земельном участке пл. 0,4768:** предоставлен на праве аренды по 23.08.2120 для строительства и обслуживания насосной

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 60 календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.01.2022

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 31.03.2022**.

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 29.03.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 28 марта 2022 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–16) опубликован на сайте www.bankrot.gov.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснёв Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой**»): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 марта 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 24 марта 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.12.2021 № 249 (29618). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона, полный список имущества с ценами и размером задатка по лотам размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**




## ШЧАСЛІВЫЯ ГАДЗІН НЕ НАЗІРАЮЦЬ...

Шмат бяды нарабіў гэты каранавірус, шмат здароўя адняў і, падобна, яшчэ адыме: некага пасля хваробы стала сэрца падводзіць, некага — ныркі, зрок, а што, можа, найгорай, — памяць.

Адна з нашых супрацоўніц — «пані трошкі ў гадах», як пісаў Барадулін, — жыве адна, дакладней з катом. Ён у Сцяпанаўны будзільнікам служыць: як расказвала, па раніцах, недзе з паловы на сёмую, пачынае таптацца ў яе па плячах, па галаве, «бульдозерам» муркаць над вухам — выманьваць з-пад коўдры, клікаць на кухню. Прычым адбівацца тады сэнсу не мае, бо кот можа пакрыўдзіцца і такога шуму нарабіць, што ўсіх суседзяў падыме...

Значыць, гаспадыні трэба ўставаць самой.

У той дзень, як і ва ўсе папярэднія, Сцяпанаўна хоць-нехаць паднялася, насыпала ў міску кашачага корму, наліла вады кату і сабе, уключыла чайнік, каб зварыць нейкай кашы і кавы сабе, паціху-памалу паснедаць, прыбрацца — паехаць на работу. Апошнім часам яе ў нас хоць каўшамі бяры, бо шмат хто хварэў і хварэе... Не дзіва, што Сцяпанаўна ўсю дарогу з дому засяроджана думала, што спачатку зрабіць, што пазней, каму што даручыць, што праверыць.

За гэтымі планамі яна зусім не заўважыла, як даехала да патрэбнай станцыі, як выйшла з метро, як дакульпала да нашага офіса. А ўжо там тузанула за ручку дзвярэй — і раз, і другі... Дзверы чамусьці не адчыняліся.

Тут (з дзявочай памяці ў старэчы склероз...) жанчына ўспомніла, што ўчора пасля абеду ў нас не было гарачай вады. Казалі, што паблізу трубы прарвала, што будуць мяняць...

Збоку, за будынкам, і сапраўды віднеліся горы свежавыкапанай зямлі, стаяла нейкая тэхніка — як выглядала, ішоў рамонт... Сцяпанаўна вырашыла, што парадны ўваход закрылі якраз з-за гэтага. А таму абышла будынак з тылу, паспрабавала зайсці праз чорны ход, але ўсё было марна: тыя дзверы таксама не адчыніліся.

Прыйшлося вярнуцца назад да парадных, яшчэ раз патузаць за ручку, пачуць з-за спіны:

— Прабачце, а што вы тут робіце?

Сцяпанаўна азірнулася: пытаў пра гэта дзяжурны міліцыянер.

— Як што?! — абурылася ў адказ. — На работу прыйшла, а дзверы замкнутыя — і адны, і другія. Нам што — праз вокны хадзіць?

— Ну чаму праз вокны? — не зразумеў служывы. — Як ваша прозвішча?

— Ды якая розніца?! Знайшлі што пытаць... Іншых спраў няма?

— Ёсць... Проста ў спісах на сёння адны мужчыны...

— Гэта ў якіх такіх спісах? — абурэнне жанчыны не мела межаў! — Мы зараз што — па іх на работу будзем хадзіць?

— Чаму будзем? — па-ранейшаму не разумеў ахоўнік парадку. — Нам заўсёды па пятніцах спісы прыносілі, хто ў выходныя будзе працаваць.

— А які сёння дзень? — насцярожылася Сцяпанаўна.

— Дык субота ж, — з ахвотай падказаў дзяжурны.

Толькі цяпер жанчына ўпершыню за раніцу глянула на гадзіннік (на якім, дарэчы, была палова на восьмую), толькі цяпер успомніла, што ўчора сапраўды была пятніца і яна ўсім нам жадала добра адпачыць.

...Трэба сказаць, што ў самой яе першы з выходных пачаўся не вельмі ўдала, але ж — «клопатам» ката — рана. Значыць, да канца суботы і ў нядзелю яшчэ шмат што можна было паспець, каб у панядзелак, разам з усімі, ад душы пасмяяцца са сваіх жа прыгод, а потым папрацаваць.

**З. Макарава,**

*г. Мінск.*

## ДЗЕНЬ — ГЭТА ПРОСТА...

Замуж, як многім здавалася, Таня выйшла зарана — у 20 гадоў. Стольні ж было і абранніку. Маладая сям'я зняла адзін пакой у чужой кватэры, стала чакаць першынца. А перад самым яго нараджэннем будучая маці з'ездзіла ў госці да стрыечнай сястры, набрала ў яе розных дзіцячых рэчаў. Хацела і грошай на іх сэканоміць, і сям'ю ўмацаваць, бо недзе чытала, што малыя, вырастаючы ў адных кашульках, потым сябруюць, а то і жывуць як самыя родныя...

З надзеяй на гэта і ўжо дома Таня яшчэ раз усё памыла-папрасавала, злажыла ў асобныя клункі. Што дзе ляжыць, мужу пакуль не тлумачыла — вырашыла, што яшчэ паспее.

Але ж праўду кажуць, што сена да радзіны не чакаюць гадзіны: неяк зусім неспадзявана «хуткая» адвезла яе ў радзільню, вечарам таго самага дня на свет з'явілася іх маленькая, але ж, дзякуй богу, здаровая дачушка. Бацькі былі самыя шчаслівыя! І, вядома ж, хацелі падзяліць гэту радасць са сваімі бацькамі: у найбліжэйшыя выхадныя Міша з'ездзіў у вёску...

А тым часам іншых парадзіх, Таніных суседак па палаце, сталі памалу выпісваць. Хацелася дадому і ёй, але ж рана пакуль. Трэба, ёй казалі, каб дзіцятка вагу набрала. Таня чакала гэтага і штодня, стоячы каля акна, глядзела, як прыгожа — з пацалункамі, з кветкамі, з каробкамі цукерак — родныя сустракаюць іншых.

...У той дзень, залюбаваўшыся, яна не заўважыла, калі ў палату зайшла медсястра: з-за спіны пачула, што таксама можа збірацца... «Як? Мяне ж ніхто не папярэдзіў? — разгубілася маладзіца. — Муж на рабоце, тэлефон там хіба ў начальства. Яму ж не будзеш званіць. Значыць, трэба чакаць да вечара?»

Пасля змены Міхаіл і сапраўды з'явіўся пад вокнамі. З вышыні паверха Таня пракрычала яму, каб матнуўся дамоў, узяў адзін з пакункаў (не сказала, каторы — не да таго было) і хуценька, адна нага тут, другая там, вярнуўся назад.

Маладому бацьку пашчасціла, ён адразу ж злавіў таксі, хутка выканаў даручэнне...

У пакоі, куды прынеслі дачушку, Таня стала пераадзявацца сама, медсястрычка — прыбіраць дачушку. Распакавала клунак і разгубілася: там былі распашонкі, паўзункі, розныя касцюмчыкі, штонікі... Коўдрачкі не было, а за вокнамі восень, вечар.

Маладая матуля не ведала, што і рабіць. А вось медсястрычка суміла ледзь не адразу: спрытна, адна на адну, стала складваць цёплыя пялюшкі, каб на іх палажыць дзяўчынку, славіць і вынесці ў калідор шчасліваму бацьку.

...У таксі, па дарозе дамоў, Таня хацела на яго насварыцца. І нават пачала: сказала, што іншыя мужы прыязджалі па жонак з кветкамі, з цукеркамі, дзень выпіскі з радзільні зрабілі сапраўдным святам.

— Дзень — гэта проста, гэта шмат хто можа, — у адказ ёй засмяяўся муж. — А я хачу ўсё жыццё вам святам зрабіць. Верыце?

Таня з дачушкай верылі. І, магчыма, таму ўсё ў іх атрымалася: дружна жылі (і жывуць!), тую нечаканую выпіску з радзільні ўспамінаюць рэдка і, вядома ж, са смехам.

**Т. Чэкед,**

г. Гомель.

## СЕСЦІ Ў ЛУЖЫНУ МОЖА КОЖНЫ

...Суседзі казалі, што чорт не адну пару лапцяў стаптаў, пакуль гэту пару сабраў, але ж справіўся, і Фядора (а папросту Дора) выйшла за... Фядота. Як людзі яны сталі жыць. Муж і да работы быў хваткі (дзе што прыбіць, прыкруціць, паправіць...), і ў чарку рэдка глядзеў (праўда, метка: мог на тыдзень «зарадзіць», а потым з паўгода ў рот не браць). Шанаваў ён Дору сваю — не казаў ёй слова ўпоперак, дачку адзіную песціў...

Дык вось. Вяселле ёй, той адзінай, вырашылі ў рэстаране спраўляць, каб і самім паглядзець, што ж гэта такое, і ўсім блізкім паказаць, каб пагуляў народ ды запомніў... А вось што?

Не без таго — сталы былі багатыя, музыка адмысловая, пара прыгожая, тамада гаваркі і нават не пустазвон, танцы, можна сказаць, — да ўпаду... Гасцям пасля раз'язджацца не хацелася, але ж падагналі аўтобус, у дарогу бацькам ды радні маладыя наклалі поўныя пакеты рознай смакаты — і з выпіўкі, і з закускі... А да ўсяго на пярэдняе сядзенне паставілі паднос з добрай паловай вялікага прыгожага торта.

Даўгавата развітваліся — абдымаліся, цалаваліся, выбачаліся па адным, па чарзе заходзілі ў аўтобус, займалі месцы. Фядот, які на радасцях добра закінуў за каўнер, плюхнуўся на... першае ж.

Не адразу, бедны, зразумеў, што не так. Чаму пад «пятай кропкай» так мякка і мокра?.. Прыпадняўся, каб паглядзець: ніжні слой торта быў «расплюшчаны» па сядзенні, верхні, рознакаляровы моцна трымаўся на ягоным парадным пінжаку і гэткіх жа портках...

Фядот паспрабаваў быў змахнуць гэтае дабро — ледзь не па локаць спэцкаў руку. На аўтапілоце, як той казаў, злізаў трохі крэму са свайго вялікага пальца, усімі малымі паралельна шчодра запэцкаў твар...

Народ у аўтобусе, гледзячы на гэта, заходзіўся-плакаў ад рогату! Шыбы звінелі!.. Хіба Дора не ведала, смяяцца ёй альбо плакаць. І што зараз рабіць, што казаць?

Самым першым іх кум апомніўся (хросны бацька нявесты), знайшоў патрэбныя словы: уголас прызнаў, што вось гэткай «пачаткай» шлюб дагэтуль ніхто не мацаваў! Значыць, добрая, шчаслівая сям'я ўтварылася!

...Ці трэба казаць, што дзеля гэтага бацька маладой зрабіў бы ўсё! Аднак тады, па дарозе з вяселля, ад яго патрабавалася зусім няшмат: ехаць стоячы (і, вядома ж, тварам да людзей, бо глядзець на зад было немагчыма) ды час ад часу адбрэхвацца на кпіны ды рогат вясельнікаў.

**Галіна Нічыпаровіч,**

*в. Магільна,*

*Уздзенскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж** і, мусіць, яшчэ раз: свет захаваўся таму што смяяўся, а галоўнае — думаў. Пішыце.

Неасабісты суб'ектыў



# ВЯСНА Ў ПАРАЛЕЛЬНЫМ СУСВЕЦЕ

## Пра сапраўднае чалавечае

ПАЧАТАК вясны са сваім пранізлівым сонцам, празрыстым звонкім паветрам, бліскучымі пераліўчата-зеленаватымі шпакамі, якія ў горадзе з'яўляюцца нашмат раней, чым у вёсцы і паводзяць сябе не менш нахабна, чым вечныя абарыгены галубы... Пачатак вясны — нейкая ўзнёслая, нявытлумачаная радасць, прадчуванне і чаканне чагосьці вельмі добрага і светлага, пяшчоты і разумення і, як пісаў класік, «каб хто-небудзь гладзіў»... Так было ад пачатку, так будзе заўсёды, бо павінна ж быць у нашым жыцці штосьці бясспрэчна добрае.

Чатыры гады назад пачатак вясны быў афарбаваны для мяне ў змрочныя колеры. Кожны надвячорак пад празрыстым небам, па вясёлкавых лужынах, разганяючы зеленаватых нахабных шпакоў, я спяшалася ў бальніцу на начное дзяжурства да цяжка хворага блізкага чалавека. Прашмыгвала ў будынак праз прыёмны пакой, надзявала на ногі бахілы, пешшу ішла на шосты паверх, ціхенька віталася на калідоры з медсёстрамі і санітаркамі, заходзіла ў палату. Там пачыналася іншая рэальнасць — са стойкамі капельніц, трывалым пахам ежы (у тым «цяжкім» аддзяленні не было сталовай, хворым прыносілі і сняданак, і абед, і вячэру проста ў палату), са смерцю, якая хадзіла зусім побач і нібы заглядала ўсім, хто там быў — і хворым, і здаровым, — прама ў вочы. Каварная хвароба, якая прыводзіла і маладых, і старых у гэта аддзяленне, кагосьці адпускала, паддаючыся лячэнню, кагосьці забірала нечакана за лічаныя гадзіны. Дагэтуль успамінаю цётку Ядзю, яшчэ не старую жанчынку, якая сваімі жартамі і добрым настроем весяліла ўсіх суседак па палаце. У абед я падавала ёй талерку з ежай, а ўвечары таго ж дня, калі прыйшла на сваю «змену», яе ложак быў ужо пусты, а насустрач па калідоры везлі зашпілены чорны пакет. Жыццё і смерць там стаялі на адным узроўні і мелі роўныя правы, і гэта было такім шакавальным дысанансам з вясной, сонцам і зялёнымі шпакамі, што, здавалася, ты трапіў у нейкі паралельны сусвет, які да таго, што за акном, за бальнічнымі сценамі, не мае ніякага дачынення.

У тым паралельным сусвеце была абсалютная шчырасць чалавечых адносін, шчырасць пачуццяў. Тая самая, аб якой у нармальным жыцці застаецца толькі марыць і якая там была на кожным кроку. На недаказанасць, на прыдзіркі, на непаразуменні людзі не трацілі час. Разумелі: яго проста можа не быць.

СВЯТЛАНА ляжала ў аддзяленні доўга — ужо трэці месяц. Спачатку яна яшчэ ўставала, сама ішла ў прыбіральню. Пасля зусім аслабела, амаль не рухалася. Маладая — ёй не было яшчэ і сарака, да хваробы, напэўна, вельмі прыгожая: нават у завостраных рысах твару ўгадвалася тая самая прывабная правільнасць. Лячэнне то дапамагала (і тады яна падымалася на падушках, нават прасіла ўключыць маленькі тэлевізар, што стаяў у яе на падаконніку), то ўсе намаганні ўрачоў здаваліся дарэмнымі (і тады яна проста моўчкі ляжала, нерухомым позіркам гледзячы ў столь)... Цэлымі днямі каля яе былі муж і пятнаццацігадовы сын. Муж забраў нявыкарыстаны за два гады водпуск, сын прыбягаў у бальніцу адразу пасля заняткаў у школе. Яны кармілі жанчыну, самі мянялі ёй падгузкі і мылі, стараліся неяк развесяліць. Было відаць, што яна ўсміхаецца ў адказ часта праз боль. Гэта была сапраўдная сям'я, у якой кожны клапоціцца пра тое, каб іншым было хоць трохі лепш і лягчэй...

Аднойчы, калі Святлане было зусім дрэнна і яна драмала пасля ўкола, яе Сяргей сядзеў побач з ложкам, паклаўшы галаву на рукі. Тады, медсястра, вырашыла яго крыху падбадзёрыць: «Ну што вы тут гаруеце? Яшчэ ўстане ваша Света. Ляжала якраз на яе месцы дзяўчына, ёй яшчэ горш было. А потым папраўлялася. Прысылала нам пасля відэа з удзячнасцю — танцуе на нейкай вечарыне!».. Увечары, зайшоўшы ў палату, я ўбачыла, як яны... танцавалі. Сяргей трымаў сваю жонку, яна паставіла яму ногі на ступні, ён асцярожна рухаўся, а яна моцна абдымала яго сваімі тонкімі, амаль празрыстымі рукамі, паклаўшы галаву яму на плячо. Яны танцавалі пад толькі ім чутную музыку, не зважаючы на суседзяў па палаце, на цікаўных, што стаялі ў дзвярах... Назаўтра раніцай ён прыйшоў, як заўсёды, у палове сёмай. Ложак Святланы быў пусты, каталка з чорным пакетам ужо паехала на цокальны паверх... Такога немага, роспачнага, нейкага нават жывёльнага крыку, якім крычаў гэты мужчына, напэўна, не чулі нават прывычныя да ўсяго бальнічныя сцэны. А санітаркі пасля шапталіся між сабой: «Гэта ж трэба — як ён яе любіў...»

ІРЫНА — мажная прыгожая жанчына, з гучным камандзірскім голасам, прыехала на чарговы курс «хіміі», як яна казала, «на пару дзён». Бойкая, уладная, яна «строіла» не толькі персанал, але і мужа, і двух дарослых сыноў, якія бывалі ў яе кожны дзень. Прычым мужыкі былі зусім не «хлюпікі» — мажныя, высокія, усе працавалі на будоўлі. Але з ёй былі ціхія, ласкавыя і кранальна-пяшчотныя, інакш як «мамачка» сыны да яе не звярталіся... Калі яна раптам занядужала і не змагла ўстаць, гэтыя здаровыя мужыкі ператварыліся ў санітарак і рабілі ўсё з такой асцярожнасцю, з такім клопатам. А Ірыне станавілася ўсё горш. Аднойчы ў тую ж бальніцу прывезлі яе зусім старэнькую маму, і ноччу бабуля памерла. Міхаіл, муж, канешне, ведаў пра гэта, але ні словам, ні паўсловам не выдаў гэта веданне. Бабулю павезлі хаваць у родную вёску, а да хворай прыйшлі дзве нявесткі. Яны так і не сказалі жанчыне праўду, якая магла яе дабіць. Увесь час завіхаліся каля яе, расказвалі гісторыю пра камандзіроўку, у якую раптам адправілі ўсіх мужчын, ласкава, як яны, называлі свякруху «мамачка». Расказвалі ёй пра дачу, куды яны ўсе хутка паедуць як пацяплее, і мамачка ім будзе паказваць, дзе што сеяць. А мамачка, усё, напэўна, разумеючы, ім падтаквала і квола, але абсалютна шчасліва ўсміхалася...

Гэтымі дзвюма гісторыямі мне захацелася падзяліцца з вамі менавіта цяпер, на пачатку вясны. Якая, як і ўсё сапраўднае, чалавечае, над зімой і нават над смерцю абавязкова возьме верх.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | |
| **Продавец** | **ОАО «Сморгонский завод оптического станкостроения», Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80** | |
